В. М. Шаршнёва

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## СІНТАКСІС. ПУНКТУАЦЫЯ

Магілёў 2018

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Электронны аналаг друкаванага выдання:*

В. М. Шаршнёва
Беларуская мова: сінтаксіс: пунктуацыя
Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2018. – 120 с.

ISBN 978-985-568-468-9

Практыкум падрыхтаваны ў адпаведнасці з тыпавой праграмай па сучаснай беларускай літаратурнай мове, змяшчае практычныя заданні і тэсты для тэматычнага кантролю па сінтаксісе і пунктуацыі і мае на мэце дапамагчы выкладчыку і студэнту не толькі выпрацаваць навыкі сінтаксічнага аналізу словазлучэння, простага і складанага сказа, але і вызначыць ступень засваення кожнай тэмы.

Рэкамендаваны для студэнтаў і выкладчыкаў філалагічных спецыяльнасцей. Можа быць выкарыстаны настаўнікамі і вучнямі пры падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання.

**УДК 811.161.3'367(076.5)**
**ББК 81.411.3я7-5**

Шаршнёва, В. М. Беларуская мова: сінтаксіс: пунктуацыя [Электронны рэсурс] : практыкум / В. М. Шаршнёва. – Электрон. даныя. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2018. – Загал. з экрана.

212022, г. Магілёў
вул. Касманаўтаў,1
тэл.: 8-0222-28-31-51
e-mail: alexpzn@mail.ru
http://www.msu.by

© Шаршнёва В. М., 2018
© МДУ імя А. А. Куляшова, 2018
© МДУ імя А. А. Куляшова, электронны аналаг, 2018

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# СЛОВАЗЛУЧЭННЕ

## Віды сувязі слоў у словазлучэнні

***Практыкаванне 1. Назавіце спалучэнні слоў, якія не з'яўляюцца словазлучэннямі. Вызначце від сувязі слоў у словазлучэннях.***

I. Высока ўзлятаць, бегчы насустрач, трое рабочых, двух хлопчыкаў, жураўліны крык, сівы ад палыну, выйсці прагуляцца, скошаны ўчора, самы прыемны ўспамін, будзем прасіць, маці з сястрой, непадалёку ад рэчкі, жыць з бацькамі, бяроза і клён, трымаць язык за зубамі, насуперак лёсу, давайце падтрымаем, спатыкнуцца на пень, падзякаваць сястры, толькі хлопчыкі, дзякуючы здарэнню, падроблены подпіс, трэці справа, разам з сястрой, направа ад клуба, стомлены да адчаю, няхай жыве, чырвоны ад сораму, паружавелыя шчокі, да адзінаццаці гадзін, семсот шосты, надзвычай важны, зусім стомлены, нават бацькі, прымушаюць працаваць, падарыць на памяць, першы злева, прыехаць пасля сесіі, чужая кішэня, паржавелыя ад вільгаці, самы прыемны ўспамін, больш прыветна, больш насыпаць, будзем святкаваць, нешта незвычайнае, горад і вёска, толькі дарослыя, вязанне спіцамі, поўны даведнік, клопат аб дзецях.

II. Нехта з хлапчукоў, жаданне змагацца, прасторным шляхам, шляхам асноваскладання, пасля дажджоў, невад з рыбай, дваццаць першы, сцямнела на дварэ, усюды і заўсёды, няхай сабе, самы ветлівы, зямля нібы дыхае, буду верыць, у любую хвіліну, стаялі вакол, вакол кветніка, хадзілі сустракаць, давайце пачытаем, нягледзячы на восень, мілыя вобразы, сівы ад пяражытага, восем градусаў, лепей за ўсё, давай пагутарым, наконт зямлі, няхай спрачаюцца, сады і агароды, сто сем, мора хвалявалася, дзвесце трэці, ісці па праспекце, асабліва хвалююць, наперадзе калоны, недалёка ад нас, толькі ліцэісты, яшчэ не сказаў, яшчэ двое, поле ўзарана, устаць на золку, у адпаведнасці з пастановай, шкодна курыць, пятнаццаць чалавек, сходзім сёння, сорак дзевяць, быў з'ездзіў, дзякуючы перамозе, вельмі моцны, майстэрства маляваць, першы злева, шумна ад галасоў.

III. Тры кнігі, дваццаць адзін дзень, адно акно, чацвёра саней, пяць гадоў, васьмі кіламетраў, тысяча рублёў, дзесяці цэнтнераў, трое сутак, адны нажніцы, пяцярых буслянят, чацвёра параненых, дзве сяброўкі, сто старонак, трэці клас, першае каханне, сорак аўтобусаў, трыццаць ча-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

тыры вёскі, сямёра аднакласнікаў, сорак чатыры тоны, мільён усмешак, тысяча дзевяцьсот дзевяноста восьмы год, дзевяноста пяць сшыткаў, двух настаўнікаў, траімі кацянятамі, абедзве лыжкі, абодвух лётчыкаў, да васямнаццаці метраў, у дзвюх сябровак, чатыры камп'ютары, пяць задач, дваццаць дзевяць гадоў.

***Практыкаванне 2. Выпішыце з наступных сказаў сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні. Вызначце від падпарадкавальнай сувязі ў гэтых словазлучэннях.***

1) Два цесляры мянялі насціл на мастку праз ручаіну (М. Лужанін). 2) Чатырнаццатага жніўня, чапляючыся крыллем за нізкія хмары, над самым Жыцькавам ляцелі ў вырай жураўы (Я. Сіпакоў). 3) За тры гады [Скарына] выдае 22 кнігі "Бібліі", перакладзенай ім на беларускую мову (У. Караткевіч). 4) У 1921 годзе ў ліку іншых манастырскіх каштоўнасцяў крыж [Ефрасінні Полацкай] быў рэквізаваны і сляды яго на нейкі час згубіліся (У. Арлоў). 5) Кракаўскі ўніверсітэт быў заснаваны Казімірам Вялікім у 1364 годзе (У. Калеснік). 6) У 1983 годзе ўдзячныя кушлянцы пасадзілі каля каменя памяці паэта-земляка [Францішка Багушэвіча] шэсцьдзясят дубкоў. Кожны сімвалізуе пражыты песняром год. Шэсцьдзясят дубкоў – шэсцьдзясят гадкоў. Такі быў век песняра з Кушлянаў (У. Содаль). 7) Біліся два цецерукі (М. Паслядовіч). 8) У вырай на крылах панеслі журавы бабіна лета (А. Бялевіч). 9) Краінай камянёў называюць Арменію (В. Петрасян). 10) У няволі зубры жывуць да трыццаці гадоў, у прыродных умовах – значна менш (А. Курскоў). 11) Чарната ночы адыходзіла на захад (М. Паслядовіч). 12) Знізу і знутры бабровыя хаткі моцна сцэментаваныя глеем. Нялёгка прабрацца ў такую хатку. У ёй бабёр адчувае сябе ў поўнай бяспецы (В. Вольскі). 13) У лясах процьма грыбоў і ягад (А. Казлоў). 14) Пад гэтым дубам гулялі не раз Кастусь і яго браты (С. Кухараў). 15) Усё жыццё Манюшка падтрымліваў сувязь з музыкантамі Мінска і Гродна (А. Мальдзіс). 16) Л. У. Шчэрба быў не толькі славутым лінгвістам, але і рэдкім у свой час палітолагам (М. Булахаў). 17) Край, багаты на легенды і старажытныя курганы, быў для маладога майстра [Язэпа Драздовіча] жыватворнай крыніцай (А. Ліс). 18) Немалаважнае значэнне ў харчаванні беларусаў мелі напіткі (В. Цітоў). 19) Жыхары Віцебска ўдзельнічалі ў бітве на Няве, на Чудскім возеры, грамілі крыжаносцаў у Юр'еве, шмат разоў паўставалі супраць сваіх феадалаў (У. Караткевіч). 20) Шмат таямнічага ўтойваецца і ў назвах некаторых нашых абласных цэнтраў (Л. Лыч).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Практыкаванне 3. Запоўніце табліцу, выкарыстоўваючы прыведзеныя ніжэй спалучэнні слоў.***

| дапасаванне | кіраванне | прымыканне | не словазлучэнне |
|---|---|---|---|
| | | | |

Тры крокі, нешта новае, дарога дадому, чытаў кнігу, прыехаў дапамагчы, творы Коласа, на тваім хутары, рабіў не спяшаючыся, бацька прыехаў, сцежка паўз плот, вакол хаты, напалоханы стрэлам, расла вакол бярозы, а дзясятай гадзіне, яшчэ спяваюць, яшчэ свежы, просьба застацца, з нашай доляй, будзеце гаварыць, рэдка прыязджаць, недалёка адсюль, артыкул вычытаны, абсадзіць дрэвамі, скошаная трава, думаць пра яе, скасіць траву, чытаць лежачы, апублікаваны раман, апублікаваны ў газеце, недалёка ад школы, размова па-нямецку, дом насупраць, расла насупраць агарода, публікацыя ў часопісе, вельмі карысны, менш актыўны, менш за ўсё, зроблены па-майстэрску, лежачы ў ложку, просьба заспяваць, восем тыдняў, сто восем, васьмі дзён, два дрэвы, пяць чалавек, расчынены насцеж, дзверы расчынены, нявырашаныя пытанні, давайце сходзім, паехаў адпачываць, аб цікавай кнізе, перакладаць нанава, няхай дапаможа, зелянець на пожні, рэдка прыязджаць, мае поспехі, шукаць спажывы, прыходзіць штораз, самыя цікавыя ўспаміны, першае каханне.

***Практыкаванне 4. Выпішыце са сказаў усе словазлучэнні. Зрабіце іх поўны сінтаксічны разбор.***

1) Беларус вялікі аматар пажартаваць, ён не можа абысціся без гумару (У. Караткевіч). 2) З цяністых груш і яблынь маладых сарваў лісты гаручыя віхор (М. Танк). 3) Я прыходжу паслухаць світальную мудрасць дубровы. 4) Сідар вырашыў пабудаваць не хату, а дом з верандай, з балконам пад страхой (А. Чарнышэвіч). 5) У небе цяжка плылі чароды белых воблакаў (А. Асіпенка). 6) Дзьмуў вясенні лёгкі ветрык, пад рэчкай імкліва праносіліся ластаўкі (І. Гурскі). 7) Усё навокал як бы дыхала святочна радасным настроем вясновага абуджэння (Т. Хадкевіч). 8) Уехалі ў лес, і сняжынкі як бы запаволілі сваё імклівае кружэнне (І. Шамякін). 9) Давай удвух сустрэнем ранне сярод туманнай сівізны (П. Панчанка). 10) Паўтараецца вечна, а гучыць не завучана кожнай новай вясной кукаванне зязюльчына (П. Панчанка).

П а р а д а к  с і н т а к с і ч н а г а  р а з б о р у  с л о в а з л у ч э н н я

1) словазлучэнне ў кантэксце;
2) пачатковая форма;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) тып паводле структуры і аб’ёму (простае або складанае);

4) тып паводле семантычнай сувязі кампанентаў (свабоднае, сінтаксічна непадзельнае, фразеалагічна звязанае);

5) тып паводле выражэння галоўнага слова (іменнае: назоўнікавае, прыметнікавае, лічэбнікавае або займеннікавае; дзеяслоўнае; прыслоўнае);

6) тып паводле адносін паміж галоўным і залежным словам (аб’ектнае, атрыбутыўнае, адвербіяльнае);

7) від сінтаксічнай сувязі паміж словамі (дапасаванне: поўнае або няпоўнае; кіраванне: прыназоўнікавае або беспрыназоўнікавае, моцнае або слабае; прымыканне).

8) графічны запіс (указанне галоўнага і залежнага слова, пытанне ад галоўнага слова да залежнага).

У з о р р а з б о р у

Знізу і знутры бабровыя хаткі моцна сцэментаваныя глеем (В. Вольскі).

*Бабровыя хаткі* – словазлучэнне; п.ф. – бабровая хатка; простае; свабоднае; іменнае назоўнікавае, атрыбутыўнае, дапасаванне поўнае.

якія?

Бабровыя хаткі

*Сцэментаваныя знізу і знутры* – словазлучэнне; п.ф. – сцэментаваны знізу і знутры; простае; свабоднае; дзеяслоўнае; адвербіяльнае; прымыканне.

як?

Сцэментаваныя знізу і знутры

*Сцэментаваныя глеем* – словазлучэнне; п.ф. – сцэментаваны глеем; простае; свабоднае; дзеяслоўнае; аб’ектнае; кіраванне беспрыназоўнікавае слабае.

чым?

Сцэментаваныя глеем

## Асаблівасці пабудовы словазлучэнняў у беларускай мове ў параўнанні з рускай мовай

***Практыкаванне 5. Перакладзіце на беларускую мову. Вызначце від сувязі слоў у наступных словазлучэннях.***

І. Поблагодарили преподавателя, послали за доктором, женился на однокурснице, простите меня, издевались над пленными, видела свои-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ми глазами, у меня болит голова, в трёх километрах от города, больной гриппом, смеяться над самим собой, читать про себя, заведующий кафедрой, пойти в лес за орехами, не выполнить из-за лени, смотреть за собой, два лучших ученика, в другой раз, прежде всего, говорить в пользу, обратиться по адресу, потешаться над сестрой, смеяться над младшим, выкосил раньше всех, пошел за маслом, дорога вдоль реки, домик в четыре окна, два раза в день, пойти по ягоды, не отрекусь от тебя, не прочитать повесть, стоять у микрофона, дым идет по ветру, приехать по весне, жить по соседству, рассудить по закону, по случаю юбилея, выбрать по своему вкусу, сказать по секрету, не сделать из-за лени, спрашивать о друге, похож на отца, скучать по ним, как сквозь сон.

II. Послать за сыном, пойти за ягодами, идти по городу, рассказывать о друге, посмеиваться над ним, не издеваться ни над кем, приехать через год, ехать по бескрайним полям, метрах в двадцати, увидеть сквозь туман, заботиться о детях, моложе всех нас, благодарить отца, четыре долгих года, послать по адресу, два раза в месяц, земляника вкуснее клубники, похожий на меня, поехать к сестре, ни к чему не стремиться, стоять возле дома, послать за учебниками, мне на пользу, говорить о своих планах, быстрее меня, ходить по школьным кабинетам, смеяться над неудачами, ходить за водой, в лес за грибами, читать про себя, километрах в пяти от нашей деревни, благодарить друга, болеть ангиной, у меня болит живот, заведующий отделом, написали по этому адресу, споткнуться о пень, тосковал о матери, в пяти километрах от города, проникать сквозь занавес, они дружнее всех, четыре стула, оба брата.

***Практыкаванне 6. Знайдзіце памылкі ў дапасаванні і кіраванні і, выправіўшы іх, запішыце сказы.***

I. 1) Тоні было няёмка за свой страх, яна смяялася над сабой. 2) Кожнаму хочацца паціснуць руку высокага госця, пажадаць яму дабра, здароўя. 3) Ці забудзеш на нашу сустрэчу? 4) Узяўшы рэцэпт, Саша падзякавала Веру Ігнатаўну. 5) Тры апошніх дня перад ад’ездам Машу я не бачыў. 6) Валін брат працуе загадчыкам над клубам. 7) Аб’ём работ павялічыўся ў два з палавінай раза. 8) Больш дзесяці год Віктар займаецца спортам. 9) У пяці кіламетрах ад горада пабудаваны завод. 10) Яго пацешная звычка (як часта кпілі мы над ёю!) раззлавала ўсіх. 11) Як жа яна магла дазволіць, каб Анатоль жаніўся на гэтай спешчанай дзяўчыне? 12) Косця не паспеў падрыхтавацца к заняткам. 13) Над крутым берагам



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

стаяць тры высокіх дубы. 14) Маці адправіла мяне за бацькам, які сек дровы на двары. 15) Раней Ірына Акуловіч працавала на розных пасадах у Магілёўскім абласным тэлерадыёаб'яднанні, прайшла шлях ад уласнага карэспандэнта да загадчыка карэспандэнцкім пунктам у Магілёве Агенцтва тэлевізійных навін Белтэлерадыёкампаніі.

II. 1) Начальнік упраўлення адукацыі ад арганізатараў алімпіяды падзякаваў педагогаў за працу. 2) Паштоўкі з цёплымі словамі ў адрас любога чалавека размесцяць на спецыяльнай выставе, а затым адправяць атрымальнікам. 3) Ад работнікаў МНС можна будзе даведацца, як бяспечна ўпрыгожыць навагоднюю ёлку, што рабіць, каб не апынуцца ў бальніцы з-за петарды ці феерверка. 4) Ацэнка ступені сінхранізацыі спантанага дыхання пацыента і апарата штучнай вентыляцыі лёгкіх распрацавана загадчыкам аддзяленнем анестэзіялогіі і рэанімацыі. 5) Таксама кіраўнік нагадаў, што пры ўзнікненні праблем перавозчыкі ў прыёмныя дні заўсёды могуць звярнуцца за дапамогай, кансультацыяй і парадай да спецыялістаў структурных падраздзяленняў аблвыканкама. 6) Для набыцця вопыту практычнай работы па атрыманай прафесіі накіроўваюцца беспрацоўныя, зарэгістраваныя ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гаррайвыканкамаў з ліку асоб, якія доўгі час (больш за 12 месяцаў) не працавалі ў сувязі з доглядам за дзіцём ва ўзросце да 3 гадоў, за дзіцём-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў, а таксама за дзіцём ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраваным вірусам імунадэфіцыту чалавека ці хворым СНІДам. 7) У завяршэнні сходу начальнік мытні Леанід Досаў падзякаваў ўсіх супрацоўнікаў ведамства за праведзеную працу. 8) У адпаведнасці з новай Інструкцыяй суб'ектам гаспадарання неабходна звяртацца за атрыманнем дазволаў на падаўжэнне тэрмінаў экспартных і імпартных знешнегандлёвых аперацый да аднаго года.

***Практыкаванне 7. Перакладзіце на беларускую мову наступныя сказы.***

1) Замечания и предложения по проекту решения принимаются не позднее 17 июля 2018 года по электронному адресу. 2) Готовность комбайнового парка к уборке зерновых в Могилевской области составляет не менее 90%. 3) Абитуриентам предстоит лично предоставить в приемную комиссию удостоверение личности, заявление, которое заполняется по образцу, выдаваемому вузом, документ об образовании, на основании которого поступает молодой человек. 4) Как рассказала заве-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дующая ботаническим садом Анна Гордеева, дендропарк раскинулся на 14 га. 5) Вручая подарки, председатель райисполкома Анатолий Дутько поблагодарил доблестный экипаж, руководство хозяйства, всех специалистов и тружеников, приложивших немало усилий, чтобы вырастить и собрать богатый урожай. 6) Олег Владимирович с 2007 по 2008 был директором Могилевской государственной санаторной школы-интерната для детей, больных сколиозом. 7) Перед тем как отправиться за грибами и ягодами, не лишним будет изучить карту местности. 8) В решающем поединке за первое место в упорной борьбе Виктор Кляусов был сильнее украинца Александра Крука. 9) Представители Могилевского областного управления побывали в каждом районе области, увидели своими глазами, какие работы ведутся для подготовки к осенне-зимнему отопительному сезону. 10) Спасателям 4 сентября поступило два сообщения о потерявшихся в лесах. В одном из случаев работникам МЧС позвонил сам заблудившийся. Мужчина ранним утром пошел в лес за ягодами и не мог самостоятельно выйти.

**Словазлучэнне.** ***Кантрольны тэст***

***Частка А***

***А1. Адзначце словазлучэнні.***

1) салавей пасвістваў;
2) карыстаецца павагай;
3) менш горка;
4) менш працаваў;
5) давайце прапануем.

***А2. Адзначце спалучэнні слоў, якія не з'яўляюцца словазлучэннямі.***

1) будзем старацца;
2) панура маўчыць;
3) дзед і ўнук;
4) няма часу;
5) абодва пасажыры.

***А3. Адзначце простыя словазлучэнні.***

1) няхай заўсёды жыве;
2) папрасілі намаляваць;
3) самы прыемны ўспамін;
4) сівы ад перажытага;
5) нашы верныя сябры.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

***А4. Адзначце складаныя словазлучэнні.***
1) буду смяяцца з сябе;
2) пайсці ў ягады і ў грыбы;
3) найбольш танны тавар;
4) жанчына сярэдняга ўзросту;
5) новая джынсавая куртка.
***А5. Адзначце свабодныя словазлучэнні.***
1) восем шклозаводаў;
2) пакрыўдзіцца на брата;
3) дом насупраць;
4) раскажу пасля;
5) хварэць на пана.
***А6. Адзначце сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні.***
1) нешта незвычайнае;
2) высокага росту;
3) вочы мазоліць;
4) восемдзесят два гады;
5) кавалак неба.
***А7. Адзначце фразеалагічна звязаныя словазлучэнні.***
1) абое рабое;
2) некалькі тыдняў;
3) цягнула свежасцю;
4) як свае пяць пальцаў;
5) вылецець з галавы.
***А8. Адзначце іменныя словазлучэнні.***
1) заўсёды вінаваты;
2) гэты вучань;
3) заўсёды снедаў;
4) першы справа;
5) вельмі важна.
***А9. Адзначце дзеяслоўныя словазлучэнні.***
1) паабяцаць пасля;
2) вывучаны верш;
3) вывучыўшы верш;
4) трэба вывучыць;
5) вывучаны даўно.
***А10. Адзначце прыслоўныя словазлучэнні.***
1) няма сілы;
2) абсалютна горка;
3) бела ад рамонку;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4) пакрыўдзіўся надоўга;
5) селі побач.

***А11. Адзначце словазлучэнні, звязаныя сувяззю дапасавання.***

1) незнаёмая дзяўчынка;
2) дом насупраць;
3) агарод суседа;
4) тры тыдні;
5) ваша чарга.

***А12. Адзначце словазлучэнні, звязаныя сувяззю кіравання.***

1) больш за год;
2) сшытак сяброўкі;
3) не відаць ні месяца, ні зорак;
4) не відаць нідзе;
5) блізкі ручай.

***А13. Адзначце словазлучэнні, звязаныя сувяззю моцнага кіравання.***

1) ад’ехаць ад горада;
2) дзякаваць дзядулю;
3) плысці ў небе;
4) ісці подбежкам;
5) гарады Беларусі.

***А14. Адзначце словазлучэнні, звязаныя сувяззю прыназоўнікавага кіравання.***

1) зразумець па вачах;
2) у сінім небе;
3) просьба не курыць;
4) смяяцца праз слёзы;
5) хворы на грып.

***А15. Адзначце словазлучэнні, звязаныя сувяззю прымыкання.***

1) селі вакол;
2) адрамантаваць звечара;
3) нельга перашкаджаць;
4) ціха перад навальніцай;
5) многа дзяцей.

***А16. Адзначце рады, у якіх усе спалучэнні слоў з’яўляюцца словазлучэннямі.***

1) сорак гадоў, абсалютна здаровы, па меры набліжэння;
2) наперакор зрабіць, зрабіўшы наперакор, наперакор жаданню;
3) падзякаваць за яблыкі, можна працаваць, давайце падзякуем за дапамогу;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4) у залежнасці ад абставін, дзякуючы падрыхтоўцы, сто восем;

5) цёмна на дварэ, цёмна ў вачах, цёмна ад стомленасці.

***А17. Адзначце рады, у якіх усе словазлучэнні звязаны аднолькавым відам сувязі.***

1) чатыры метры, дзявяты семестр, мой выпускны;

2) вельмі шчыра, нельга прызнавацца, чытаць стоячы;

3) васьмі дзён, сорак рублёў, некалькі гадзін;

4) звыш адзінаццаці метраў; падзяліць на два, падзяліць надвае;

5) хворы на ныркі, шчырасць незнаёмага, паклікаць яе.

***А18. Адзначце словазлучэнні, правільна перакладзеныя на беларускую мову.***

1) дом в четыре этажа – *дом у чатыры паверхі*;

2) видел своими глазами – *бачыў сваімі вачамі*;

3) дым идет по ветру – *дым ідзе з ветрам*;

4) сделать по образцу – *зрабіць па ўзоры*;

5) три раза в неделю – *тры разы на тыдзень*.

***А19. Адзначце словазлучэнні з памылковым спалучэннем лічэбніка і назоўніка.***

1) абодва, маці і бацька;

2) тры генералы;

3) чатыры знаёмыя;

4) пяцярымі нажніцамі;

5) звыш двух тон.

***А20. Адзначце рад(ы), у якім (у якіх) усе словазлучэнні пабудаваны правільна.***

1) ажаніцца з Галяй, багаты на вітаміны, ехаць у буракі;

2) ехаць у дровы, за сем кіламетраў, забылася на ўрокі;

3) ехаць па дровы, крычаць на ўвесь голас, маладзейшы ад мяне;

4) смяяцца самому сабе, сказаць суседцы па сакрэце, догляд кветак;

5) загадчык бібліятэкі, па выхадных днях, жыць у суседстве.

***Частка В***

***В1. Устанавіце адпаведнасць паміж спалучэннем слоў і яго характарыстыкай.***

| | |
|---|---|
| А: адзін з нас | 1. Дапасаванне. |
| Б: адна дзяўчынка | 2. Кіраванне. |
| В: замацавалася слава | 3. Прымыканне. |
| Г: плённа працаваў | 4. Не словазлучэнне. |
| Д: абедзве кнігі | |



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***В2. Устанавіце адпаведнасць паміж словазлучэннем і яго характарыстыкай.***

| | |
|---|---|
| А: не шукае спакою | 1. Дапасаванне поўнае, іменнае (назоўнікавае). |
| Б: сустрэты крытыкай | 2. Кіраванне іменнае (назоўнікавае). |
| В: сапраўднага сяброўства | 3. Кіраванне слабае, дзеяслоўнае. |
| Г: адказнасць за лёс | 4. Кіраванне моцнае, дзеяслоўнае. |
| Д: выканаць віртуозна | 5. Прымыканне. |

***В3. Знайдзіце словазлучэнне, якое не адпавядае нормам беларускай літаратурнай мовы. Запішыце правільны варыянт словазлучэння.***

1) Начальнік упраўлення адукацыі ад арганізатараў алімпіяды падзякаваў педагогам за працу.

2) Паштоўкі з цёплымі словамі на адрас любога чалавека размесцяць на спецыяльнай выставе.

3) Пажар адбыўся па прычыне парушэння правілаў эксплуатацыі электрасетак і электраабсталявання.

4) Мікалай Мінчанка плануе намалаціць не менш пяці тысяч тон збожжа.

5) Пры ўзнікненні праблем перавозчыкі ў прыёмныя дні заўсёды могуць звярнуцца па дапамогу, кансультацыю і параду да спецыялістаў структурных падраздзяленняў аблвыканкама.

***В4. Перакладзіце на беларускую мову наступнае словазлучэнне.***

По случаю юбилея

***В5. Выпішыце са сказа словазлучэнне, у якім словы аб’яднаны сувяззю слабага прыназоўнікавага кіравання.***

Страсае лісце на перон здаўна знаёмы клён (А. Вялюгін).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ПРОСТЫ НЯЎСКЛАДНЕНЫ СКАЗ

## Галоўныя члены сказа

***Практыкаванне 8. Падкрэсліце дзейнік. Вызначце яго тып (просты ці складаны).***

I. 1) Большасць з сельсаветаў была за межамі раёна. 2) Васіліна з сяброўкамі хутка дайшла да свайго ўчастка. 3) Дваццаць гадоў прайшло з таго часу. 4) У Полацку было шмат адукаваных людзей. 5) Лётала мноства прыгожых стракоз (Л. Дайнека). 6) Існі было прыемна, лёгка (І. Шамякін). 7) Хтосьці з хлапчукоў прынёс вады (А. Пальчэўскі). 8) Край сініх азёр мне будзе сніцца заўжды. 9) Душа паэта – плач і смех (М. Танк). 10) Доўга, доўга спаў дзед Нупрэй (А. Жук). 11) З комінаў хат уздымаюцца слупы дыму (М. Лупсякоў). 12) Сафійскі сабор і ў сваім сённяшнім выглядзе пакідае ўнушальнае ўражанне (Т. Хадкевіч). 13) Цэлая гайня сабак насіцца па сядзібе (Л. Дайнека). 14) На свяце бывае шмат гасцей з розных куткоў нашай краіны і з замежжа (з часопіса “Роднае слова”). 15) Дзесьці ўдалечыні пачуліся глухія раскаты грому (В. Вольскі). 16) У паветры павеяў аднекуль лёгкі струменьчык холаду (В. Вольскі). 17) Наляцеў нечакана шалёны парыў ветру (В. Вольскі). 18) Цёмнае неба над возерам прарэзала ад краю да краю доўгая і няроўная агністая лінія маланкі (В. Вольскі). 19) Аднаго разу ехаў купец са сваім сынам і людзьмі санным шляхам да Пінска (А. Ненадавец). 20) Прайшло некалькі тыдняў, і зусім другім стаў краявід возера (П. Броўка).

II. 1) Груздзецкі музей мае цяпер каля шасці тысяч экспанатаў (А. Белакоз). 2) Залатая восень – цудоўная і непаўторная пара, сапраўдны кірмаш фарбаў (паводле каляндара “Родны край”). 3) Самая вясёлая і прыемная мелодыя для байцоў – сігнал на абед (В. Хомчанка). 4) У Рагвалода былі два сыны і дачка Рагнеда (У. Бутрамееў). 5) Хіба ж не хараство гэтая кволая, празрыстая пазалота, гэты апошні ўрачысты ўбор царыцы-прыроды? (М. Зарэцкі). 6) У аўтобусе пасажыраў было мала, ніхто з іх не падышоў да дзвярэй, каб выйсці (Ф. Янкоўскі). 7) Культ дрэў звязаны з абагаўленнем прыроды (Л. Дучыц). 8) Шмат паданняў звязана з асінай, вярбой і бярозай (Л. Дучыц). 9) Праз вершаліны хвой прабівалася яркая барвовасць неба (А. Асіпенка). 10) Імкліва праляцела чародка снегіроў, апусцілася на хмызняк каля рэчкі (А. Асіпенка). 11) Касякі рыб выходзяць на заліўныя лугі (А. Курскоў). 12) На палянку выйшла чарада зуброў (Я. Зазека). 13) Аднаго разу ехаў купец са сваім



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

сынам і людзьмі санным шляхам да Пінска (А. Ненадавец). 14) Творчасць Васіля Канстанцінавіча Цвіркі, народнага мастака Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі рэспублікі, – цэлая эпоха ў мастацкім жыцці Беларусі (П. Карнач). 15) Цяпер рэдка хто можа абыякава праехаць ці прайсці каля трох бярозак (А. Кулакоўскі). 16) Па-сапраўднаму невычэрпная маляўнічая палітра ма´я (А. Курскоў). 17) Сын Лукаша Скарыны хацеў вучыцца далей (У. Арлоў). 18) Кожны чалавек праз усё сваё жыццё нясе ўспамін пра сустрэчу з першай кніжкай (з газеты "Літаратура і мастацтва"). 19) Усё лепшае ў жыцці параўноўваецца з вясною (А. Кулакоўскі). 20) Кожны з нас прыпасае Радзімы куток… (П. Панчанка).

***Практыкаванне 9. Падкрэсліце выказнік. Вызначце яго тып (просты дзеяслоўны, састаўны дзеяслоўны ці састаўны іменны).***

І. 1) Усё жыццё Манюшка падтрымліваў сувязь з музыкантамі Мінска і Гродна (А. Мальдзіс). 2) Сур'ёзнай перашкодай для вяселля былі канфесійныя адрозненні (М. Даніловіч). 3) Побач з паясамі адгароджана ў куфры месца для прыкрас (У. Караткевіч). 4) Ехаць па сельскіх дарогах можна бясконца. 6) Гераічнаю дзяржавай стала Беларусь мая (А. Астрэйка). 7) І недзе ў космасе будуць прывабна цвісці, як і ў нас, іх дзявочыя яблыні (П. Панчанка). 8) Прыняўшы збожжа, Толя выйшаў на двор пагутарыць з людзьмі (В. Быкаў). 8) Давай удвух сустрэнем ранне сярод туманнай сівізны (П. Панчанка). 9) Народная песня багатая на жанры (А. Бачыла). 10) Шчасце – нідзе не спыняцца ў дарозе (С. Грахоўскі). 11) Вялікім быў уплыў князёўны-ігуменні на палітыку Полацка (У. Арлоў). 12) Выбар псеўданіма – заўсёды не да канца разгаданая загадка (Э. Гурэвіч). 13) Тур быў сучаснікам і паплечнікам полацкага князя Рагвалода (У. Арлоў). 14) З Далёкага Усходу на захад не рукой падаць (Я. Зазека). 15) [Самовы] Кручок быў таўшчынёй у палец і даўжынёй каля трыццаці сантыметраў (У. Караткевіч). 16) Ад нечага рабіць яны [цесляры] закурваюць і пачынаюць перамываць косці старшыні (М. Лужанін). 17) Той ціхі адвячорак і цяпер яшчэ ў памяці многіх жыхароў Азершчыны (А. Саснок). 18) Стаць касманаўтамі прагнуць і многія юнакі (П. Клімук). 19) Шлях у неспазнанае быў і застаецца складаны і цяжкі (П. Клімук). 20) Першая лодка, першы плёскат рыбіны, першыя заходы і ўсходы сонца над шырокім лугам, залітым густой сінню разнатраўя, першы крыгаход і першы разліў вады ад краю да краю – гэта ты, Бяроза (М. Ермаловіч).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

II. 1) Паўлюк з братамі вёз з лесу дровы (В. Іпатава). 2) Здольнасць да моватворчасці, да словатворчасці – адна з верных прыкмет чалавечага таленту (Н. Гілевіч). 3) Ён [Гусоўскі] заклікаў еўрапейскія народы аб'яднацца, каб разам даць адпор заваёўнікам на чале з турэцкім султанам (У. Арлоў). 4) Мароз яшчэ не паспеў замураваць шыбы акон (Б. Сачанка). 5) Кожнаму хацелася стаць бліжэй да вады, палюбавацца на сваё ўласнае хараство ў яе люстры (Я. Колас). 6) Розніца ва ўзросце не мела ніякага значэння (А. Бачыла). 7) Ды і нельга спыняцца на паўдарозе (І. Шамякін). 8) Але навальніцы ўлетку імклівыя і кароткія (Т. Хадкевіч). 9) Зашчымела сэрца ад знаёмай дарагой назвы (з часопіса "Родная прырода"). 10) Незвычайнага росквіту дасягнулі [на віцебскай зямлі] скамароства, школьны тэатр, батлейка, народная драма (С. Пятровіч). 11) Людзі ашчадна карысталіся дарамі (З. Бяспалы). 12) Аднак усё ж можна назваць некаторыя тыповыя рысы, уласцівыя народнаму беларускаму характару (У. Караткевіч). 13) Уладзімір даручыў майстру Алексу падшукаць месца для будучага абярэжнага горада і пабудаваць там каменны слуп вышынёй сямнаццаць сажняў (А. Бутэвіч). 14) Дажбог, Ярыла, Каляда і Хорс былі багамі сонца (У. Арлоў). 15) Прарочымі аказаліся тыя словы (В. Іпатава). 16) Пры знаёмстве Марыля не зрабіла асаблівага ўражання на Адама Міцкевіча (К. Цвірка). 17) Ды нейкі неразумны чалавек вырашыў выпрабаваць чароўную сілу каменя (А. Бутэвіч). 18) Яна [Прадслава] рашуча пачала спускацца з высокага абрыву… (В. Іпатава). 19) У расчыненыя дзверы паплыла вільготная свежасць (Т. Хадкевіч). 20) [Сафійскі] сабор пабудаваны ў канцы XI стагоддзя (Т. Хадкевіч).

***Практыкаванне 10. Перакладзіце на беларускую мову. Адзначце выпадкі выкарыстання расшчэпленых выказнікаў. Да якога тыпу выказнікаў (просты дзеяслоўны, састаўны дзеяслоўны, састаўны іменны) яны адносяцца? У якіх выпадках яны могуць быць заменены дзеясловамі?***

Завод заканчивает освоение производства нового трактора. Этот трактор будет намного мощнее, чем ныне выпускаемые машины. Коллектив завода взял обязательство ускорить выпуск новой модели. Работники цеха испытаний и центральной лаборатории проводят соревнование за быстрейшее освоение технологии контроля качества узлов. Особое внимание на заводе уделяется тому, чтобы в кратчайшие сроки произвести освоение нового высокопроизводительного оборудования,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

поступившего от предприятий-смежников. Труженики завода проявляют полную уверенность, что им удастся добиться досрочного выполнения взятых обязательств.

## Дадання члены сказа

***Практыкаванне 11. Зрабіце разбор па членах сказа. Дайце поўную характарыстыку <u>галоўным</u> (дзейнік: просты ці складаны; выказнік: просты дзеяслоўны, састаўны дзеяслоўны ці састаўны іменны) і <u>даданым</u> (дапаўненне: прамое ці ўскоснае; азначэнне: дапасаванае ці недапасаванае; акалічнасць: месца, часу, прычыны, мэты, спосабу дзеяння, меры і ступені) членам сказа. Вызначце тып кожнага сказа паводле наяўнасці дзейніка і выказніка.***

1) Без канца можна ехаць па селавых дарогах і ніколі не перастаць любавацца ўсім наваколлем (Я. Скрыган). 2) Восеньскі лес быў сцюдзёны, туманны і шматфарбны (Л. Дайнека). 3) Навокал бруіцца вясновы звон вады і сонца (М. Вышынскі). 4) У кожнага аўтара свая дарога і свой лёс (А. Бачыла). 5) Красавік – месяц першага дажджу (Р. Ігнаценка). 6) Чатыры сасны засталіся стаяць пасярод лесасекі (І. Шамякін). 7) З Рыгорам Шырмам нас пазнаёмілі ў ліпені сорак чацвёртага года, у дзень партызанскага парада (Я. Брыль). 8) Даўно мінула, адышла, можна сказаць, у нябыт з нашае старонкі вайна (Б. Сачанка). 9) Гадоў трыццаць назад вуліцы не было. Адразу з чыгуначнага пераезда вачам адкрываўся шырокі разліў жытоў, ячмянёў, аўсоў (І. Навуменка). 10) Валуны значнага памеру сцягваюць на межы трактарамі ці спіхваюць бульдозерамі (У. Караткевіч). 11) Ад бога Тура залежала жыццё дзікіх звяроў і поспех на паляванні (У. Арлоў). 12) Хаты для Андрэя нечакана здаюцца вельмі маленькімі (П. Пестрак). 13) Як кіпела тады ў Паўлюку нястомная прага ведаць болей! (В. Іпатава). 14) Аднак неўзабаве праваруч адкрылася поле з вузкімі грывамі пералескаў (з часопіса “Родная прырода”). 15) Быў яркі летні поўдзень, з мяккімі белымі воблачкамі ў сінім небе, з лёгкім ветрыкам (Л. Дайнека). 16) Горад з меладычнай назвай Маладзечна паяднаў на стыку тысячагоддзяў нацыянальную беларускую музыку і паэзію (з часопіса “Роднае слова”). 17) Праз Камянец праходзіў каралеўскі шлях з Кракава ў Вільню (А. Бутэвіч). 18) Самай фундаментальнай працай Я. Ф. Карскага пра беларускую мову ў яе гістарычным развіцці і сучасным стане з’яўляецца трохтомнае даследаванне “Бело-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

русы” (М. Булахаў). 19) Адным з найбольш яскравых, маляўнічых і паэтычных абрадаў у беларусаў было свята Купалле (Л. Касцюкавец). 20) Тонкае кужэльнае палатно ткалі для намітак і кашуль (Г. Курыновіч).

***З 8-га сказа выпішыце ўсе словазлучэнні і зрабіце іх поўны сінтаксічны разбор.***

***Практыкаванне 12. Укажыце, якімі членамі сказа з’яўляюцца падкрэсленыя словы. Вызначце склон падкрэсленага ў 4-м сказе назоўніка.***

1) Трактар “Беларусь” вядомы ў многіх краінах свету. 2) Прыемнасць – пазнаёміцца з чалавекам ветлым, радасць – пагутарыць з разумным, удача – знайсціся ў патрэбе са смелым, шчасце – жыць і працаваць з чалавекам сумленным (М. Танк). 3) Паэт М. Багдановіч з’яўляецца гордасцю нашага краю. 4) Кланяйся, громе, роднаму полю, родны вітай ты мой кут! (Я. Колас). 5) Нам патрэбен мір. 6) Столькі зроблена карысных спраў! 7) Дарогу праз лес праехалі непрыкметна. 8) У хату увайшоў разведчык Фядотаў. 9) Хлопцы прыпыніліся адпачыць. 10) Пагранічнікі прывучыліся хадзіць ціха. 11) Ляжаць Аляксею было няёмка. 12) Праз гэты двор прайсці прыемна. 13) Рассыпаны зоркі па небе імглістым. 14) Адсюль уся вёска як на далоні. 15) Вясна! У яркай квецені палеткі і сады. 16) Хатка над балотам стаіць на нізкім цэментавым падмурку. 17) Занятак госця – смачна есці. 18) Куфар аздаблялі каштоўнымі камянямі. 18) Дапамагчы мне мог толькі брат. 19) Сокам бярозы пахне зямля. 20) Дома не было нікога.

***Практыкаванне 13. Назавіце часціну мовы і сінтаксічную функцыю падкрэсленых слоў.***

1) Глядзець гэты фільм сумна. 2) Сцёпка прыбег да фінішу трэцім. 3) Добразычлівы народ дзеці. 4) Добра стаміцца ад цяжкіх дарог, схіліцца ў знямозе пад елку на мох (В. Вярба). 5) На змену сонечным дням прыйшлі халады. 6) Дакументы прымаюць пачынаючы з ліпеня. 6) Матчыны рукі ніколі не чуюць цяжару свайго дзіцяці (Р. Сабаленка). 7) Прыём хворых малады ўрач Раман Карпавіч пачаў з самага ранку. 8) Цячэ рака Прыпяць шырока, велічна (В. Вітка). 9) Хатка над балотам стаіць на нізкім цэментавым падмурку (Я. Колас). 10) Столькі зроблена карысных спраў! 11) У сённяшнім Міры і наваколлі засталося нямала сведчанняў шматгадовай прысутнасці татараў (з часопіса “Роднае слова”). 12) А з якой беражлівасцю і разуменнем раскрываў Рыгор



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Раманавіч хараство народных мелодый! (А. Бачыла). 13) За гэтай хмараю вецер гнаў другую (В. Вольскі). 14) Чацвярым ластавяняткам было холадна і непрыемна сядзець на дроце (В. Вітка).

***Практыкаванне 14. Прачытайце сказы. Выпраўце, дзе трэба памылкі, звязаныя са спалучальнасцю дзейніка і выказніка, прыдаткаў і азначэнняў.***

1) Удзельнікаў семінара сустракаў галоўны аграном камбіната Галіна Корзун. 2) Фларыстыцы прысвяціла свой вольны час малады дызайнер Ганна Чарняўская. 3) Знакамітая вучоны-батанік Верасава шмат часу адводзіла на вопытную работу. 4) Праграміст Пятрова выдатна валодае камп'ютарам. 5) Галоўны інжынер завода Пронін Т. М. падпісаў загад. 6) У судовым працэсе ўдзельнічала адвакат Марыя Зосімава. 7) Новая дырэктар школы Зайцава А. М. шмат увагі надае працы з маладымі калегамі. 8) Сучасную інтэрпрэтацыю рок-мюзікла па аднайменнай п'есе Рыгора Горына паставіў рэжысёр Анастасія Грыненка. 9) Сувеніры і прысмакі прывезла намеснік Міністра аховы здароўя – галоўны санітарны ўрач Беларусі Наталля Жукава. 10) У завяршэнні сходу начальнік мытні Леанід Досаў падзякаваў ўсім супрацоўнікам ведамства за праведзеную працу.

## Аднасастаўныя і двухсастаўныя, поўныя і няпоўныя сказы

***Практыкаванне 15. Прачытайце сказы. Ахарактарызуйце іх паводле саставу (аднасастаўны ці двухсастаўны), а таксама паводле сэнсавай і граматычнай завершанасці (поўны ці няпоўны).***

1) Наш народ нельга было паставіць на калені (М. Машара). 2) Хацеў бы заплакаць, дый слёз не дастаў (Я. Купала). 3) Хутка лясную цішыню скалануў стрэл, потым грымнуў другі. 4) Абяцанкаў доўга чакаеш (А. Жук). 5) Гнёзды паўсюль (У. Караткевіч). 6) Было бязлюддзе (У. Караткевіч). 7) Знаёмае, роднае чулася ў песні пра лета. 8) Нам патрэбен мір. 9) Спускацца ў роў было нязручна і страшна (А. Асіпенка). 10) Больш за сто тысяч салдат і афіцэраў чацвёртай гітлераўскай арміі былі акружаны ў мінскім катле (М. Лынькоў). 11) Вучыцца ніколі не позна (Прыказка). 12) Людзі стаялі суровыя, маўклівыя (А. Асіпенка). 13) Зімовы дзень што ў вераб'я дзю-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ба (Прыказка). 14) Гордасцю пушчы з’яўляецца зубр (В. Вольскі). 15) Уладжваўся з сям’ёй у сялянскай хаце і праводзіў лета сярод лясоў, палёў і лугоў (М. Лынькоў). 16) За выключэннем возера Рыца і азёр Швейцарыі, Свіцязь самае прыгожае ў Еўропе (Я. Сіпакоў). 17) Гадоў трыццаць назад вуліцы не было. Адразу з чыгуначнага пераезда вачам адкрываўся шырокі разліў жытоў, ячмянёў, аўсоў (І. Навуменка). 18) Дык з чаго пачнём наша падарожжа па Полацку? (Н. Гальпяровіч). 19) Словатворчасць Купалы – з’ява выключная ў гісторыі беларускай літаратуры (Н. Гілевіч). 20) Паваротак направа, дарога на Харужанцы (з часопіса “Родная прырода”).

***Практыкаванне 16. Размяркуйце сказы па наступных групах: 1) назыўныя; 2) пэўна-асабовыя; 3) няпэўна-асабовыя; 4) абагульнена-асабовыя; 5) безасабовыя; 6) інфінітыўныя; 7) двухсастаўныя няпоўныя.***

І. 1) Не магу не ўспомніць адзін выпадак (Д. Бічэль-Загнетава). 2) Саскочыў з каня і кульнуўся ў траву (В. Іпатава). 3) А колькі цудоўных народных песень на Віцебшчыне! (С. Пятровіч). 4) Веру ў адзіную і непаўторную краіну нашую – Б е л а р у с ь (А. Бутэвіч). 5) У вёсцы бываю рэдка (Я. Галубовіч). 6) Хацелася на прастор палёў (А. Асіпенка). 7) Імклівая шаша (з часопіса “Родная прырода”). 8) Паваротак направа, дарога на Харужанцы (з часопіса “Родная прырода”). 9) Праз якія два-тры кіламетры, не даязджаючы да вёскі, зварочваю ў казачны восеньскі лес (з часопіса “Родная прырода”). 9) Падышоў да яблыні, страсянуў яе, падабраў з пульхнай раллі дзве антонаўкі і паціху падаўся з саду (Я. Галубовіч). 10) Вось і адмыслова зробленая брама (з часопіса “Родная прырода”). 11) У лесе заўсёды хараша думаецца (І. Шамякін). 12) У мутнаватай сіні чэрвеньскага неба жаваранкаў пакуль што не відаць (Я. Брыль). 13) Вазілі прадаваць грыбы ажно ў Маладзечна (Я. Галубовіч). Да нядаўняга часу дубам насілі ахвяры і на галіны вешалі ручнік (Л. Дучыц). 14) Бору пад ветрам гнуцца, поўні – дрыжаць слязою (Р. Барадулін). 15) Дрэвы і кветкі садзяць у нас у час урачыстасцей, пры нараджэнні чалавека, у дні вяселляў, у знак дружбы (К. Кірыенка). 16) А кветак, кветак (Я. Колас). 17) Рыхтуй летам сані, а зімой калёсы (прыказка). 18) Караніся ж, вечнае дрэва славянства, пі шчодрыя сокі роднай зямлі, цягніся ў высокія нябёсы! (С. Законнікаў). 19) Вось толькі б адысці далей і перадыхнуць крыху (І. Мележ). 20) Не злічыш дароў тваіх, верасень, сёлета (А. Вялюгін).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

II. 1) Аднак усё ж можна назваць некаторыя тыповыя рысы, уласцівыя народнаму беларускаму характару (У. Караткевіч). 2) Дзвіна. Паўночная водная артэрыя Беларусі (Т. Хадкевіч). 3) Сёння тут музей і канцэртная зала з магутным арганам (Н. Гальпяровіч). 4) З невясёлымі думкамі апынуўся ля сваёй хаты (Я. Галубовіч). 5) Курганы, гарадзішчы, сляды колішніх абарончых умацаванняў, помнікі-абеліскі… (Т. Хадкевіч). 6) Гісторыю Полацка прынята лічыць з летапіснага запісу 862 года ў "Аповесці мінулых гадоў" (Т. Хадкевіч). 7) Не было ў Георгія і няма цяпер нікога больш блізкага за Прадславу (В. Іпатава). 8) А цяпер давайце падымемся па вузкай сцяжынцы ўздоўж вала і выйдзем на так званы Верхні Замак (Н. Гальпяровіч). 9) Поўнымі кошыкамі цягалі з лесу баравікі і падасінавікі, бралі лепшыя падбярозавікі (Я. Галубовіч). 10) І вось вёска Карпілаўка (з часопіса "Родная прырода"). 11) Раней камяні лічылі жывымі (А. Ненадавец). 12) Не, нашых пожняў больш нікому чужому танку не таптаць (А. Бачыла). 13) Усё было знаёма з дзяцінства (А. Асіпенка). 14) На зажынках, у першы дзень жніва, у вёску з песнямі неслі сноп, перавіты васількамі (А. Сілянкоў). 15) Над ціхай, стомленай вёскай шчодрае зорнае неба і самотны сарамлівы маладзік (В. Быкаў). 16) У доме павешанага не размаўляюць пра шворку (Прыказка). 17) Полацкая Сафія. Каменны цуд XI стагоддзя. ("Літаратура і мастацтва"). 18) Пачынаюць капаць бульбу (Я. Колас). 19) Краінай камянёў называюць Арменію (В. Петрасян). 20) У лес дроў не возяць (прыказка).

***Практыкаванне 17. Прачытайце сказы з назоўным уяўлення. Адкажыце на пытанне: чым адрозніваецца назоўны ўяўлення ад назыўных сказаў і ад зваротка.***

1) Цішыня… Яна паступова ахутвала маю душу, адганяла з яе стомлены настрой, які я прывёз сюды з сабою (М. Капыловіч). 2) Роднае слова… Яно ўваходзіць у наша жыццё з вуснаў маці яшчэ ў маленстве. У ціхім журчанні матчыных песень-калыханак, у яе пяшчотных ласках мы пачынаем улоўліваць яго своеасаблівыя формы і гучанне (А. Крывіцкі). 3) Восень… Пара адцвітання. Колькі красы, колькі ціхага хараства ў тваім задуменні! (М. Зарэцкі). 4) Полацк… Услухайцеся ў само гучанне гэтага слова (Н. Гальпяровіч). 5) Адам Міцкевіч… Гэтым імем сусветна вядомага паэта, славутага сына беларускай зямлі паасабліваму высвечваецца Таварыства філаматаў, якое ён арганізаваў і выпеставаў разам з сябрамі (К. Цвірка). 6) Бабка Вера… Штосьці ў яе імені падалося мне сімвалічным (П. Місько).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Сінтаксічная функцыя інфінітыва

***Практыкаванне 18. Вызначце сінтаксічную функцыю інфінітыва.***

I. 1) Агульнабеларускі характар меў звычай класці ў ваду для першага купання абавязкова зерне і грошы ці якія-небудзь іншыя прадметы (Т. Кухаронак). 2) Дзяжурыць на станцыі даводзілася не столькі ўдзень, колькі ўночы (С. Баранавых). 3) І дзед Талаш не адважваецца тады ад'язджаць на сваім чоўне на сярэдзіну Прыпяці (Я. Колас). 4) Бегчы стала трохі лягчэй (У. Караткевіч). 5) Рэдка хто, кіруючыся паўз сад, не бег паласавацца ягадамі, набіць аскому яблыкамі, слівамі (Б. Сачанка). 6) Бортнік вельмі даражыў сваёй прафесіяй і толькі перад смерцю паведамляў свайму пераемніку самыя глыбокія яе таямніцы, вучыў варажыць і перадаваў свой бортны знак (П. Сабіна). 7) Ніхто не мае права адмовіць чалавеку ў апошнім жаданні (У. Арлоў). 8) Шчасце было слухаць гэты шматгалосы гімн непераможнаму жыццю (Я. Крамко). 9) Сюды надвячоркам прыйшлі ласі, падмацаваліся спажыўнай асінавай карою і ўлягліся адпачываць на белай снежнай пасцелі (З часопіса "Родная прырода"). 10) Сцежку замяло. Спускацца ў роў было нязручна і страшна (А. Асіпенка).

II. 1) Мы ехалі адпачыць на ўлонні прыроды, пабавіць час (М. Ермаловіч). 2) Ісці было прыемна, лёгка (І. Шамякін). 3) Яна [цішыня] быццам запрашае прыслухацца да самога сябе (з часопіса "Родная прырода"). 4) Ён [Антанюк] прыехаў сюды проста адпачыць (І. Шамякін). 5) Прыемна прайсціся па прыгожым парку, удыхнуць паветра стагоддзяў, наталіцца музыкай (з часопіса "Роднае слова"). 6) Хто навучыў нас любіць кнігу? (В. Вітка). 7) А пасяляючыся на чужой зямлі, продкі нашы сваім абавязкам лічылі прыняць новае для іх слова і падзяліцца сваім (Г. Бураўкін). 8) Валодаў ён [камень] незвычайным дарам – дапамагаць бедным людзям (А. Бутэвіч). 9) Бортнік вельмі даражыў сваёй прафесіяй і толькі перад смерцю паведамляў свайму пераемніку самыя глыбокія яе таямніцы, вучыў варажыць і перадаваў свой бортны знак (П. Сабіна). 10) Рагвалод не стаў прымушаць Рагнеду і дазволіў ёй самой выбраць мужа (У. Бутрамееў).

***Практыкаванне 19. Размяркуйце сказы па наступных групах: 1) інфінітыў выконвае сінтаксічную функцыю дзейніка; 2) інфінітыў выконвае сінтаксічную функцыю выказніка; 3) інфінітыў выконвае***

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***сінтаксічную функцыю дапаўнення; 4) інфінітыў выконвае сінтаксічную функцыю азначэння; 5) інфінітыў выконвае сінтаксічную функцыю акалічнасці.***

1) Князёўну Рагнеду Уладзімір сілаю прымусіў пайсці за яго (У. Бутрамееў). 2) Уладзімір заваяваў свайго брата Яраполка і стаў княжыць у Кіеве (У. Бутрамееў). 3) Умовы жыцця народа і ў далёкім мінулым вымушалі многа займацца будаўніцтвам рознага роду вытворчых аб'ектаў, жылля (Л. Лыч). 4) Для пастушкоў пранікнуць у лес было марай (П. Пестрак). 5) Без канца можна ехаць па селавых дарогах і ніколі не перастаць любавацца ўсім наваколлем (Я. Скрыган). 6) Добра іншы раз без клопату і хвалявання паваляцца ў цяньку, падыхаць чыстым паветрам, насычаным пахам поля, лесу, лугавіны (І. Навуменка). 7) Я прывучаў малых быць на марозе, дыхаць чыстым марозным паветрам (В. Сухамлінскі). 8) Раніцай мы ішлі ў школьную цяпліцу сустракаць усход сонца (В. Сухамлінскі). 9) Але дацягнуцца да норак зверху мядзведзь не мог (М. Звераў). 10) Папрашу дзеда пайсці заўтра са мной за сіні лес! (А. Бялевіч). 11) Вецер скуголіў, раз'юшана завываў, пагражаў падчапіць гняздо і скінуць яго разам з птушкай (А. Пальчэўскі). 12) Высоцкі спыніўся пад бярозкамі перачакаць дождж (А. Кулакоўскі). 13) У дзеда Талаша быў дзіўны звычай – браць сякеру, адлучаючыся з дому (Я. Колас). 14) Савініч выказаў гатоўнасць асабіста ўдзельнічаць у пагоні (У. Арлоў). 15) Тапор перасмыкнуў плячыма, саскочыў з параконкі, на якой стаяў, і аддаў атраду загад рыхтавацца да выступу (У. Арлоў). 16) Суседка прыдумала збегаць па ваду для кветак (Е. Лось). 17) Я люблю ў гэты вечар блукаць вуліцамі роднага Мінска, углядацца ў яго шматграннае і непаўторнае аблічча, услухоўвацца ў мітуслівую перадсвяточную людскую гаману (Т. Хадкевіч). 18) Дзядзька, агледзеўшыся ў хаце, сядаў перадыхнуць з дарогі (Т. Хадкевіч). 19) Прабіцца праз рачны туман патрэбна плытагонам (Г. Кляўко). 20) У дружбе жыць – шчаслівым быць (прыказка).

***Практыкаванне 20. Зрабіце поўны сінтаксічны разбор наступных сказаў і поўны сінтаксічны разбор падкрэсленых словазлучэнняў.***

***Варыянт № 1***

1. Страшэнны штукар і свавольнік гэты Нёман (Я. Колас).

2. *З драўніны елак* вырабляюць скрыпкі і *іншыя музычныя інструменты* (М. Капыловіч).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Варыянт № 2***

1. *Крочу з вудай* берагам Нёмана *на сваё рыбнае месца*.

2. У канцы мая вялікая група хлопцаў і дзяўчат паехала *на некалькі дзён* у Ленінград (У. Караткевіч).

***Варыянт № 3***

1. Няма ў прыродзе *нікчэмных, абыякавых, непатрэбных рэчаў* (Л. Каскевіч).

2. Зіма *падыходзіла к канцу* (А. Чарнышэвіч).

***Варыянт № 4***

1. На Украіне ўлетку заўсёды пыл на дарогах (В. Быкаў).

2. Усе *птушкі наваколля* часта *прылятaлі да крынічкі* палячыцца ад сваіх хвароб або адпачыць у цяньку ці пакупацца ў ручаі (В. Хліманаў).

***Варыянт № 5***

1. Паміж высокім берагам і вадой шырокая *стужка* белага *пяску* (М. Чарняўскі).

2. *Злавесны сэнс* сказанага прымусіў палоннага *зноў сесці* (У. Арлоў).

Парадак сінтаксічнага разбору простага сказа

1) сказ паводле структуры (просты ці складаны);

2) сказ паводле мэты выказвання (апавядальны, пытальны, пабуджальны);

3) сказ паводле інтанацыі (клічны, няклічны);

4) сказ паводле адносін да рэчаіснасці (сцвярджальны, адмоўны);

5) сказ паводле наяўнасці галоўных членаў сказа: аднасастаўны (назыўны, пэўна-асабовы, няпэўна-асабовы, абагульнена-асабовы, безасабовы, інфінітыўны) ці двухсастаўны;

6) сказ паводле наяўнасці даданых членаў сказа (развіты, неразвіты);

7) сказ паводле сэнсавай і граматычнай завершанасці;

8) разбор па членах сказа.

Узор разбору

1) Трэба было нешта рабіць з маімі кнігамі і рукапісамі (У. Арлоў).

Сказ просты, апавядальны, няклічны, сцвярджальны, аднасастаўны безасабовы, развіты, поўны.

2) Што прымушае пярнатых качэўнікаў пакідаць месца гняздоўяў? (Я. Суханаў).

Сказ просты, пытальны, няклічны, сцвярджальны, двухсастаўны развіты, поўны.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Просты няўскладнены сказ.** ***Кантрольны тэст***

***Частка А***

***А1. Адзначце сказы, у якіх правільна падкрэслены дзейнікі.***

1) *Мне* вельмі хацелася злавіць снегіра (А. Бялевіч).

2) Самая вясёлая і прыемная мелодыя для байцоў – *сігнал* на абед (В. Хомчанка).

3) З валуноў, расколатых берталетавай соллю, будавалі і часам будуюць цяпер *стайні, свірны, пуні* (У. Караткевіч).

4) *Усё* навокал завалакло дымам (Б. Сачанка).

5) Снуе над ліпамі *процьма* рознай *машкары* і *мух* (Я. Крамко).

***А2. Адзначце сказы з простым дзейнікам.***

1) З-за Нёмана чуліся галасы кнігавак (Я. Крамко).

2) Вакол ствалоў сосен і бяроз ляжаць мяккія мохавыя купіны (З. Бяспалы).

3) Наша Брэстчына мае багатую і слаўную гісторыю (У. Калеснік).

4) Лётала мноства прыгожых стракоз (Л. Дайнека).

5) Хтосьці з хлапчукоў прынёс вады (А. Пальчэўскі).

***А3. Адзначце сказы са складаным дзейнікам.***

1) Толькі пасля вайны ў дзяржаўны запаведнік “Белавежская пушча” з Польшчы завезлі пяць зуброў (А. Курскоў).

2) Шмат існуе паданняў аб вадаёмах (Л. Дучыц).

3) Сотні зорак былі рассыпаны ў сінім бяздонні неба, як залаты гарох (З. Бядуля).

4) З дапамогай Даніка Уладзімір Іванавіч узяўся бандарыць (І. Шамякін).

5) На камбайне працаваў Карней з памочнікам (І. Шамякін).

***А4. Адзначце сказы, у якіх правільна падкрэслены выказнікі.***

1) З Далёкага Усходу на захад не *рукой падаць* (Я. Зазека).

2) Яблыні *стаялі* зажураныя, стомленыя (Я. Галубовіч).

3) *Няма* над возерам ні ластавак, ні чаек (з часопіса “Родная прырода”).

4) Ох, як *прыемна* стала пасля некалькіх глыткоў вады (І. Грамовіч).

5) *Хочацца* блукаць па заснежаных палях, любавацца хараством восеньскіх узлескаў, углядацца ў бяскрайнія прасторы (П. Карнач).

***А5. Адзначце сказы з простым дзеяслоўным выказнікам.***

1) Добра было ясным днём на высокім беразе (К. Чорны).

2) На кожным кроку гітлераўцам аказвалі жорсткае супраціўленне (В. Вольскі).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) Пракладаецца першы след па новай саннай дарозе (М. Машара).

4) Стаць касманаўтамі прагнуць і многія юнакі (П. Клімук).

5) Вясновай раніцай я ішоў палявой дарогай між руні (А. Пальчэўскі).

***А6. Адзначце сказы з састаўным дзеяслоўным выказнікам.***

1) Сонца і тое не магло прабіць сваім святлом густую лясную засень (А. Ненадавец).

2) Дальнія хвойнікі былі зацягнуты шызай смугой (І. Шамякін).

3) Кожнаму хацелася стаць бліжэй да вады, палюбавацца на сваё ўласнае хараство ў яе люстры (Я. Колас).

4) Неяк нядаўна мне давялося пабываць у роднай вёсцы (Я. Галубовіч).

5) Вучыцца ніколі не позна (прыказка).

***А7. Адзначце сказы з састаўным іменным выказнікам.***

1) Шчодрым, умалотным, жыццястойкім і вынослівым аказалася даўняе радаводнае сяйво (А. Бутэвіч).

2) Слаўна пахла грыбамі (К. Чорны).

3) Пярун лічыўся сынам вярхоўнага бога (У. Арлоў).

4) Надвор’е на возеры няўстойлівае (В. Вольскі).

5) Усё жыццё Манюшка падтрымліваў сувязь з музыкантамі Мінска і Гродна (А. Мальдзіс).

***А8. Адзначце сказы, у якіх правільна падкрэслены дапаўненні.***

1) Лавілася *на прыпынках* рыба (Ф. Янкоўскі).

2) Будавалася *шмат цэркваў* (Л. Качанка).

3) Побач з паясамі адгароджана ў куфры *месца* для прыкрас (У. Караткевіч).

4) Тонкае кужэльнае палатно ткалі для намітак і кашуль (Г. Курыновіч).

5) Назарэўскі папрасіў шафёра *ехаць* паціху (К. Чорны).

***А9. Адзначце сказы, у якіх правільна падкрэслены азначэнні.***

1) Свет уяўляўся *неабдымным*, *бясконцым* (А. Асіпенка).

2) Сын *Лукаша Скарыны* хацеў вучыцца далей (У. Арлоў).

3) Рагвалод быў *мужны* і *разумны* кіраўнік (У. Бутрамееў).

4) Неба цяпер *празрыста-сіняе*, *чыстае*, *без воблакаў* (з часопіса “Родная прырода”).

5) Сцёпку прыйшла ў галаву смелая думка *пабачыцца* з Аленкай (Я. Колас).

***А10. Адзначце сказы, у якіх правільна падкрэслены акалічнасці.***

1) На паверхні ціха (В. Быкаў).

2) Ціха было і спакойна *пад* стагоднімі *хвоямі* (К. Чорны).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) З Нёмана пацягнула прахалодай.

4) І здаецца: зноўку еду я дадому пераведаць родных, блізкіх, дарагіх (П. Трус).

5) Дзверы насупраць вядуць у каморку, дзе таксама рэчы для гаспадаркі (У. Караткевіч).

***А11. Адзначце сказы, у якіх ёсць прамыя дапаўненні.***

1) Чацвярым ластавяняткам было холадна і непрыемна сядзець на дроце (В. Вітка).

2) Важна ведаць лясныя арыенціры і ўмела імі карыстацца (з календара “Родны край”).

3) Цяжка адарваць вочы ад казачнай прыгажосці (І. Мяжэвіч).

4) Скарына змайстраваў друкарскі станок, даў беларусам друкаваную кнігу (з газеты “Літаратура і мастацтва”).

5) У канцы лета зжалі і па ўсім полі паставілі залацістыя сціркы духмянай саломы (Р. Ігнаценка).

***А12. Адзначце сказы, у якіх ёсць недапасаваныя азначэнні.***

1) Атрамант [чарніла] рабілі з адмысловых арэхаў, з адвару дубовай і альховай кары, з жалезнай іржы, вішнёвага клею (У. Арлоў).

2) Нястомнасці, руплівасці мурашак можна было б павучыцца і людзям (Б. Сачанка).

3) Калодзеж быў неглыбокі, дагледжаны, з пясчаным дном (В. Хліманаў).

4) Лес увесь у расе, блішчыць (Б. Сачанка).

5) Дзве гадзіны ішла нарада аб становішчы ў Петраградзе (І. Шамякін).

***А13. Адзначце сказы, у якіх правільна падкрэслены прыдаткі.***

1) І дзед Талаш не адважваецца тады ад’язджаць на сваім чоўне на сярэдзіну Прыпяці (Я. Колас).

2) Край, багаты на легенды і старажытныя курганы, быў для маладога майстра Язэпа Драздовіча жыватворнай крыніцай (А. Ліс).

3) Далёка разліваецца Бяроза-рака ўвесну (М. Ваданосаў).

4) Раса, прадвесніца яснага дня, павольна збягае на зямлю (У. Караткевіч).

5) Рупны Мінск-гаспадар працай славіцца плённай (Р. Барадулін).

***А14. Адзначце аднасастаўныя сказы.***

1) Прывялая канюшына пахла густа і чуць душнавата (А. Жук).

2) Сонца сасне хапае (І. Навуменка).

3) Было відаць кожную пясчынку на дне (У. Караткевіч).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4) З агародаў пахне завялым памідорным бацвіннем (М. Лупсякоў).

5) І раптам нечаканасць (А. Саснок).

***А15. Адзначце двухсастаўныя няпоўныя сказы.***

1) Гармонік узяў у рукі, сыграў польку (Д. Бічэль-Загнетава).

2) Цішыня ў вёсцы (П. Пестрак).

3) Цяга да выключнага, дзіўнага, мабыць, у самой прыродзе чалавека (І. Навуменка).

4) Хто не ведаў у наваколлі крошынскага каваля? (В. Іпатава).

5) Не чуваць ні стрэлу, ні выбухаў. На паверхні ціха (В. Быкаў).

***А16. Адзначце назыўныя сказы.***

1) Бусліная радасць маленства (А. Зэкаў).

2) Ціха, глуха на балоце (А. Бялевіч).

3) Гаркаватая радасць (У. Арлоў).

4) А вось сабор Свята-Еўфрасіннеўскага манастыра (“Літаратура і мастацтва”).

5) Ліпа ў самай квецені (Я. Брыль).

***А17. Адзначце пэўна-асабовыя сказы.***

1) Пад гоман радаводнага дрэва думаем пра вечнасць, пранікаемся гістарычным аптымізмам, верай у будучыню (Г. Кісялёў).

2) Гаспадароў дома не было (Я. Галубовіч).

3) Крочу з вудай берагам Нёмана на сваё рыбнае месца (Я. Крамко).

4) Дол на грудку штогод засеяны шышкамі (І. Навуменка).

5) Плывём, стаіўшы дыханне, напружана прыглядаемся і прыслухоўваемся (Я. Маўр).

***А18. Адзначце няпэўна-асабовыя сказы.***

1) Часта разам з крыніцамі ўшаноўваюцца валуны і дубы (Л. Дучыц).

2) Вадзе ахвяравалі таксама каменныя сякеры, ежу, кветкі (Л. Дучыц).

3) Не чуваць ні стрэлу, ні выбухаў. На паверхні ціха (В. Быкаў).

4) А цяпер апусцімся ўніз і пройдзем ціхай зялёнай дзвінскай набярэжнай (Н. Гальпяровіч).

5) Патрывожаных мядзведзяў называюць шатунамі (А. Курскоў).

***А19. Адзначце безасабовыя сказы.***

1) Хораша па´рыла зямля (А. Рыбак).

2) Гарачы летні дзень (Я. Сіпакоў).

3) Грыбы лепш за ўсё збіраць зранку (з календара “Родная прырода”).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4) Няма над возерам ні ластавак, ні чаек… (В. Вольскі).

5) Подступы да Браслава лёгка было абараняць ( В. Вольскі).

***А20. Адзначце сказы, у якіх інфінітыў выконвае функцыю дзейніка.***

1) Уявіць без гэтага імя [Ефрасінні Полацкай] не толькі панараму духоўнага жыцця на ўсходнеславянскіх землях, але і ўсю гісторыю беларускай культуры немагчыма (У. Арлоў).

2) У незнаёмым лесе, захапіўшыся, вельмі лёгка заблудзіцца (з календара “Родны край”).

3) Бачыць сябе дапытлівым, чыстым, вясёлым – гэта адчуванне незвычайнае (Я. Брыль).

4) Шчасце – нідзе не спыняцца ў дарозе (С. Грахоўскі).

5) Запісваць [на магнітафон] сваё гранне [на жалейцы] жанчына нікому не дазваляла (А. Савіцкі).

***А21. Адзначце сказы, у якіх інфінітыў выконвае функцыю выказніка (уваходзіць у склад выказніка).***

1) У школу трэба было хадзіць аж за дзевяць кіламетраў (М. Даніленка).

2) Спускацца ў роў было нязручна і страшна (А. Асіпенка).

3) Цяжка было вызначаць лепшага спевака (Я. Колас).

4) Сын Лукаша Скарыны хацеў вучыцца далей (У. Арлоў).

5) Сябрукоў голас прымусіў Пецю схамянуцца (М. Зарэмба).

***А22. Адзначце сказы, у якіх інфінітыў выконвае функцыю дапаўнення.***

1) Глухі шорах прымусіў дзеда [Талаша] прыслухацца і разгледзецца (Я. Колас).

2) І дзед Талаш не адважваецца тады ад’язджаць на сваім чоўне на сярэдзіну Прыпяці (Я. Колас).

3) Вецер скуголіў, раз’юшана завываў, пагражаў падчапіць гняздо і скінуць яго разам з птушкай (А. Пальчэўскі).

4) Аднавяскоўцы не даюць крыніцы зарасці травой (В. Шымук).

5) Мы глыбокаю ноччу зімовай і засушлівым ліпеньскім днём ратаваць чалавека гатовы, рызыкуючы ўласным жыццём (Э. Агняцвет).

***А23. Адзначце сказы, у якіх інфінітыў выконвае функцыю азначэння.***

1) Шчасце было слухаць гэты шматгалосы гімн непераможнаму жыццю (Я. Крамко).

2) Важная задача мастацкага твора – актывізаваць у кожным чалавеку паток псіхічнай энергіі (В. Альшэўскі).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) Да Анюты вярталася пакрысе здольнасць думаць (П. Місько).

4) Гэта свята душы – сады садзіць (У. Рубанаў).

5) Быў калісьці на зямлі паганы звычай – не карміць старых бацькоў (У. Караткевіч).

***А24. Адзначце сказы, у якіх інфінітыў выконвае функцыю акалічнасці.***

1) Я прывучаў малых быць на марозе, дыхаць чыстым марозным паветрам (В. Сухамлінскі).

2) Раніцай мы ішлі ў школьную цяпліцу сустракаць усход сонца (В. Сухамлінскі).

3) Што прымушае пярнатых качэўнікаў пакідаць месца гняздоўяў? (Я. Суханаў).

4) Восень вецце сухое зграбла і на ўзлессі падпаліла пагрэцца начлежны касцёр (М. Танк).

5) Скарына яшчэ ў Кракаве загарэўся ідэяй паставіць геніяльнае вынаходніцтва Гутэнберга на службу свайму народу (Н. Гілевіч).

***А25. Адзначце неразвітыя сказы.***

1) Дзядзька аказаўся гаваркі (К. Цвірка).

2) Цёплая і цёмная ноч (М. Гарэцкі).

3) Ручай быў чысты, гаманлівы і вясёлы (В. Хліманаў).

4) Сонца яшчэ не зайшло (Я. Колас).

5) А сонца ўжо над лесам (Я. Крамко).

## *Частка В*

***В1. Устанавіце адпаведнасць паміж падкрэсленым словам і яго сінтаксічнай функцыяй.***

| | |
|---|---|
| А: Гравюры *Скарыны* імкнуліся пераймаць нямецкія і чэшскія выдаўцы (У. Свяжынскі). | 1. Дзейнік. |
| Б: Лес аж звінеў *ад* птушыных *галасоў* (К. Чорны). | 2. Выказнік. |
| В: Караніся ж, вечнае *дрэва славянства*, пі шчодрыя сокі роднай зямлі, цягніся ў высокія нябёсы! (С. Законнікаў). | 3. Дапаўненне. |
| Г: *Лагчына* апаясана вузкай паласою верасу з брусцічнікам (З. Бяспалы). | 4. Азначэнне. |
| Д: Я іду *лёгкі, акрылены* (Я. Скрыган). | 5. Акалічнасць. |
| Е: *Сонца* ў той дзень не было (К. Чорны). | 6. Не член сказа. |

***В2. Устанавіце адпаведнасць паміж выказнікам прапанаванага сказа і яго характарыстыкай.***

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| | |
|---|---|
| А: Добра іншы раз без клопату і хвалявання паваляцца ў цяньку, падыхаць чыстым паветрам, насычаным пахамі поля, лесу, лугавіны (І. Навуменка). | 1. Просты дзеяслоўны. |
| Б: З нейкага часу сасна перастала расці (І. Навуменка). | 2. Састаўны дзеяслоўны. |
| В: Немалаважнае значэнне ў харчаванні беларусаў мелі напіткі (В. Цітоў). | 3. Састаўны іменны. |
| Г: Трэлі ліліся звонкія, адборныя, густыя (К. Кірэенка). | |
| Д: Давай удвух сустрэнем ранне сярод туманнай сівізны (П. Панчанка). | |

***В3. Устанавіце адпаведнасць паміж сказам і яго тыпам.***

| | |
|---|---|
| А: На дрэвах пасярод поля па адной, па тры, па пяць пчаліных калод на кожным (У. Караткевіч). | 1. Назыўны. |
| Б: Паблізу вялікага лесу няма ніякай ракі (Б. Сачанка). | 2. Пэўна-асабовы. |
| В: Спачатку лес высякалі на будоўлю хат і хлявоў, а потым і на шпалы, на дровы для заводскіх печаў і паравозных топак (Б. Сачанка). | 3. Няпэўна-асабовы |
| Г: Успамінаем далёкае, да болю шчымлівае маленства і такімі маладымі і светлымі бачым аблічча родных і блізкіх, настаўнікаў і сяброў (С. Грахоўскі). | 4. Безасабовы. |
| Д: Ціхі вечар (М. Гарэцкі). | 5. Двухсастаўны. |

***В4. Устанавіце адпаведнасць паміж інфінітывам і яго сінтаксічнай функцыяй.***

| | |
|---|---|
| А: Цікавы занятак – вудзіць рыбу зімовым марозным днём на скаванай лёдам рацэ (з газеты “Звязда”). | 1. Дзейнік. |
| Б: Памяць дазваляе яму [Гусоўскаму] пісаць без пёраў і паперы (У. Арлоў). | 2. Выказнік. |
| В: Сяляне збіраліся пакінуць Беларусь і ехаць у Сібір або ў Амерыку ці Канаду (І. Дуброўскі). | 3. Дапаўненне. |
| Г: Гэты малады і свабодалюбівы чалавек паставіў перад сабой мэту дабіцца самастойнасці (У. Караткевіч). | 4. Азначэнне. |
| Д: Мы ехалі адпачыць на ўлонні, пабавіць час (М. Ермаловіч). | 5. Акалічнасць. |

***В5. Зрабіце поўны сінтаксічны разбор наступнага сказа.***

Суцэльныя дываны з густога разнатраўя і мноства кветак усіх колераў вясёлкі ўсцілаюць жыватворную зямлю (з часопіса “Родная прырода”).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ПУНКТУАЦЫЯ ПРОСТАГА СКАЗА

## Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам

***Практыкаванне 21. Прачытайце сказы. Патлумачце наяўнасць або адсутнасць працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам.***

I. 1) Паэзія – гэта жыватворнае святло, якое дапамагае расці не толькі вершам, але і кветкам (В. Матэвушаў). 2) На полі працаваць – ураджай здабываць (прыказка). 3) Важная задача мастацкага твора – актывізаваць у кожным чалавеку паток псіхічнай энергіі (В. Альшэўскі). 4) Слова – меч. Абтачыць яго – асалода (Ю. Тынянаў). 5) Вясна – час работы, а не гутарак (І. Шамякін). 6) Пушча мне дом родны (А. Астрэйка). 7) Добры каваль дзядзька Кандрат (І. Шамякін). 8) Воблакі нібы залачоныя чаўны (З. Бядуля). 9) Беларусь, я твой воін адданы і сын… (П. Панчанка). 10) Возера – рукою падаць (Я. Скрыган). 11) Бурбалкі са дна возера – бульбуль-буль! (Я. Брыль). 12) Адлегласць паміж паўдзённай і паўночнай межамі пушчы – шэсцьдзясят пяць кіламетраў (В. Вітка). 13) Голас у чалавека глухі, сціплы (К. Чорны). 14) Сын Пятровіча цяпер трактарыст. 15) Падарожжы і сустрэчы з цікавымі людзьмі, бясспрэчна, выдатная крыніца для самаадукацыі. 16) Рак не рыба, кажан не птушка (Прыказка). 17) Цемра – хоць вока выкалі. 18) А найважнейшая тут мэта – звярнуць з дарогі і да цёткі зайсці на час які кароткі (Я. Колас). 19) Кожны з герояў – непаўторная чалавечая індывідуальнасць (І. Навуменка). 20) Верасень – месяц святла, празрыстасці, асмужаных аксамітных даляў (С. Лобач).

II. 1) Апошняе каханне – спакуслівы падман перад сівой зімою, перад глухім расстаннем (Н. Гальпяровіч). 2) Вяселле – гэта сямейнае свята з комплексам рытуалаў, звязаных з заключэннем шлюбу. 3) Жывапіс – адзін з распаўсюджаных відаў выяўленчага мастацтва. 4) Я чалавек паднявольны. 5) Яблыні – вачэй не адвесці. 6) Ігнараваць мову – значыць ігнараваць народ, нацыю (П. Пестрак). 7) Мець мэту ў жыцці – вялікае шчасце для чалавека. 8) Твая задача – сачыць за ходам доследу. 9) Жыццё пражыць – не поле перайсці (прыказка). 10) Старасць не радасць (прыказка). 11) Хлапец адразу – шусь за дзверы. 12) Катацца на лыжах – адно задавальненне. 13) Якуб Колас, як вядома, сын лесніка. 14) Здаць экзамен – яшчэ не значыць паступіць. 15) Мой намеснік вы. 16) Черёмхавая бель як цёплы снег. 17) Мой лес, мой бор, ты мой сапраўдны родны дом. 18) Пагутарыць з разумным чалавекам – радасць. 19) Сястра мая не медсястра, а ўрач. 20) Выдатны настаўнік мая сястра Алена.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Практыкаванне 22. Спішыце. Падкрэсліце дзейнік і выказнік. Пастаўце, дзе трэба працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам.***

I. 1) Наднёман дзіўная, гожая мясціна на ўскраі Нёмана (К. Камейша). 2) Падслухоўваць чужыя таямніцы справа, не вартая шляхціца (В. Суліма-Савіч-Заблоцкі). 3) Без навукі, братка, чалавек што тое сляпое кацяня (Я. Колас). 4) У хаце хоць шаром пакаці. 5) Косцік, відаць, добры хлопец (М. Паслядовіч). 6) Языком малоць не дровы калоць (Прыказка). 7) Нівы вокам не абняць (А. Русецкі). 8) Уладзік зараз шмыг у дзверы! (Я. Колас). 9) Сам сабе чалавек не вораг (К. Чорны). 10) Сашыны вочы нібыта вугалькі (П. Пестрак). 11) Цікавы субяседнік Васіль Пракопавіч! (Я. Скрыган). 12) Воднае пола, або ватэрпол, алімпійскі від спорту. 13) На полі працаваць ураджай здабываць (Прыказка). 14) Твая галоўная задача, Васіль, не пускаць у лес без панскага дазволу розных сваволькікаў (І. Дуброўскі). 15) Пятнаццаць вёрст шлях немалы… (М. Матукоўскі). 16) Хіба ж не важная прычына адсвяткаваць сярод людзей працоўны поспех, імяніны, узнагароду, юбілей? (А. Бачыла). 17) Нацыя, нацыянальнае не капрыз прыроды, а дадзенасць, што склалася вякамі… (Р. Барадулін). 18) На Беларусі снежань толькі пачатак снежнае зімы (“Звязда”). 19) Лёс чалавека як даўні курган (Н. Мацяш). 20) Плошча Нарачы восемдзесят квадратных кіламетраў. Найбольшая глыбіня пяцьдзясят метраў (В. Вітка).

II. 1) Розум не кулеш, у галаву не ўвальеш (прыказка). 2) Вясеннія воды самыя раннія, цені змяркання самыя познія. 3) Найвышэйшы абавязак бацькоў узгадаваць і выхаваць дзяцей. 4) Я хоп за павады! (Я. Колас). 5) Талент мастака загадка нават для самога мастака. 6) Найлепшы доктар чалавеку час. 7) Летняя ночка прыемная, цёплая, спакойная і жаданая. 8) Пабудаваць свой дом важная справа. 9) Конь спужаўся, а я скок на яго (Я. Колас). 10) Чалавек, абыякавы да роднай мовы, дзікун. 11) Сапраўдная варажбітка гэтая невялічкая птушка зязюлька. 12) Парада не здрада: часам і разумнага трэба перасцерагчы. 13) Араць не ў дуду іграць (прыказка). 14) Праўда гэта значыць перамога сумлення ў чалавеку. 15) Шчасце ёсць задавальненне без пакаяння. 16) Дзетак узгадаваць не грыбкоў назбіраць (прыказка). 17) А куля дзык! А другая ў руку (Я. Брыль). 18) Жыццё не тыя дні, што прайшлі, а тыя, што запомніліся. 19) Час поўнага абароту Зямлі вакол сваёй восі дваццаць чатыры гадзіны. 20) Белавежская пушча, створаная прыродай, бясцэнны падарунак людзям.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Аднародныя члены сказа

***Практыкаванне 23. Прачытайце сказы. Падкрэсліце аднародныя члены сказа. Патлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.***

I. 1) Пастушок між тым азірнуў з дарогі свой невялічкі статак,ляснуў у паветры пугай і, падышоўшы бліжэй, моўчкі сеў на ўскрайку дарогі (В. Быкаў). 2) Ёсць на карце нашай Радзімы нямала такіх гарадоў, непаўторны каларыт якіх увабраў у сябе таямнічую экзотыку даўніны, і мяцежны подых бітваў, і галавакружны поступ пераўтварэнняў (У. Малішэўскі). 3) Пры Усяславе [Чарадзею] высокага росквіту дасягнулі мастацтва, адукацыя, дойлідства (К. Тарасаў). 4) Часам [ручай] знікаў з поля зроку, хаваўся то ў траве, то ў хмызняку (В. Хліманаў). 5) Мноства разоў жыхары яе [буслянкі] абмахваюць бела-чорнымі крыламі зялёна-залацісты гуд, то асядаючы на гняздо, то зноў узлятаючы (Я. Брыль). 6) Усе птушкі наваколля часта прыляталі да крынічкі палячыцца ад сваіх хвароб або адпачыць у цяньку ці пакупацца ў ручаі (В. Хліманаў). 7) Надзвычай роўныя і высокія сосны-прыгажуні гойдаліся ад ветру, рыпелі і аднастайна і ласкава шумелі сваімі верхавінамі (І. Шамякін). 8) Горад шумеў як дзень, так і ноч тысячамі галасоў (Я. Колас). 9) Успамінаю сасновае бярвенне і смех хоць стомленых, але вясёлых лесарубаў (Я. Брыль). 10) У дзяўчыны голас быў невысокі, ды прыгожы (Э. Самуйлёнак). 11) Асноўным прадметам як жаночага, так і мужчынскага касцюма была тунікападобная кашуля (Л. Дучыц). 12) З любові да бацькоўскага парога, да матчынай песні, з вывучэння гісторыі народа, спасціжэння яго традыцый пачынаецца любоў да роднай старонкі, да Радзімы (А. Белакоз). 13) Бушуе над абшарамі сцюдзёны вецер, змятае пад прызбы пажоўклае лісце, гайдае мокрае галлё ў садку (В. Быкаў). 14) Сонца даўно ўжо звярнула з поўдня, але свяціла яшчэ горача (Я. Колас). 15) Пашыраюцца гарады, рамёствы, гандаль (С. Тарасаў). 16) Разнастайныя па форме, па велічыні сняжынкі ляцелі, кружыліся перад машынай, віхрыліся збоку (І. Шамякін). 17) Над усім ляжыць сіняваты слой смугі, не то дыму, не то туману (Я. Колас). 18) Пад гоман радаводнага дрэва думаеш пра вечнасць, пранікаешся гістарычным аптымізмам, верай у будучыню (С. Александровіч). 19) Геніяльнасць Адама Міцкевіча ў спалучэнні з любоўю да народа, з яго палымяным патрыятызмам і рэвалюцыйнасцю, гнеўнай нянавісцю да гвалту не толькі абуджала эстэтычныя пачуцці, але брала чытача за сэрца, прышчапляла яму высокія агуль-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

началавечыя ідэалы, была і застаецца ўцехай для народа ў шчасці і горы, прароцтвам будучыні (Р. Шырма). 20) Сапегам належалі палацы не толькі ў Ружанах, але і ў Дзятлаве, Дзярэчыне і іншых мясцінах Беларусі (В. Супрун).

II. 1) Мне ў той дзень падабалася ўсё: і цнатліва-чыстыя кветкі, і вясновы сонечны дзень, і вясёлыя, узбуджаныя твары людзей (Х. Лялько). 2) Раніцай і трава каля платоў, і палі, і стрэхі – усё было па-зімоваму белае (І. Мележ). 3) Усюды клубіліся, як лёгкія белапенныя воблакі, кусты квітнеючай чаромхі: па зялёных касагорах, над шырокай ракой, над азёрамі і сажалкамі (А. Зінькевіч). 4) І ў полі, і ў вёсках, і на чыгуначнай станцыі – усюды было людна (А. Зінькевіч). 5) Галінка вярбы і гудзенне чмяля, пяшчотная песня зябліка і глушцовыя світанкі, вогненна-чырвоны кляновы ліст і карычневы капялюшык баравіка – гэтыя прывабныя рысы лесу напаўняюць яго паэтычным зместам (В. Алешка). 6) Сёння Колька быў зусім другім чалавекам: далікатным, мяккім, чулым, як і яго маці (С. Грахоўскі). 7) Ад сівой мінуўшчыны засталіся скупыя летапісныя радкі, курганы-валатоўкі ды рэшткі колішніх збудаванняў: руіны замка ў Навагрудку, руіны замка ў Лідзе, руіны замка ў Крэве, што ў Смаргонскім раёне Гродзенскай вобласці (У. Ягоўдзік). 8) З дубу гнулі абады, палазы, рабілі бочкі, кадушкі, дзежкі – адным словам, усё, што павінна доўга служыць чалавеку (Я. Пархута). 9) І ўсюды: на Палессі, у Прыдняпроўі, у Панямонні – народнае адзенне складаецца ў асноўным з белага і чырвонага колеру (М. Раманюк). 10) На прыгуменні, поруч з садам, павець з гумном стаяла радам, а пад паветкаю прылады: вазок, калёсы, панарады, старыя сані, восі, колы і вулляў некалькі на пчолы (Я. Колас). 11) Самаадданая барацьба беларускіх падпольшчыкаў і партызан супраць фашысцкіх захопнікаў увабрала ў сябе ўсё: і самаахвярнасць продкаў, і партызанскі спрыт прадзедаў, і гордую рашучасць рабочых (У. Карпаў). 12) Гнёзды ўсюды: на дуплах і на галінах дрэў, у хмызняках і на высокіх травяністых купінах, на амаль голай зямлі. (А. Курскоў). 13) Крыж выконваў ролю каўчэга для атрыманых ігуменняй з Канстанцінопаля і Ерусаліма хрысціянскіх святынь: кроплі крыві Ісуса Хрыста, часткі Крыжа Гасподняга, каменя ад труны Багародзіцы, часткі мошчаў святых Панцеляймона і Стэфана (У. Арлоў). 14) Пры Усяславе [Чарадзею] высокага росквіту дасягнулі мастацтва, адукацыя, дойлідства (С. Тарасаў). 15) Снегам заносіліся зацішныя вуліцы, перамяталіся дарогі, раўняліся глыбокія канавы



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(В. Адамчык). 16) Бацька вечна заняты: то ў абходзе, то высочвае для паноў глушцоў ці лася, то вязе ў замак князю рыбу або качак ці іншую дзічыну (С. Александровіч). 17) Праз словаўтварэнне, праз сінаніміку, праз гібкасць сінтаксісу, рухомасць фразеалогіі і многае іншае Купала змог найлепшым чынам паказаць жыццяздольнасць мовы свайго народа (Н. Гілевіч). 18) Самалёт, электрыка, трактар – словам, усе мары людзей выказаны ў казках (З. Бядуля). 19) І над усім: над ракой, над бязмежнымі калгаснымі палеткамі – зіхацела пасля дажджу яркімі фарбамі вясёлка (М. Кулакоўскі). 20) У лесе кожная мясцінка: лужок, палянка, баравінка – асобны твар і выраз мае (Я. Колас).

III. 1) Высока ў блакіце ў раскошнай ляноце плывуць, як кавалачкі ваты, невялікія рэдкія аблачынкі (Я. Брыль). 2) Толькі з усходам сонца лёгкай, ледзь прыкметнай смугой спавіваюцца дальнія сасьнякі і пясчаныя шэра-жоўтыя ўзгоркі (І. Навуменка). 3) Пакрысе негустая летняя цемната рабілася прыцемкам, рэдзенькім, светлым (А. Жук). 4) Над вадою цягнулася да сонца прыгожая сакаўная зяляніна (Я. Колас). 5) Над паплавамі слаўся шэры, настоены на водары атавы і спелага жыта туман (А. Асіпенка). 6) Перад хмарай хутка імчаліся ў бледным, задымленым, бязрадасным небе круглыя цёмныя воблачкі (Э. Самуйлёнак). 7) Ціхая, вельмі цёплая ноч спусцілася на лес (з часопіса “Бярозка”). 8) Па празрыстым, вымытым пасля навальніцы небе плылі сінія-сінія воблачкі (В. Каваль). 9) Віцька моршчыў усыпаны залацiста-карычневымі вяснушкамі кірпаты нос (У. Караткевіч). 10) Працяглы звонкі дзіцячы крык запоўніў раптоўна жудасную цішыню (Э. Самуйлёнак). 11) Цяжкае, халоднае, свінцовае неба, здавалася, назаўсёды ўпала на зямлю (Я. Сіпакоў). 12) Прыкінуўся халодны, глухі страх (В. Коўтун). 13) У вячэрнюю птушыную размову ўключыўся дзяркач (К. Кірэенка). 14) Надрэчныя лозы выпускалі першыя, салатнага колеру лісточкі (Я. Крамко). 15) Густы цёмна-зялёны ячмень з сінім налётам фанабэрыста распускае пушыстыя вусы (П. Броўка). 16) Памяць уваскрашала цяжкія, самыя першыя пасляваенныя гады вясковага жыцця (Я. Галубовіч). 17) Спакой, халодны, амярцвелы, паклаў на ўсё сваю пячаць (Я. Колас). 18) Хвалююць, радуюць сустрэчы з новымі талентамі, новымі, праўдзівымі, глыбокімі, сэрцам напісанымі кнігамі (Я. Брыль). 19) Чырвоныя, сінія, жоўтыя кветкі стракацелі на лузе (У. Краўчанка). 20) Насталі кароткія туманныя асеннія дні (А. Астрэйка).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

***Практыкаванне 24. Прачытайце сказы. Падкрэсліце аднародныя члены сказа. Пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку.***

I. 1) А вецер мацнее ўздзірае снег знізу падымае яго ўгору круціць слупамі, і белы віхор снежнага пылу далёка імчыцца па полі (Я. Колас). 2) На вуліцы ў дварах каля будынкаў і ўздоўж платоў ляжалі гурбы снегу (Я. Колас). 3) Яны [вадзяныя струмені] віхурыліся пеніліся то бурнымі хвалямі падалі на зямлю то рассыпаліся пылам, зззяючы вясёлкавымі пералівамі ў бляску маланак (Т. Хадкевіч). 4) Светлая хмарка, як ціхая думка шчасця, ціха і спакойна плыла ў небе і зараз жа хавалася ад людзей за высокімі каменнымі дамамі (Я. Колас). 5) Гарачае сонца прыветна пазірала на горад і роўна грэла і аблівала сваім цяплом і святлом гэтых неспакойных людзей (Я. Колас). 6) Шэры заяц кудысьці бег а перад самай бярозкай ён раптам спыніўся стаў слупком павадзіў доўгімі вушамі (Р. Ігнаценка). 7) Дождж разахвоціўся і дробна і густа ліў да самага вечара (К. Кірэенка). 8) Ляжыць мой край на Дзвіне і Дняпры на Бугу і Нёмане на Прыпяці і Бярэзіне (Я. Колас). 9) Лес і рэчку і клёкат бусловы чалавечую ўсмешку ўраз можна знішчыць адным толькі словам, што бяздумна вырвецца з нас (В. Вітка). 10) Зіхціць праменіць адлівае са сцен і гнейс і граніт і медзь і нікель і крышталь… (А. Вялюгін). 11) У гэтай грознай паставе ваўка ён [Валошка] убачыў не толькі гатоўнасць кінуцца на чалавека але і такую ж гатоўнасць бегчы ад яго (В. Карамазаў). 12) Крочыла ноч па балотнай пустэчы па лазняку і ракітніку па сыпучым пяску дзюнаў… (Л. Дайнека). 13) Востра пахла гаркаватай лазой талым снегам вільготным халадком (М. Лынькоў). 14) Вецер не скалыхне ні адзін лісцік ні адну травінку (Я. Колас). 15) А бярозы асіны і дубы чырванеюць здалёк сваім лісцем і напамінаюць сабою аб восені (Я. Колас). 16) Пчолы гудзяць завіхаюцца пералятаюць з кветкі на кветку затым адна за адной павольна адлятаюць ад ліп (Я. Крамко). 17) Неба тым часам зусім пацямнела завалаклося цяжкімі і змрочнымі хмарамі (з часопіса “Родная прырода”). 18) Дрэвы і кветкі садзяць у час урачыстасцей пры нараджэнні чалавека у дні вяселляў у знак дружбы (К. Кірэенка). 19) Выпаў першы снег. Белай коўдрай улёгся ён на палеткі лугі рэкі і азёры апушыў стрэхі выбеліў вуліцы і пагоркі павіс бабаўнянымі камякамі на голлі дрэў на парканах і кустах (М. Машара). 20) Саша пайшоў па дарозе да райцэнтра а адтуль адправіўся ў шлях па чыгунцы (І. Шамякін).

II. 1) Усюды клубіліся, як лёгкія белапенныя воблакі, кусты квітнеючай чаромхі па зялёных касагорах над шырокай ракой над



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

азёрамі і сажалкамі (А. Зінькевіч). 2) І ў полі і ў вёсках і на чыгуначнай станцыі усюды было людна (А. Зінькевіч). 3) Калісьці каля нашай вёскі спыніліся салдаты. Вучыліся ваяваць стралялі акопы капалі наступалі (В. Хомчанка). 4) Зялёны і блакітны жоўты і аранжавы сіні і пунсовы усе колеры ўвабраў у сябе гэты паэтычны месяц [май], радасная пара абнаўлення (А. Курскоў). 5) Доўгі рад старых і высокіх дрэў ліп дубоў бяроз явараў і вязаў ішоў ад паўстанка проста ў чыстае поле (К. Чорны). 6) А бараніцца нашым продкам даводзілася ад крыжацкай навалы і ад татарскіх набегаў і ад маскоўскай няволі (У. Ягоўдзік). 7) І самавітая ўязная брама, нібыта ўрослая ў зямлю, і высокія вежы, што імкнуцца ў неба, і велічныя залы, дзе міжволі спыняешся са сцішаным сэрцам, усё тут дыхае жывой мінуўшчынай і прымушае задумацца пра будучыню Радзімы (У. Ягоўдзік). 8) Лёгкасць стромкасць гатычная зграбнасць робяць [Камянецкую] вежу асабліва велічнай і вабнай (А. Бутэвіч). 9) Невыпадкова з імем гэтага бога [Рода] звязана ў нашай мове столькі найважнейшых слоў і паняццяў народ радзіма родзіч продак радавод нараджэнне прырода ўраджай адраджэнне (У. Арлоў). 10) Бацька вечна заняты то ў абходзе то высочвае для паноў глушцоў ці лася то вязе ў замак князю рыбу або качак ці іншую дзічыну (С. Александровіч). 11) На лясных прасеках, на ўзлесках і палянах у шэрым ранішнім змроку збіраюцца чародамі цецерукі (А. Курскоў). 12) У рацыён іх [зуброў] летам уваходзіць да чатырохсот розных раслін лісце парасткі дрэў і кустоў розныя травы імхі і лішайнікі жалуды і нават грыбы(А. Курскоў). 13) У гурбах дзеці знаходзілі і казачныя церамы на вяршынях непрыступных гор і застылыя марскія хвалі і белага лебедзя і шэрага воўка і хітрую лісу (В. Сухамлінскі). 14) Пры самай сядзібе раслі меданосныя акацыі слівы вішні кусты парэчак і агрэсту (У. Содаль). 15) Горад жыве бурлівым жыццём працуе ладзіць фестывалі конкурсы спектаклі (з часопіса “Роднае слова”). 16) Раніцай і трава каля платоў і палі і стрэхі усё было па-зімоваму белае (І. Мележ). 17) Матылёк як бы дражніў малога то высока ўзвіваўся ўгору нібы іскра з вогнішча то раптам садзіўся на якую-небудзь кветку (Л. Дайнека). 18) Гэты час і гэты свет і квятлівы водар гэты усё ацэньвае паэт, як вясновыя прыкметы (А. Куляшоў). 19) Сонца вецер бязмежныя прасторы адным словам усё радавала вочы (Х. Шынклер). 20) Хутка ўсё неба і дарога і чэзлыя балотныя хмызнякі патанула ў снежнай завірусе (Я. Колас).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

III. 1) Шчакаціхін на белым старажытным замчышчы знайшоў масіўную прысадзістую чатырохвугольную камяніцу (А. Ліс). 2) Падарыла восень людзям яшчэ некалькі ясных светлых і цёплых дзён (Я. Колас). 3) Паўднёвы бераг затокі поўніцца жывым сасновым шумам (Я. Брыль). 4) Перад хмарай хутка імчаліся ў бледным задымленым бязрадасным небе круглыя цёмныя воблачкі (Э. Самуйлёнак). 5) Другі раз у жыцці я пачуў дзівосную народную мелодыю жалейкі ў адным з шырокіх падземных мінскіх пераходаў у канцы восені (А. Савіцкі). 6) Нізкія чорныя хмары паўзлі нам насустрач (У. Караткевіч). 7) Навокал на многіх дзесяцінах шумеў і хваляваўся пад асеннім дажджом закінуты глухі чорны ад старасці і вільгаці парк (У. Караткевіч). 8) Дзікі нялюдскай сілы крык прагучаў аднекуль знадворку – здавалася, што гэта крычыць і рыдае не чалавек а дэман (У. Караткевіч). 9) Рыгор сядзеў нерухома, вялікія шурпатыя рукі яго ляжалі на каленях (У. Караткевіч). 10) І адразу пачуўся ўпэўнены уладарны пошчак конскіх капытоў каля сходаў (У. Караткевіч). 11) Месцамі ўзнімаўся белаваты туман нерухома завісаў над маладымі асокамі цёмнымі абрысамі разложыстых купчастых лазнякоў (Я. Колас). 12) Доўгімі зялёнымі шнурамі выцягнулася бульба (П. Броўка). 13) Соф’я спала ў прыгожай выразанай з моранага дубу калысцы-гушкалцы. Цёмныя пушыстыя вейкі малой слаба ўздрыгвалі трапяталіся (Л. Дайнека). 14) Высока ў сінім бязвоблачным небе плыве яркае сонца шчодра лье на зямлю сваю цеплыню і святло (І. Навуменка). 15) Шарсцяныя баваўняныя ільняныя тканіны карыстаюцца вялікім попытам у нашых пакупнікоў (з газеты “Звязда”). 16) У канцы ліпеня роўны акуратны глыбокі канал ляжаў паміж Гнілым балотам і рэчкаю (Я. Колас). 17) Угары віднелася шэрае з сінімі прагаламі неба (І. Мележ). 18) Зноў над роднай зямлёй вее водарам хмельным вясновым (Н. Гілевіч). 19) Па празрыстым вымытым пасля навальніцы небе плылі сінія-сінія воблачкі (В. Каваль). 20) Збудаваны з цэглы дзесяціпавярховы дом добра праглядваўся з усіх бакоў (М. Ваданосаў).

## Адасобленыя азначэнні. Адасобленыя прыдаткі

***Практыкаванне 25. Прачытайце сказы. Падкрэсліце адасобленыя члены сказа. Патлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.***

І. 1) Мядзведзь, мокры і брудны, вылез на бераг (М. Звераў). 2) Высокі, з шырокімі плячыма і вялікай белай барадой, ён, здаецца,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ніколі не злаваў, не крычаў, а толькі жартаваў (Я. Маўр). 3) Гаспадар высокі, сухі, з вострай бародкай, гадоў пад сорак (Я. Маўр). 4) Некалі магутны, пакорна аддаўся дуб на волю вады (Я. Колас). 5) У нізіне быў зялёны змрок, пранізаны туманна-залацістым водсветам заранкі (У. Караткевіч). 6) На залітай сонцам маладой сасонцы прыхарошвалася вавёрка (І. Мяжэвіч). 7) Вецер гнаў з сасновага бору гарачы водар смалы, змешанай з хмельным пахам спелай збажыны, і разносіў яго па ваколіцы (І. Шамякін). 8) А над жытам шумелі меднастволыя сосны, і, поўныя хараства, разам з жытнёвым морам яны стваралі чароўны пейзаж (І. Шамякін). 9) Толькі што закончыўся дождж. Цёплы і нядоўгі, ён густа сыпануў з невялічкай хмаркі, абмыў вуліцы, прашумеў агародамі, добра асвяжыў бліжэйшы лес (А. Казаннікаў). 10) Знясіленыя ранамі, голадам і смагай, героі Брэсцкай крэпасці змагаліся да апошняга дыхання (В. Вольскі). 11) Цёмна-залацістыя валасы, прыўзнятыя над прыгожым ілбом і пакрытыя белай хусткай, завязанай на патыліцы, надавалі твару нешта высакароднае (П. Пестрак). 12) Далёка за далінай снегавымі разводамі сінеў усё той жа высачэзны Мядзвежы хрыбет. <…> Не заслонены цяпер нічым, ён, бадай, як і ўчора, застаўся далёкім, аграмаднацізхоткім і недаступным (В. Быкаў). 13) Вуліца вырасла за адзін год са ссяленых хутароў, дальніх і бліжніх (І. Навуменка). 14) Пацягнутае рэдкім туманам, млява пагойдваецца возера (М. Лужанін). 15) Пасінелы ад ветру і марозу ліпень зусім быў не падобны на летні месяц (Я. Сіпакоў). 16) У заходніх раёнах Гродзеншчыны і па паўночным усходзе Польшчы жылі яцвягі, па мове больш блізкія да тагачаснага насельніцтва Прусіі (Э. Зайкоўскі). 17) Нейкія галасы, зямныя і нябесныя, чуліся князю (У. Дайнека). 18) Увесь такі наструнены, па-сяяточнаму светлы і ясны, ён [бор], здавалася, ажно трымцеў кожнай сваёй гонкай вяршыняй ад жадання як найхутчэй адкрыць перада мною сваю чароўную гасціннасць (К. Кірыенка). 19) Звычайна маўклівы, Васіль гаварыў амаль бесперапынна (І. Шамякін). 20) У вядзёрку, запраўленая перцам і лаўровым лістом, стаяла юшка (М. Паслядовіч).

II. 1) А калі на полацкі сталец сеў Рагвалод, незалежны ні ад Кіева, ні ад Ноўгарада, пачало існаваць Полацкае княства, першая беларуская дзяржава (Н. Гальпяровіч). 2) Якое ж прыгожае возера Свіцязь! Многіх таленавітых людзей натхніла яно на творчасць і ў першую чаргу нашага славутага земляка Адама Міцкевіча – генія сусветнай літаратуры (Я. Сіпакоў). 3) Як дальнабачны палітык, Усяслаў прадбачыў намеры



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

некаторых суседніх князёў завалодаць Полацкай зямлёй і не раз наносіў удар першым (Э. Зайкоўскі). 4) Залатая грыўня, знак княжацкага роду, блішчала на смуглай шыі [князя Вячкі] (Л. Дайнека). 5) Са старажытных часоў курганы былі месцам пахавання найбольш знакамітых нашых продкаў, людзей неардынарных ва ўсіх адносінах (Я. Крук). 6) І ніякая кніга не дасць вам таго, што на ўласныя вочы бачыў я, Андрэй Беларэцкі, чалавек дзевяноста шасці год (У. Караткевіч). 7) Дырэктар дома адпачынку Сяргей Антонавіч сустрэў Іларыка не вельмі прыхільна (А. Якімовіч). 8) Мясцовы майстар-ювелір Лазар Богша зрабіў для Ефрасінні крыж – неацэнны помнік старажытнабеларускага мастацтва (У. Арлоў). 9) Чалавек няўрымслівага характару, паэт і рамантык, Віталь Цвірка заўсёды знаходзіўся ў творчым пошуку (П. Карнач). 10) Я гляджу ўдалячынь і шукаю Выспу – легендарную краіну майго дзяцінства (Я. Скрыган). 11) Чалавек няўрымслівага характару, паэт і рамантык, Віталь Цвірка заўсёды ў творчым пошуку (П. Карнач). 12) Самай выдатнай фігурай Адраджэння быў Францыск Скарына, сын купца з Полацка (У. Караткевіч). 13) З іменем асветніцы Ефрасінні Полацкай звязана стварэнне полацкім майстрам Лазарам Богшам славутага крыжа – шэдэўра старажытнабеларускага ювелірнага мастацтва (У. Арлоў). 14) Весялун і спявака, кравец любіў песні (У. Краўчанка). 15) Творчасць Васіля Канстанцінавіча Цвіркі, народнага мастака Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі рэспублікі, – цэлая эпоха ў мастацкім жыцці Беларусі (П. Карнач). 16) Адмысловы рыбак, дзед вяртаўся з ракі заўсёды з рыбаю (Ф. Янкоўскі). 17) Нізенькі чарнявы лейтэнант, па прозвішчы Жук, праводзіў не раз батальён праз дрымучыя лясы і топкія балоты (Б. Сасноўскі). 18) Шыпшына, ці дзікая ружа, належыць да сямейства ружакветкавых (У. Корсун). 19) Праменні, стрэлы залатыя, макушы лесу прабіваюць (Я. Колас). 20) Сын лесніка, я сам з маленства любіў паліць касцёр, пасядзець ля вогнішча (І. Шамякін).

***Практыкаванне 26. Прачытайце сказы. Падкрэсліце адасобленыя члены сказа. Пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку.***

І. 1) На паляне ў светлым пералеску расцвілі налітыя расой сінія падснежныя пралескі пад аховай урачыстых хвой (П. Панчанка). 2) А вось і яна – наша сяліба. Сюды засмучаныя і ўзрадаваныя пакрыўджаныя і суцешаныя заўсёды вярталіся мае продкі (Я. Сіпакоў). 3. Веснавая цёплая ноч толькі што апранула зямлю і раскідала свае таемныя чары поўныя крыху смутнага хараства (Я. Колас). 4. Паглыбела



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

неба, вечарамі гэта асабліва было прыкметна. Цёмна-сіняе яно пачало адліваць нейкім зялёным адценнем (А. Чарнышэвіч). 5. Калі падманам захоплены ў палон ён [князь Усяслаў] сядзеў у зняволенні ў Кіеве, там адбылося паўстанне (Э. Зайкоўскі). 6. Быў шэры дзень ужо напоўнены подыхамі недалёкай зімы (П. Пестрак). 7. І раптам Люся спынілася здзіўленая і ўражаная. Перад ёй аднекуль з'явіўся дзівосны будынак падобны ці то на манастыр ці то на замак (А. Цяжкі). 8. Аднак гордасцю пушчы з'яўляецца зубр. З масіўным тулавам буйной барадатай галавой ён робіць унушальнае ўражанне… Непаваротлівы з выгляду зубр у хвіліны злосці надзвычай небяспечны для чалавека (В. Вольскі). 9. Тут жа выштурхнутая на бераг мноствам бурных прыбояў парахнее разбітая лодка, у адзіноце дажываючы свой век (Я. Брыль). 10. Амаль панішчаны размовай яе абнадзееным і такім нікчэмным вынікам Агееў выйшаў на вуліцу (В. Быкаў). 11) У верасні 1939 года Якуб Колас і Янка Купала ўдзельнічалі ва ўрачыстасцях у Беластоку прысвечаных уз'яднанню Беларусі (П. Броўка). 12)  З вяршыні гары відаць на даляглядзе цэлы ланцуг азёр малых і вялікіх доўгіх і круглых (В. Вольскі). 13) Паабапал дарогі высокай сцяной то пышна-зялёнай то сіняватай афарбоўкі стаяў лес шчодра заліты сонечным святлом (Т. Хадкевіч). 14) Перапоўнены радасцю вярнуўся я ў той дзень дадому, і, прызнаюся, яшчэ з тыдзень жыў ува мне настрой задавальнення (А. Кандрусевіч). 15) Золкія з лёгкімі замаразкамі ночы прыспешылі развітанне дрэў са сваім летнім уборам (В. Вольскі). 16) А хмары накіпалі нізкія чорныя дажджавыя (У. Караткевіч). 17) Здзіўлены я моўчкі стаяў ля бярозы (А. Кандрусевіч). 18) Навокал на многіх дзесяцінах шумеў і хваляваўся пад асеннім дажджом закінуты глухі чорны ад старасці і вільгаці парк (У. Караткевіч). 19) Стромкія сосны нібы ўслухоўваюцца і ўглядаюцца ў высокае неба. Насцярожаныя нечаканаю ласкаю баяцца падману (М. Стральцоў). 20) Праз некалькі гадоў на правым беразе ракі Ушы, акаймаваная з усіх бакоў шырокім ровам-возерам, паўстала магутная крэпасць (У. Ягоўдзік).

II. 1) Сын лесніка я сам з маленства любіў паліць касцёр пасядзець ля вогнішча (І. Шамякін). 2) Стары каваль па прозвішчу Дубовік гартаваў сякеру (П. Пестрак). 3) Зноў верасень запаслівы грыбнік шчыруе па імшыстых баравінах (А. Гурло). 4) Восень прала кужаль тонкі павуціння белы лён (Я. Колас). 5) Вось адзін з малюнкаў: Нептун марскі цар уручае Пятру Першаму трызубец знак уладарніцтва над морам



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(М. Корзун). 6) Сам педант у жыцці Гукан здзіўляўся, адкуль у гэтага вясковага хлопца такая звышакуратнасць (І. Шамякін). 7) Трыглы або марскія пеўні кукарэкаюць так гучна што хоць вушы затыкай (А. Матрунёнак). 8) Яшчэ праз паўгадзіны прыйшоў Юзік па мянушцы Гром (А. Чарнышэвіч). 9) Паўлюка Труса як сапраўднага нацыянальнага паэта-патрыёта не магла не хваляваць тэма Заходняй Беларусі (Р. Няхай). 10) Як не славіць песняй сакалінай Беларусь рэспубліку маю (А. Александровіч). 11) Як гуманіст і прыхільнік разняволення чалавека Будны крытыкаваў тыранію адмаўляў цэнзуру абураўся фактамі фізічнай расправы над іншадумцамі (С. Падокшын). 12) У гісторыі славянскай культуры ганаровае месца займае вядомы польскі пісьменнік Юзэф (Іосіф Іванавіч) Крашэўскі сын пружанскага харунжага з Гродзеншчыны (Г. Каханоўскі). 13) Сам шавец па прафесіі Арон любіў дасканалую і сумленную работу (Р. Мурашка). 14) Пералёт птушак або міграцыя шмат у чым загадкавая з'ява (Р. Ігнаценка). 15) Пяшчотная на выгляд малапрыкметная і далікатная кветачка расянка на справе аказваецца расліна-драпежнік (А. Крукоўскі). 16) Між лесу раскінулася возера Свіцязь адзін з найлепшых помнікаў прыроды (С. Александровіч). 17) Павівастая рачулка Уюнаўка, што па-лісінаму хітра крадзецца па альховых зараслях, абыходзіць вёску бокам (Б. Сачанка). 18) Да захворванняў выкліканых парушэннем у абмене бялкоў адносіцца сываратачная хвароба або крапіўніца (з газеты "Звязда"). 19) Спіць за барамі ў калысцы пясчанай сіняя Нарач дзіця акіяна (А. Вялюгін). 20) Дзяўчынка вярнулася дадому з Рыгорам вартаўніком Кульшы (У. Караткевіч).

***Практыкаванне 27. Падкрэсліце ў прапанаваных сказах прыдаткі. Патлумачце іх асобнае або дэфіснае напісанне.***

1) Для мяне родным краем стала невялікая вёска Біскупцы (Д. Бічэль-Загнетава). 2) Пад пагоркам бялела высокая фігура воіна-вызваліцеля (М. Вышынскі). 3) Тут у пачатку мінулага стагоддзя была сядзіба пісьменніка Ядвігіна Ш. (з часопіса "Родная прырода"). 4) Нават сам лес таемна шапацеў чуллівымі лісточкамі-струнамі (Я. Колас). 5) Гэта яблыня-дзічка нейкім цудам вырасла між сукаватых елак (І. Сіляўка). 6) З пачатку XVI стагоддзя Нясвіжам валодалі князі Радзівілы (У. Ягоўдзік). 7) Кожны стараўся жыць у згодзе з багіняю восеньскага ўраджаю Цёцяй (У. Арлоў). 8) Пастушок Васілька з самых малых дзён любіў іграць на жалейцы (З. Бядуля). 9) У выніку даследванняў вучоных-арнітолагаў нашы веды аб жыцці птушак становяцца ўсё больш поўнымі (Я. Суханаў).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

10) Пасля кароткага цёплага дажджу з першай навальніцай і громам зазелянелі бярозкі-прыгажуні (А. Курскоў). 11) На кожнай галінцы маладзенькай елкі віднеюцца ярка-жоўтыя кветкі-ліхтарыкі (А. Курскоў). 12) Паўднёвы ўсход краіны займалі радзімічы адносна невялікае плямяннное аб'яднанне (Э. Зайкоўскі). 13) Ахвярная праца Ефрасінні, як і яе сучаснікаў Кірылы Тураўскага і Клімента Смаляціча, сведчыць пра высокі культурны ўздым на зямлі нашых продкаў (У. Арлоў). 14) У гэтай [Спаса-Еўфрасіннеўскай] царкве захоўваўся ўнікальны па сваім мастацкім выкананні абкладзены тонкімі лістамі золата і серабра упрыгожаны каштоўнымі камянямі мініяцюрнымі малюнкамі і надпісамі крыж зроблены ў 1161 годзе мясцовым майстрам-ювелірам Лазарам Богшам (Т. Хадкевіч). 15) На фоне шырокай і светлай паласы ўсходу я заўважыў невыразныя яшчэ абрысы будана дзядзькі Ціхона (М. Паслядовіч). 16) Адзначыў сваё пяцісотгоддзе і дуб-велікан, што расце ў Шумілінскім раёне (Я. Сіпакоў). 17) На ўсходзе возера Нарач злучаецца вузкім прылівам з возерам Мястра (В. Вольскі). 18) Славутая паэма "Сцяг брыгады" з'явілася на фронце (П. Панчанка). 19) Ніколі не заплямілі гонару Айчыны воіны-палачане (В. Лукша). 20) Запрапасціўся недзе гэты неўгамонны свавольнік-вецер (Я. Скрыган).

## Адасобленыя дапаўненні. Адасобленыя акалічнасці. Адасобленыя ўдакладняльныя і далучальныя члены сказа

***Практыкаванне 28. Прачытайце сказы. Падкрэсліце адасобленыя члены сказа. Патлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.***

I. 1) Дняпро цячэ між высокіх берагоў спакойна і ўпэўнена, вымываючы з-пад адхонаў пясок, адкрываючы часам для вачэй чалавечых тое, што сам жа раней схаваў ад іх: наздраватыя вапнякі, чырвоныя з ліловым адценнем пліткі жалезняку і векавечныя, варажскіх часоў, дубы (У. Караткевіч). 2) Над гарамі ўспаўзла вялізная чорная хмара, засцілаючы бледна-цьмянае неба. Белыя маланкі, узразаючы цяжкую муць хмары, успыхвалі раз-пораз (Э. Самуйлёнак). 3) Магутны гук загрымеў у гарах, распадаючыся на асобныя грозныя акорды, сціхаючы і паўтараючыся (Э. Самуйлёнак). 4) Адны толькі дружныя шпакі, павыводзіўшы дзяцей, зляталіся ў велічэзныя гурты,ляталі над палямі, то збіваючыся ў густыя чорныя кучы, то рассыпаючыся ў паветры



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

празрыстымі сеткамі (Я. Колас). 5) Збіраліся на Вялікдзень самыя рухавыя, вясёлыя, няўрымслівыя аднавяскоўцы і, прыгожа спяваючы, разам з гарманістам хадзілі ад хаты да хаты (С. Давідовіч). 6) Раніцай ішоў па сцежцы стары лось і, убачыўшы наперадзе бярозку, якая перагарадзіла дарогу, спыніўся (Р. Ігнаценка). 7) Нягледзячы на добры ранішні настрой, Лемяшэвіча апанаваў неасэнсаваны смутак (І. Шамякін). 8) Дзякуючы цёплым дажджам, на палях і лугах усё зазелянела (Ц. Гартны). 9) Ці даўно быў падшыванцам, а цяпер вырас на лес гледзячы (М. Лынькоў). 10) Крушынскі гаварыў ціха і не пазіраючы на госця (З. Бядуля). 11) Ірына не проста чытала вершы, а, расхваляваўшыся, смакавала кожнае слова, кожны радок. 12) Конь хадзіў па абочыне дарогі і, нягледзячы на страляніну, спакойна шчыпаў траву (К. Чорны). 13) Ляціць над ляснымі далямі, лунае ў месячным святле, то заміраючы на ветры, то зноў ажываючы, хор высокіх дзявочых галасоў (М. Ракітны). 14) Роўна а шостай гадзіне Міша ступіў у кабінет і, нібы хвалячыся дакладнасцю, далажыў, што народ чакае (І. Мележ). 15) Самалёт, даляцеўшы да лесу, павярнуў назад і, зніжаючыся, пачаў набліжацца да возера (М. Гамолка). 16) Косця слухаў затаіўшы дыханне (Я. Зазека). 17) Часам алень спыняўся і, абдаўшы луг прагавітым ровам, крыху пастаяўшы, плыў далей (В. Карамазаў). 18) Лёгка і мягка слізгаюць палазы, пакідаючы за сабой па некранутай белі дзве раўнюткія паласы (М. Машара). 19) У жніўні, збіраючы грыбы, я сарваў адзін яблык (І. Сіляўка). 20) Давайце наведаемся ў Нясвіжскі палац, ацалелы да сённяшніх дзён, нягледзячы на шматлікія ваенныя віхуры (У. Ягоўдзік).

ІІ. 1) За выключэннем возера Рыца і азёр Швейцарыі, Свіцязь самае прыгожае ў Еўропе (Я. Сіпакоў). 2) Акрамя сейнера, у моры відаць было яшчэ два судны (У. Караткевіч). 3) Замест адказу, матчыны пальцы знаёмяцца з Міколкавым вухам (М. Лынькоў). 4) Замест знаёмай хаты з высокім комінам я ўбачыў папялішча. 5) Апроч святых канонаў, ён [Кірыл] някепска ведаў літаратуру, разбіраўся ў мастацтве (В. Быкаў). 6) Увесь дзень, уключаючы і перапынак на абед, не спынялася сяўба азімых (І. Шамякін). 7) Апрача аднастайнага шуму, у лесе нічога не чуваць (І. Мележ). 8) Дзед сядае на калоду і, заместа барышу, дае сальца малышу (Я. Колас). 9) Акрамя кветак, для абрадавых вяночкаў на Купалле дбайныя гаспадыні і добрыя знаўцы народнай медыцыны збіраюць розныя лекавыя травы (І. Швед). 10) Гонар не дазваляў Алёшу звярнуцца ў МТС да каго-небудзь іншага, акрамя брата (І. Шамякін).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

11) А паверхня вады, замест свіцязянскага ліпавага цвету, пацярушана сівым пылком насення сітнякоў (Я. Брыль). 12) Апрача Белавежы, на зямным шары ёсць яшчэ ўсяго толькі тры лясныя масівы, якія маюць такі ж статус [сусветнай спадчыны чалавецтва]: Дажджавыя лясы Амазонкі, трапічныя лясы Афрыкі і маленькі ўчастак тайгі ў Рэспубліцы Комі (Я. Сіпакоў). 13) Сямён жа не прэтэндаваў ні на што, апроч хіба шклянкі віна ды кароценькай увагі да яго апавяданняў пра перажытае мінулае (В. Быкаў). 14) Нешта было ў вачах дзяўчыны і акрамя прыгажосці (А. Чарнышэвіч). 15) Яна [Надзея Яноўская] змянілася за апошнія дні, магчыма, пасталела, магчыма, проста пачала ператварацца ў жанчыну. Напэўна, нічыё вока, акрамя майго, не заўважыла гэтых змен (У. Караткевіч). 16) Усе, за выключэннем Кавалевіча, выйшлі з пакоя (І. Мележ). 17) Апроч той зямлі і зямное арбіты, былі ў ім яшчэ і сузор'і адбіты (А. Куляшоў). 18) "Я не была нідзе, акрамя гэтай раўніны ў лясах" (У. Караткевіч). 19) На свяце, акрамя вальсавання і танцавальна-конкурснай праграмы, будуць і ўрачыстыя моманты (з Інтэрнэт-рэсурсаў). 20) Мы адліць усё патрапім, апроч звону векавога, таго звону, які ўсе мы роднай моваю завём (М. Танк).

***Практыкаванне 29. Прачытайце сказы. Падкрэсліце адасобленыя члены сказа. Пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку.***

І. 1) Апрануўшыся ў зялёны ўбор цвітуць беластволыя дрэвы. Майскі ветрык страсаючы суквецці-каташкі клубіць пылком у прыгожа прыбраных, бы да свята, зялёных кронах (А. Курскоў). 2) Дабранега накінуўшы на плечы кажушок выбегла на цёмны двор палахліва азіраючыся паставіла гліняную міску з куццёю ля глухой сцяны церама (Л. Дайнека). 3) Прыняўшы хрысціянскае імя Анастасія яна [Рагнеда] жыла ў манастыры да канца сваіх дзён пакінуўшы пра сябе памяць гордай і свабодалюбівай князёўны-палачанкі (У. Бутрамееў). 4) Нягледзячы на позні час ніхто з пасажыраў не спаў (І. Шамякін). 5) Сястра ў паліклініцы нават клінічныя карткі перабірае стоячы нават на тэлефонныя званкі адказвае не прысеўшы: багата клопату (Ф. Янкоўскі). 6) Рыгор доўга шукаў выхад а знайшоўшы весела ўсміхнуўся і выйшаў з кватэры (Ц. Гартны). 7) Пайшоў Амелька нос павесіўшы, каб лішняй звягі не чуць (М. Лынькоў). 8) Я паеду туды хіба што адчуўшы, што гэта надзвычай неабходна. 9) Мы нараджаемся на зямлі пройдзем па ёй пакінуўшы, спадзяёмся, выразны след а праз нейкі час навечна адыдзем у яе мацярынскае ўлонне (Я. Крук). 10) Прыходзілася вяртацца з



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

разведкі і не атрымаўшы ніякіх звестак (В. Быкаў). 11) Сіратлівы бусел, задумаўшыся, стаяў на адной назе і падоўгу глядзеў, павярнуўшы дзюбу на поўдзень (П. Броўка). 12) Бясконцы рой залатых іскраў выпускаў паравоз агністаю паласой вызначаючы сабе дарогу (Я. Колас). 13) Лабановіч выйшаў з вагона крыху пастаяў падумаў і не заходзячы на станцыю пайшоў па палатне дарогі (Я. Колас). 14) Няўмольна бяжыць час пакідаючы гісторыі падзеі і даты (А. Асіпенка). 15) Недзе далёка-далёка бліснуў агеньчык і сарамліва памігаўшы знік (У. Караткевіч). 16) Вячка стаяў пасярэдзіне апачывальні глыбока задумаўшыся (Л. Дайнека). 17) Старая Тадора выйшла з апачывальні паклаўшы Соф'ю ў калыску (Л. Дайнека). 18) Гром грымеў амаль безупынна не змаўкаючы ні на хвіліну (В. Вольскі). 19) Стары пайшоў нават не адпачыўшы як след (К. Чорны). 20) Ён не гаварыў а махаючы рукамі крычаў у натоўп (П. Пестрак).

II. 1) Апроч мяне была ў маці яшчэ дачка мая сястра старшая (В. Быкаў). 2) У качарэжніку замест чапялы і вілак стаяла на табурэце ацынкаванае вядро з вадою (М. Паслядовіч). 3) А ў нядзелю акрамя Андрэя Макаёнка прыходзіў Аляксей Кулакоўскі (А. Васілевіч). 4) У белавежскіх лясах апрача цецерукоў жывуць рабчыкі і курапаткі (В. Вольскі). 5) Замест густой пушчы растуць зеленакосыя сады. 6) Яны [бедныя людзі] не бачылі нічога акрамя дрэннага хлеба (У. Караткевіч). 7) Лісцем укрыта ўсё за выключэннем дагледжанага дзядулевага двара. 8) Сымон Будны апрача роднай беларускай мовы выдатна валодаў лацінскай грэчаскай польскай іўрытам стараславянскай мовамі (А. Жураўскі). 9) Усе за выключэннем Кавалевіча выйшлі з пакоя (І. Мележ). 10) Апроч той зямлі і зямное арбіты былі ў ім яшчэ і сузор'і адбіты (А. Куляшоў). 11) Ніхто яшчэ акрамя маці так ласкава не абыходзіўся з Верай (І. Навуменка). 12) У такіх жанчын як Вольга акрамя мацярынскага эгаізму ёсць яшчэ інтуіцыя і мудрасць (І. Шамякін). 13) "Я здагадвалася, – сказала яна [Надзея Яноўская]. – Гэты свет вабіць, але я не патрэбная нідзе акрамя Балотных Ялін" (У. Караткевіч). 14) С. Будны быў надзвычай адукаваным чалавекам. Апрача роднай беларускай мовы ён выдатна валодаў класічнай лацінкай іўрытам а таксама грэчаскай польскай і стараславянскай мовамі (з часопіса "Маладосць"). 15) Усё мае працяг жыцця апроч няпраўды (М. Танк). 16) На голых дрэвах замест лісця паклалі шэрань маразы (Я. Колас). 17) І тчэ забыўшыся рука заміж персідскага ўзору



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

цвяток радзімы васілька (М. Багдановіч). 18) Увесь дзень за выключэннем перапынку на абед і снеданне быў прызначаны агляду гаспадаркі (Я. Колас). 19) Апошнія часы за выключэннем некалькіх марозных дзён неба хмурнае і часта ідуць дажджы (Ф. Багушэвіч). 20) Замест даклада на пасяджэнні адбыўся дыялог паміж выступоўцам і слухачамі (з Інтэрнэт-рэсурсаў).

***Практыкаванне 30. Прачытайце сказы. Падкрэсліце ўдакладняльныя і далучальныя члены сказа. Патлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.***

1) Уся яго [Агеева] астатняя маёмасць была на вуліцы, каля вогнішча і палаткі (В. Быкаў). 2) Пад паветкаю насупраць хатніх акон ляжаў лом (К. Чорны). 3) На пагорку, недалёка ад рачулкі, стаялі купчастыя ліпы (Я. Колас). 4) Ліпа тут, над ракой, на ўзлессі не адна (Я. Брыль). 5) Высока ў блакіце ў раскошнай ляноце плывуць, як кавалачкі ваты, невялікія рэдкія аблачынкі (Я. Брыль). 6) Ніякая іншая птушка, нават праслаўлены салавей, не можа параўнацца ў спевах з лясным жаваранкам (Я. Колас). 7) Я высунуў за ім [Малым Чалавекам Балотных Ялін] галаву і пабачыў, што гэта істота з малпячым спрытам ідзе па вузкім, у тры пальцы, карнізе (У. Караткевіч). 8) Дрэвы, у прыватнасці вольхі і асіны, зімой вельмі крохкія (“Звязда”). 9) На Дняпры стаяў параход, і даволі вялікі (М. Лынькоў). 10) Праславіўся дзед Талаш як ваяка, ды які яшчэ ваяка: чырвоны партызан, і не радавы, не просты партызан! (Я. Колас). 11) Яна [Марыя] міла ўсміхнулася на развітанне і хуценька выйшла праз незагарожаны, без веснічак, выхад на вуліцу (В. Быкаў). 12) Яшчэ зранку на другі дзень па Заборцах панеслася гутарка аб Сцёпку (Я. Колас). 13) Яна, гэтая дарога, заўсёды здавалася Алаізе жывою (В. Коўтун). 14) Адсюль, з пагорка, перад чалавекам раскрываецца ўвесь абсяг. Там, каля ўзлеску, віднеюцца дамы Вішнякоў (М. Даніленка). 15) Высока ў сінім бязвоблачным небе плыве яркае сонца, шчодра лье на зямлю сваю цеплыню і святло (І. Навуменка). 16) У той самы вечар, гадзін каля дзесяці, я ляжаў, схаваўшыся ў здзічэлым невысокім бэзе і высокай траве якраз каля паваленай агароджы (У. Караткевіч). 17) Пад стрэшкай пчол гамоніць рой, ды так ціха, ды так глуха! (Я. Колас). 18) Янка Купала часта наведваў гэтыя мясціны, галоўным чынам летам (П. Броўка). 19) Усе казкі канчаюцца, нават самыя дзіўныя і доўгія (І. Мележ). 20) На дварэ мароз, і які мароз! (Я. Колас).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Практыкаванне 31. Прачытайце сказы. Падкрэсліце ўдакладняльныя і далучальныя члены сказа. Пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку.***

І. 1) Там, за лясамі, ёсць цёплыя лугі, кветкі, буслы на дрэвах (У. Караткевіч). 2) За домам стаялі вялізныя вышэй чалавека ўжо засыхаючыя лопухі (У. Караткевіч). 3) І [Малы чалавек Балотных Ялін] зачамкаў вялізным да вушэй ротам (У. Караткевіч). 4) Воддаль за дарогай у крайніх дварах пасёлка віскліва забрахаў сабачка (В. Быкаў). 5) Людзі пазіралі ўважліва і асабліва старшыня (Я. Колас). 6) Лагуновіч асабіста агледзеў і не адзін раз кожную машыну (І. Мележ). 7) Цяпер у спакойны ліпеньскі дзень возера нечым нагадвала сіняе казачнае мора… (У. Карпаў). 8) Яшчэ досвіткам у нядзелю Янка падымаўся рана, каб пабудзіць дзяўчат і пайсці ў лес па грыбы (З. Бандарына). 10. Усе казкі канчаюцца нават самыя дзіўныя і доўгія (І. Мележ). 11) Тут пад Полацкам у фальварку Палівачы´ мясцовы самародак Ігнат Буйніцкі арганізаваў першы беларускі прафесійны тэатр (С. Пятровіч). 12) Маладыя гады будучага раманіста і вучонага [Юзэфа Крашынскага] прайшлі ў беларускай вёсцы Доўгае каля Пружан у маёнтку бабулі (Г. Каханоўскі). 13) На скошаным лузе недалёка ад дрэў пасвіліся статкі (Я. Колас). 14) Адтуль з захаду дзьмуў свежы адліжны вецер з ледзь улоўным пахам вільгаці (А. Асіпенка). 15) На заходняй мяжы Беларусі ў запаведных лясах Белавежскай пушчы сотні гадоў назад сустракаліся вялікія статкі зуброў (А. Курскоў). 16) Гэтым летам на схіле гарачага жніўня пабываў я на Стаўбцоўшчыне (С. Кухараў). 17) Даўно за сінімі стагоддзямі гэта адбывалася (А. Ненадавец). 18) Тут за Гаямі нарэшце аблюбаваўшы краявід спыніўся я і ўзяўся за фарбы (А. Кандрусевіч). 19) Пасля вайны мы жылі на ўскраіне Мінска ў драўляным доме на Маладзечанскай (В. Вітка). 20) У мяне і цяпер ёсць адзін даўно нагледжаны куст [мяты] пры самай вадзе ў глухім закутку ля Свіслачы (В. Вітка).

ІІ. 1) У Венгрыі бытуе культ птушак асабліва белай чаплі. Малюнак гэтай птушкі быў нават на гербах венгерскіх каралёў і гарадоў (С. Паўлаў). 2) Але ноч не вечная нават самая цёмная і доўгая (Л. Дайнека). 3) Ехаць да Бялынавіч было далёка тым больш па гарачыні (І. Чыгрынаў). 4) Найвышэйшы ўзлёт полацкай архітэктурнай школы звязаны з творчасцю дойліда Іаана прыпадае на гады асветніцкай дзейнасці Ефрасінні што вядома зусім невыпадкова (У. Арлоў). 5) Усё перажытае ўспамінаецца да драбніц, асабліва басаногае маленства



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

(В. Дайліда). 6) Лена апраўдвае сваіх выхаванцаў нават хлопцаў, усіх за выключэннем Толіка Шарэйкі (Я. Брыль). 7) Глуха непрытульна ў лесе зімой асабліва ў снежную замець (М. Лынькоў). 8) У гады вайны мне двойчы давялося пабываць у варожым тыле ў тым ліку і на роднай Случчыне (А. Астрэйка). 9) Змрокам на гэтым месцы зноў з'явіўся Сымон Ракуцька і не адзін (К. Чорны). 10) Тут паміж каранёў разложыстых дрэў выбівалася невялікая рачулка (Я. Зазека). 11) Кожнае лета ён [Колас] выязджаў у якую-небудзь вёску бліжэй да лесу да Свіслачы (М. Лынькоў). 12) Адказ са штаба прыйшоў хутка праз дзве з паловай гадзіны (В. Быкаў). 13) Некаторыя дрэвы асабліва на ўскраінах былі высечаны на дровы (М. Лынькоў). 14) У нядзелю досвіткам усе ў тым ліку і Брагінец з жонкай выйшлі на азеляненне сядзібы (І. Гурскі). 15) Рака пракапала сабе новае рэчышча там на лугавым беразе пакінуўшы тую абмялелую але чыстую незарослую травою старыцу (І. Шамякін). 16) На стале ляжалі газеты прычым свежыя (І. Шамякін). 17) Каля Андрэя трымаліся з паўдзясятка байцоў у тым ліку сувязіст Клімкоў (А. Кулакоўскі). 18) Гэты дзівосны звярок [хахуля] сустракаецца толькі ў Расіі ў басейнах ракі Волгі і то не ўсюды (У. Ягоўдзік). 19) А там далей пад векавым дрэвам застыў стары зубр (Я. Пархута). 20) А пад бэзам раслі высокія вышэй за чалавека жоўтыя вяргіні мясістыя дзядоўнік глухая крапіва і іншая дрэнь (У. Караткевіч).

## Параўнальныя канструкцыі

***Практыкаванне 32. Размяркуйце сказы па наступных групах: 1) коскамі адасаблецца параўнальны зварот; 2) коскамі адасабляецца параўнальны зварот, які адносіцца да ўказальных слоў <u>так</u>, <u>такі</u>, <u>столькі</u> і інш.; 3) коскамі адасабляецца прыдатак, які мае дадатковае акалічнаснае значэнне прычыны або ўступкі; 4) коскамі адасабляецца прыдатак, які адносіцца да асабовага займенніка; 5) коскамі адасабляецца дададаная параўнальная частка; 6) коска не ставіцца, таму што параўнальны зварот выконвае функцыю выказніка; 7) коска не ставіцца, таму што параўнальны зварот мае значэнне "ў якасці"; 8) коска не ставіцца, таму што параўнальны зварот з'яўляецца фразеалагізмам.***

І. 1) Ва ўсім раёне не было такога аматара салаўіных песняў, як Базылёнак (А. Кандрусевіч). 2) Як скаромная абрадавая страва вераш-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чака гатавалася часта ў дні каляндарных і сямейных свят (В. Цітоў). 3) Абрад царкоўнага хрышчэння як абрад далучэння нованароджанага да праваслаўнай веры адбываўся ў адзін з нядзельных дзён у першыя два-тры тыдні пасля нараджэння дзіцяці (Т. Кухаронак). 4) Такія гарады, як Лагойск, Уладзімір Караткевіч назваў "вялікімі малымі гарадамі" (з часопіса "Роднае слова"). 5) Лагойск упершыню згадваецца ў пісьмовых крыніцах у 1078 годзе як горад-крэпасць Полацкай зямлі (з часопіса "Роднае слова"). 6) Цяпер адсюль, з гары, яны сваімі вачамі хацелі бачыць, як успыхваюць гірлянды агнёў (П. Броўка). 7) Экіпаж пачаў рыхтавацца да першага свайго вылету, як да самага цяжкага ў сваім жыцці экзамену (Я. Зазека). 8) Жыццё ў дружнай птушынай пары ішло спакойна, як у добрых, гаспадарлівых людзей (А. Саснок). 9) Далёка ў лесе такуе цецярук, як бы нехта багамольны чытае там малітвы (Я. Колас). 10) Літаратура нібы той звон. Абуджае нашу памяць, заклікае да пільнасці (А. Асіпенка). 11) Потым пачуўся лёгкі няўлоўны хруст, нібы нехта, як хлебны каравай, пераламаў над яшчэ соннай зямлёй агромністую дажджавую хмару (Л. Дайнека). 12) І ні ў кога іншага не выявіўся так ярка моватворчы геній народа, як у Янкі Купалы (Н. Гілевіч). 13) Быццам дзве рукі, высока пад неба ўздымае свае вежы храм Святой Сафіі (Н. Гальпяровіч). 14) З высокай гары, як красачка з зеляніны, паважна глядзіць на аколіцу старажытны замак, абведзены высокімі пасівеўшымі сценамі (У. Галубок). 15) Айшэ разам з Лолай як падкошаная рухнула на прыступкі (В. Праўдзін). 16) Гарабурда сядзеў у сваім бярлогу, як хамяк у нары (У. Караткевіч). 17) Бэз як быццам быў абсыпаны залаціста-фіялетавымі кветкамі (А. Жук). 18) Непадалёку віднеўся сіні, як бы ахутаны дымам, лес (К. Чорны). 19) І барада ў яго [Бермана] расла слаба, як у многіх беларусаў з нездаровых балотных мясцін (У. Караткевіч). 20) Ніводзін касцёр так мяне не вяртаў да жыцця, як цяпло тваёй песні… (М. Танк).

II. 1) Віцебск быў вядомы са старонак летапісаў, гістарычнай літаратуры як Віцепск, Відзьбеск, Віцьбеск (Л. Лыч). 2) На землях крывічоў утварыліся такія магутныя для таго часу дзяржавы, як Полацкае і Смаленскае княствы (Э. Зайкоўскі). 3) Ніводнаму з беларускіх гарадоў не выпадала столькі славы і няшчасця, як славутаму Слуцку (М. Маліноўскі). 4) Нясвіж [падчас напалеонаўскага нашэсця] страціў сваё значэнне як знакаміты цэнтр культуры і мастацтва Беларусі (з часопіса "Роднае слова"). 5) Увесь характар князя быў як змотак



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пераблытаных нітак (С. Тарасаў). 6) Клімоўскі, як толькі ўзышоў на эсмінец, не скіраваў у рубку да камандзіра карабля, а пахадзіў па палубе, прыслухоўваючыся да размоў дэсантнікаў (В. Хомчанка). 7) Сон ураз адляцеў, як пырскі ад граніту. Па тым, як рэзка ўдарыла ў твар святло, зразумеў, што ноч прайшла, надышоў ранак (В. Хомчанка). 8) Край хмары, нібы вялізнае воранава крыло з мутна-бялявымі плямамі, прыкрыў сонца і павіс над горадам (Т. Хадкевіч). 9) Зоркі глядзелі з неба, як нечыя сумныя вочы (Л. Дайнека). 10) У беларускай паэзіі ніхто не валодаў такой магутнай здольнасцю да словатворчасці, як Янка Купала (Н. Гілевіч). 11) З высокіх байніц, быццам лютыя звяры, нема глядзяць у туманную даль гарлачы гармат (У. Галубок). 12) З гарнізона вёска відаць як на далоні (Ф. Янкоўскі). 13) Сэрца маё калацілася, як хвост авечкі (У. Караткевіч). 14) Васька сядзеў як на іголках (М. Лынькоў). 15) Людзі грызуцца, як павукі ў банцы (У. Караткевіч). 16) Лісце круцілася ў вечным танцы, быццам там вадзянік варыў з яго суп на вячэру (У. Караткевіч). 17) Знаць, па начы блукае хтось, як мы, да ранняга святла (М. Танк). 18) Толькі заўсёды, як мы зберымося дамоў і на стол пакладзе рукі маці, быццам ад сонца, ад іх пасвятлее ў хаце і ў сэрцы (М. Танк). 19) Сабака, як быццам у знак згоды, лізнуў гаспадарову руку (А. Пальчэўскі). 20) Не паспеў Лёнік падумаць пра ўсё гэта, як ластаўка, нібы зрабіўшы надзвычай важную справу, сіганула над самымі галовамі дзяцей (А. Вольскі).

***Практыкаванне 33. Спішыце сказы. Расстаўце прапушчаныя знакі прыпынку, патлумачце іх.***

I. 1) Дзесьці далёка як страшэнны гром грымеў фронт (Я. Зазека). 2) Рознакаляровыя вялікія і малыя камяні і скалы быццам адліты з медзі (В. Петрасян). 3) На такой жа цёмна-сіняй як і неба вадзе струменіла серабрыстая дарожка халоднага святла (В. Вольскі). 4) Каля стагоддзя назад узнікла ідэя дастаць з вады адзін з гістарычных валуноў і паставіць як помнік на плошчы ў цэнтры горада (Э. Ляўковіч). 5) Маленькія камарыкі-таўкунчыкі гулялі на сонцы як бы чыясьці нявідная рука трэсла ў паветры маленькую сетачку (Я. Колас). 6) Камянец заўсёды меў асаблівае значэнне як памежнае ўмацаванне і важны гандлёва-рамесны цэнтр (А. Бутэвіч). 7) Недзе далёка глуха як з-пад зямлі загрымела (І. Шамякін). 8) На ўсе пытанні Максімка адказваў зусім як дарослы (М. Гурскі). 9) Цэлы дзень дождж ліў як з вядра (В. Быкаў). 10) Неабсяжная раўніна роўная як стол была карычневага нават бурага колеру безнадзейна роўная нудная змрочная (У. Караткевіч). 11) Яна [На-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

дзея Яноўская] размаўляла пра каханне так як некаторыя жанчыны пра надвор'е (У. Караткевіч). 12) А потым заспяваў рог недзе зусім у другім баку і так прыглушана быццам праз вату (У. Караткевіч). 13) Свеціловіч як увайшоў так і сеў у канцы стала (У. Караткевіч). 14) Сядзіць хмуры як цмок і глядзіць на мяне дапытліва (У. Караткевіч). 15) Мне было чамусьці нават страшна нібы я прысутнічаў на пахаванні (У. Караткевіч). 16) Сягоння нават стрэхі хат пакрыў бы ўзімку снегапад пух тапаліны (М. Танк). 17) Сонца прыгравала зусім як летам (М. Парахневіч). 18) У хату ўвайшоў не хто іншы як цётка Аўдоля (А. Чарнышэвіч). 19) Пялёсткі быццам снег падталы плылі ўспененай ракой (П. Прыходзька). 20) Усё збылося як не трэба лепш (К. Чорны).

II. 1) У "Аповесці мінулых гадоў" Слуцк згадваецца як адзін з гарадоў Тураўскай зямлі ("Роднае слова"). 2) З маленства хлопчык [Давыд Гарадзенскі] выхоўваўся як воін (М. Багадзяж). 3) У традыцыйнай культуры беларусаў зямля ўспрымалася як родны кут родная старонка, Радзіма як месца нашага часовага існавання на гэтым свеце і як магіла месца вечнага спачыну (Я. Крук). 4) Лясныя жаваранкі цудоўныя спевакі! Па прыгажосці сваёй песні яны могуць паспрачацца з такімі прызнанымі спевакамі як шпак дрозд і нават салавей (Р. Ігнаценка). 5) Лес шамаціць галінкамі нібы адмыслова апрацаванымі каралямі (П. Броўка). 6) Зіму скідвалі з дахаў, як з мурoў крэпасці (У. Караткевіч). 7) Павязло ёй – пагода стаіць як па заказу (В. Гігевіч). 8) Здалёк віднелася не што іншае як невялікая башня (М. Ваданосаў). 9) На людзях трэба быць такім жа асцярожным, як і на балотнай дрыгве (Я. Колас). 10) Шчокі быццам расквечаны макам (П. Броўка). 11) Міхал трымаўся не як сталы чалавек (Я. Колас). 12) У гэту хвіліну Алесь выглядаў зусім як дзіця (У. Караткевіч). 13) Ціхія ўзгоркі бы хвалі рачныя таксама відаць цягнуліся да няяснай і прыгожай далі (Я. Колас). 14) Я варушу мяту як свае ўспаміны (В. Вітка). 15) Вайна грымнула як маланка з чыстага неба (М. Лынькоў). 16) Начамі што яблыкі падаюць зоры (П. Броўка). 17) З ружовых калматых хвоек на цёмныя вокны лужын сыпалася кастрыца жоўтая і лёгкая як лупіны на цыбулі кара (В. Адамчык). 18) Твар пана Рыгора прасвятлеў як быццам ён дачакаўся нарэшце (У. Караткевіч). 19) Звініць ад жаваранкаў гай як ад вясельных скрыпак нейкіх (М. Танк). 20) Бабрыха час ад часу нырае ў ваду залазіць у хатку і там пярэднімі лапамі як сапраўдны тынкоўшчык абмазвае столь сваёй кватэры глеем (В. Вольскі).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Пабочныя і ўстаўныя канструкцыі

***Практыкаванне 34. Прачытайце сказы. Знайдзіце пабочныя і ўстаўныя словы (спалучэнні слоў, сказы). Патлумачце знакі прыпынку пры іх.***

I. 1) Ды ўсяму, кажуць, свой час (Б. Сачанка). 2) Значыць, яшчэ ў дзясятым стагоддзі Тураў быў сталіцай асобнага княства і меў свайго князя (В. Вольскі). 3) Як паселішча дрыгавічоў Тураў існаваў, мабыць, задоўга да князя Тура (В. Вольскі). 4) Я назіраў за турлачкамі (так называюць у нас дзікіх галубоў) і ціхенька сам сабе смяяўся (У. Рубанаў). 5) Ёсць, напрыклад, у Тураве калолдзеж, які называецца Калодзежам Тура. Магчыма, у старажытныя часы з гэтым калодзежам былі звязаны нейкія вусныя эпічныя ці паэтычныя творы, цяпер ужо даўно забытыя (В. Вольскі). 6) Чалавек, які ўсур'ёз дапытваецца ў светароў, лезе да ўсіх з роспытамі, хто стварыў свет (Бог? Дык, а хто ж тады стварыў Бога?), выглядае сама меней наіўным. Я таксама наіўны, бо, для прыкладу, ніяк не магу зразумець і паверыць у бясконцасць сусвету, але ні ў каго не пытаюся пра гэта, бо ведаю, што ніхто не зможа мне растлумачыць гэтую дзіўную таямніцу (Я. Сіпакоў). 7) Уласціва нашым людзям знаходлівасць, нават некаторая хітрасць (У. Караткевіч). 8) Па павер'ях, ліпы лячылі людзей (Л. Дучыц). 9) Настаў, бадай, самы доўгачаканы для грыбнікоў час. Менавіта ў першы асенні месяц "ціхае паляванне" бывае самым здабытлівым. Па восеньскім лесе, здаецца, можна блукаць бясконца. (з календара "Родны край"). 10) Было відаць, што яе [лісіцу] ахапіў паляўнічы азарт (А Асіпенка). 11) У вачах, здавалася, лёталі і зялёныя мяккія матылькі і медна-залатыя пчолы (У. Дайнека). 12) Здалёк здавалася, быццам гэта не журавы былі, а жвавая дзятва рассыпалася па чэрвеньскім лузе, збіраючы духмяныя краскі (Р. Ігнаценка). 13) З Наташкай, такім чынам, быццам бы ўсё было наладжана. Ва ўсякім разе, на бліжэйшы час. Але няшчасці, як кажуць, не ходзяць паасобку (А. Шаўня). 14) Нізіну не затапіла – значыць, вышыня плаціны была нармальная (А. Шаўня). 15) І толькі позірк на партрэце (як выпісаць змагла рука), нібыта распісаўся вецер пялёсткам сінім васілька (Р. Баравікова). 16) Высокая дамба – не грэбля – лягла на рачны сухадол (М. Калачынскі). 17) Тут у мяне патрабуюць, каб я сваім апавяданнем скончыў сказ пра род Яноўскіх і яго заняпад, пра вымарачнасць беларускай шляхты. Відаць, трэба мне зрабіць гэта, бо, сапраўды, якая ж гэта атрымаецца гісторыя без канца. Да таго ж, яна блізка датычыцца мяне, і

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

расказаць пра гэта ўжо ніхто не можа – толькі я (У. Караткевіч). 18) Але паўсюль – і толькі гэта рабіла лягчэйшай справу маю – я сустракаў увагу і дапамогу (У. Караткевіч). 19) Летам, вядома, фалькларысту добра: цёпла, вакол прыгожыя краявіды (У. Караткевіч). 20) Змрочнай, а галоўнае, пустыннай здалася Андрэю свая хата (П. Пестрак).

II. 1) Кажуць, бяда ўзбуджае ў чалавека ўсе яго нервы, прыводзіць у рух усе клетачкі мозга (А. Пальчэўскі). 2) Здавалася, скрыпка ўздыхала ледзь прыхаваным чалавечым болем (У. Дамашэвіч). 3) Здаецца, што гэта не кветкі, а лёгкі, як пух, белы туман, які спусціўся на берагі ручаёў, рэк, азёр (А. Курскоў). 4) Як кажуць, хто цягне, на таго і грузяць (М. Зарэмба). 5) Чалавек, як вядома, найбольш сумленны да дваццаці пяці год, у гэты час ён арганічна не выносіць несправядлівасці, але моладзь занадта прыслухоўваецца да сябе, ёй нова і цікава глядзець, як новымі думкамі і пачуццямі (яна ўпэўнена, што такога не думаў і не адчуваў ніхто) рунее душа (У. Караткевіч). 6) Але ў той час я ў глыбіні душы (хоць і лічыўся “чырвоным”) быў перакананы, што не толькі з шыбеніц растуць на зямлі лясы (што, вядома, было правільным нават у часы Іасафата Кунцэвіча і беларускай доказнай інквізіцыі) і не толькі стогн адчуваецца ў нашых песнях (У. Караткевіч). 7) Вы, напэўна, ведаеце, што ўсе легенды можна падзяліць на дзве вялікія групы (У. Караткевіч). 8) Здаецца, аднак, толькі пасля пераходу я адчуваў моцную стому (І. Шамякін). 9) Зіма – хоць ты плач! – не хацела саступаць месца вясне (А. Васілевіч). 10) Янка Тукала жыў не так далёка ад Мікуціч – за Нёманам вярсты тры (Я. Колас). 11) Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч) нарадзіўся ў 1882 годзе (М. Мушынскі). 12) Жэстам, вартым каралевы, яна [Надзея Яноўская] паказала мне на крэсла (прыблізна так у тэатрах каралевы паказваюць на плаху няшчаснаму любоўніку: “Вось тваё месца, злашчасны!”), папрасіла прабачэння і пакінула мяне аднаго (У. Караткевіч). 13) Калі я апусціў руку, у вачах гэтай дзяўчыны – не, нават дзіцёнка – з’явілася нешта ліхаманкавае, балючае, дзіўнае (У. Караткевіч). 14) Ложак, відаць, засцілалі з дапамогаю асаблівай палкі (як дзвесце год таму), такі ён быў вялікі (У. Караткевіч). 15) Напэўна, у флігелі дымілі печы, і таму гаспадары да позняй восені варылі ежу на свежым паветры (У. Караткевіч). 16) А за агароджай (тут алея звяртала налева і цягнулася немаведама куды) ляжала бурая неабсяжная раўніна са скарлючанымі рэдкімі дрэўцамі, зялёнымі вокнамі (у адно з іх мы, відаць, учора ледзь не трапілі, і я пахаладзеў ад жаху),



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рэдкімі велічнымі каменнямі (У. Караткевіч). 17) Вы, вядома, ведаеце, што стагоддзі два-тры таму срэбная і залатая пасуда на Беларусі была пераважна нямецкай работы, вывезеная з прусаў (У. Караткевіч). 18) Сапегі, паводле дакуметаў, – старажытны крыўскі род, калыскай якога была Смаленшчына (В. Ластоўскі). 19) Беларускі магнат Рыгор Хадкевіч, які даўно марыў аб адкрыцці ўласнай друкарні, запрасіў П. Мсціслаўца і І. Федаровіча да сябе ў мястэчка Заблудаў (цяпер Беластоцкае ваяводства ў Польшчы). 20) Берагі Прыпяці нізкія. Белыя палосы пяску, часам вельмі шырокія, відаць здалёку (В. Вольскі).

***Практыкаванне 35. Выпішыце сказы, у якіх выдзеленыя словы (спалучэнні слоў) з'яўляюцца пабочнымі. Расстаўце прапушчаныя знакі прыпынку.***

І. 1) Перад вачыма *амаль* праз кожныя сорак-пяцьдзясят кіламетраў паўставалі магутныя каменныя ці цагляныя сцены з вузкімі байніцамі заўсёды гатовымі належным чынам сустрэць варожую сілу (У. Ягоўдзік). 2) *Неўзабаве* мы пад'ехалі да зубрынай паляны (Я. Пархута). 3) *Нарэшце* ён [цецярук] залопаў крыламі і зашыкаў падскокваючы на месцы (М. Паслядовіч). 4) Вада ў рацэ празрыстая халаднаватая *нават* у самыя гарачыя летнія дні (А. Казаннікаў). 5) Дзяўчына з каменнай нерухомасцю глядзела некуды ў адну кропку. *Відаць* сапраўды чула плач дрэў (А. Казаннікаў). 6) Праз белую павалоку фіранак *відаць* зеляніна вазонаў… (Я. Брыль). 7) Нядаўна *як кажуць* урачыста святкаваўся юбілей дуба, што даўно жыве ў лясным гушчары каля вёскі Пажэжын, што ў Маларыцкім раёне (Я. Сіпакоў). 8) У народзе *кажуць* што энергетыка дуба дае вялікі прыліў сіл і той хто будзе штодзень прыходзіць да яго *можа* вылечыць любую хваробу… (Я. Сіпакоў). 9) Хлуслівы не прызнаецца ў хлусні ён *можа* і не знае што хлуслівы… (Р. Баравікова). 10) Дубатоўк быў з мясцовых заможных шляхцюкоў. Заможнасць была *аднак* адносная (У. Караткевіч). 11) Будуе хатку *галоўным чынам* бабрыха (В. Вольскі). 12) Унутры бабровай хаткі *часам бывае* некалькі пакояў і некалькі выхадаў пад ваду (В. Вольскі). 13) І *ўсё ж* нашы продкі не зніклі бясследна (А. Мальдзіс). 14) Старыя шпакі *відаць* практыкавалі маладых у лятанні каб умацаваць іх крылле перад дарогай у вырай (Я. Колас). 15) Дрэвы якія паскідалі снегавыя шапкі і зімовую панурасць *здаваліся* ў густым бары надзвычайна ўрачыстымі (М. Лынькоў). 16) Яшчэ *здаецца* нядаўна дрэвы і кусты стаялі аголеныя а вось ужо і далікатныя зялёныя лісточкі шапацяць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(А. Курскоў). 17) *Здаецца* што ніхто і ніштο не можа спыніць жыцця крыніц народжаных падземнаю сілаю зямлі (З. Бяспалы). 18) *Магчыма* канчаткова выбраць паэтычнае імя дапамог Купалу слынны беларускі пісьменнік Ядвігін Ш. (У. Ліпскі). 19) Дождж *нарэшце* прыйшоў (І. Шамякін). 20) *Як на грэх* адзіны за ўвесь дзень апошні прамень сонца прабіўся ў акно і зайграў у шкле запаліў у ім дзясяткі рознакаляровых агеньчыкаў (У. Караткевіч).

II. 1) Ужо ўзышло сонца, і мне ўсё *відаць* было вельмі добра (М. Паслядовіч). 2) Лісце з чарнічніку *амаль* асыпалася (П. Місько). 3) *Нарэшце* выслізваю на двор (Г. Пашкевіч). 4) Замак *як відаць* быў вялікі. *Магчыма* на гары былі *нават* два замкі (В. Вольскі). 5) З вышыні замчышча добра *відаць* усё наваколле (В. Вольскі). 6) *Мабыць* вінавата проста месца (І. Навуменка). 7) Пасля доўгіх намаганняў мядзведзь *нарэшце* дацягнуўся да адной норкі і пачаў раскопваць уваход (М. Звераў). 8) Мне *здалося* што ў прыбярэжных за ракою кустах лазнякоў і чаромхі гулка адазваўся салавей (К. Кірэенка). 9) Неабсяжная раўніна роўная як стол была карычневага *нават* бурага колеру безнадзейна роўная нудная змрочная. *Часам* трапляліся на ёй вялізныя купы нагрувашчанага камення… (У. Караткевіч). 10) Я *аднак* не сеў пакуль не села яна [Надзея Яноўская] (У. Караткевіч). 11) Гаспадыня *напэўна* заўважыла мой позірк… (У. Караткевіч). 12) *Праўда* сёння яна [Надзея Яноўская] неяк пажвавела здавалася *нават* не такой непрыгожай *відаць* ёй падабалася новая роля (У. Караткевіч). 13) Смешна? Мне было ў той час *як вы здагадваецеся* не да смеху (У. Караткевіч). 14) У ваколіцах Балотных Ялін было *асабліва* неспакойна (У. Караткевіч). 15) Сарвеш антонаўку правядзеш па ёй далонёю каб абцерці. *Божа мой* як свежа яна зарыпіць *здаецца* чуваць на ўвесь свет (Я. Сіпакоў). 16) *Бывае* ўнадзіцца ў сады моцны вецер. Пашастае паходзіць паносіцца між яблынь (Я. Сіпакоў). 17) *Між тым* у летнюю пару бываюць у дзятлаў часіны калі яны становяцца такімі ж лаўцамі насякомых як і іншыя птушкі (З. Бяспалы). 18) Ёсць *праўда* і глыбейшыя азёры на Беларусі (В. Вольскі). 19) *Нават* вялікія марскія караблі падымаюцца па ёй [па Дзвіне] да Рыжскага порта. Тут каля Віцебска рака *амаль* не суднаходная (В. Вольскі). 20) Паволі плылі воды серабрыстага Нёмана. *Відаць* было пясчанае дно прыгажуні-ракі. Нёман быў *надзіва* спакойны велічны і магутны. Аліку *здавалася* што нідзе ў свеце няма чысцейшай вады за нёманскую што няма прыгажэйшай ракі (І. Гурскі).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Практыкаванне 36. Спішыце спачатку сказы з пабочнымі, потым – сказы з устаўнымі канструкцыямі. Расстаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Патлумачце адрозненне паміж пабочнымі і ўстаўнымі кампанентамі.***

І. 1) Як пішуць знаўцы “пушча захавалася таму што ў ёй жылі зубры а зубры захаваліся таму што была пушча” (Я. Сіпакоў). 2) Гавораць што недзе ў гарачыню абмялела ці перасохла рачулка (А. Казаннікаў). 3) Яны [цецерукі] як каршуны люта каціліся адзін на аднаго у паветры белымі маланкамі мільгалі разгорнутыя вееры хвастоў мне здалося што нават лятала пер’е (М. Паслядовіч). 4) Той дзень запомніўся ніколі не забудзецца! да драбніц (П. Клімук). 5) Канстанціна Міхайлавіча а такое сапраўднае імя было ў Якуба Коласа вельмі часта можна было бачыць на двары каля свайго дома (М. Лынькоў). 6) Чалавек быў сапраўды вельмі маленькі я бачыў яго амаль па пояс у каптане з шырокім каўняром (У. Караткевіч). 7) Брамку не скрануць з месца снегам заваліла відаць не часта тут ходзяць (Г. Пашкевіч). 8) Значыць і на гэты раз мне не давялося пабыць у сапраўднай тайзе (Я Сіпакоў). 9) З сумкі выглядае ўтульна размясціўшыся на мяшэчку з белымі семкамі галоўка свежай цётка ўмее захоўваць капусты (Г. Пашкевіч). 10) Сапраўды праз некалькі дзён да знаёмай буслянкі на ясакары вярнуліся гаспадары (А. Саснок). 11) Дарэчы за адны суткі як сцвярджаюць навукоўцы звярок [хахуля] з’ядае столькі колькі важыць сам (У. Ягоўдзік). 12) Было відавочна што к вечару дачка зусім стамілася па-першае ўрокі ў школе па-другое гурток самадзейнасці і нарэшце вячэрняе чытанне (М. Касцюкевіч). 13) Быць самім сабой ужо рыса якая сведчыць аб цэльнасці а значыць аб гарманічнасці (В. Вітка). 14) Адным словам на нашу агульную думку ўсе мы ўчатырох былі добрымі хлопцамі (І. Навуменка). 15) Хлопцы маўчалі як мне здавалася вельмі доўга а магчыма ўсяго некалькі хвілін (В. Быкаў). 16) Не гадзіну а магчыма дзве і тры чакаў ён поезда (Я. Сіпакоў). 17) Фурман таксама відаць нічога не бачыў і цалкам аддаўся інстынкту коней (У. Караткевіч). 18) Нарэшце за дзвярамі захадзілі няўпэўнена нясмела (У. Караткевіч). 19) Прабачце мне шаноўныя чытачы што я не магу прайсці міма ніводнага пакоя каб не распавясці пра яго. Што паробіш на старасці год чалавек робіцца балбатлівы. І да таго ж вы такога ніколі не бачылі і не пабачыце. Магчыма камусьці будзе цікава (У. Караткевіч). 20) Ён [Берман-Гацэвіч] адчыніў адну з шафаў артыстычным рухам пальцы ў яго былі тонкія ў два разы даўжэй за нармальныя ўзняўшы воблачка пылу (У. Караткевіч).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

II. 1) Ад гэтай белай вежы мабыць пушча і атрымала назву Белавежская (У. Караткевіч). 2) З вяршыні гары відаць на даляглядзе цэлы ланцуг гор (В. Вольскі). 3) Вядома шмат што можна зрабіць і ўжо робіцца з дапамогай аўтаматычных касмічных апаратаў (П. Клімук). 4) Узлезу бывала на самую верхавіну [ліпы] і мне далёка-далёка відаць дзе што робіцца. З высокай ліпы мне відаць як за лес апускаецца чырвонае сонца (А. Бялевіч). 5) Іван любіў гэту некароткую што ні кажы а ўсё ж дзесяць кіламетраў дарогу дамоў. Любіў за тое што яна мела над ім нейкую магічную ўладу якой ён падпарадкоўваўся нават не адчуваючы гэтага (А. Кудравец). 6) Здавалася зубраня адчула сябе пераможцам (Я. Зазека). 7) І вось цяпер ад'ехаўшы з паўсотні кіламетраў ад Шушанскага дзякуй рэдактару раённай газеты які прывёз мяне сюды я стаю высока на узгор'і паміж буралому ламачча ягадніку і задаволена азіраюся (Я. Сіпакоў). 8) Аснова шасціканцовага крыжа яго даўжыня каля 52 сантыметраў драўляная (У. Арлоў). 9) Нават не кожнаму зацятаму рыбаку шанцуе сустрэць асцярожную хахулю (У. Ягоўдзік). 10) Здавалася што там у вадзяным блакітным прадонні было штосьці жывое таемнае (В. Шымук). 11) Вы напэўна ведаеце што ў даўніну людзі пісалі гусіным пяром. Але не ведаеце пэўна што толькі шэсць ад сілы дзевяць пёраў з гусі былі прыдатныя для пісьма (А. Клышка). 12) Крайко што называецца дзейнічаў заўсёды напэўна ён не любіў працаваць прыблізна абы-як (М. Ваданосаў). 13) Словам на наша шчасце хата нейкім чынам уцалела (З. Бядуля). 14) Метраў сто а можа дзвесце адышоў Міхед убок як гукнуў за лесам дзесьці басам поезда гудок (А. Астрэйка). 15) Гэты выпадак не аддаліў яго ад Валі а наадварот зблізіў (І. Шамякін). 16) Брэст як сцвярджаюць археолагі ўзнік на тэрыторыі племяннгога аб'яднання дрыгавічоў (Г. Далідовіч). 17) Як сцвярджаюць відавочцы ён [Вацлаў Ластоўскі] расстраляны ў Магадане (Я. Лецка). 18) Многія "дзеячы" як вядома адмаўлялі нашаму народу ў праве на самавызначэнне і незалежнасць; іншыя ж як В. Ластоўскі магчыма ў нечым і памыляліся але кіраваліся шчырай любоўю жаданнем памагчы свайму народу (Я. Лецка). 19) Кнігадрукаванне ў Маскве заснавалі нашы таленавітыя продкі Пётра Мсціславец ды Іван Фёдаравіч Фёдараў. Першы як відаць з яго прозвішча паходзіў з горада Мсціслава а другі на думку аўтарытэтных даследчыкаў належаў да беларускага шляхецкага роду (з газеты "Звязда"). 20) На жаль кансерватыўнае маскоўскае духавенства ды неадукаванае баярства варожа сустрэлі пачынанні беларускіх асветнікаў (з газеты "Звязда").



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Зваротак

***Практыкаванне 37. Прачытайце сказы. Назавіце звароткі. Патлумачце знакі прыпынку пры зваротках.***

1) Ласка і гнеў, ціша і бура! Я вітаю вас, калі вы прыходзіце ў сваім часе, калі выконваеце вы адвечную волю жыцця (Я. Колас). 2) Кожны раз, калі недзе блізка, я іду да цябе, маё слаўнае поле (М. Ракітны). 3) О, ляціце, журавы, ляціце сваёй млечнай дарогай, вясёлай і шумнай, нібы карагод! (М. Стральцоў). 4) Але аднойчы я чуў і тваю песню, поле (М. Ракітны). 5) Любая мая радзіма, ты ўсё гэтак не даеш старэць і лечыш душу сваёй зялёнай цеплынёй (В. Бялоў). 6) Шукай, сын, тут павінны быць баравікі (А. Варановіч). 7) Лейцаў з рук не выпускай, яздок! (М. Машара). 8) Зімовыя дарогі! Усе вы пракладаецеся па цаліку (М. Машара). 9) Эх, вольныя птушкі, як не пазайздросціць вашым лёгкім і хуткім крылам (Я. Колас). 10) Дзякуй вам, простыя беларускія людзі! (У. Караткевіч). 11) Гэй ты, князь! Гэй, праслаўны на цэлы бел свет, не такую задумаў ты думу, – не дае гуслярам сказу золата цвет, белых харамаў п’яныя шумы (Я. Купала). 12) Што ж маўчыш ты, гусляр, ніў, лясоў песнябай, славай хат маіх подданых слаўны?! Нам сягоння зайграй, нам сваіх песень дай – князь умее плаціць незвычайна (Я. Купала). 13) “Я згодна з вамі, дзядзька,” – саромячыся да слёз, сказала Надзея Раманаўна (У. Караткевіч). 14) Што ты часта, маё сэрца, б’ешся з болем перабоем? (М. Танк). 15) І я хлусіў, калі заракаўся з табой сустракацца і на гэтым і тым свеце. Бо зноў, як блудны сын, вяртаюся да цябе, паэзія (М. Танк). 16) Віцебшчына! Ты лёсам не выпешчана – ты войнамі выпесчана (Р. Барадулін). 17) Гэй, Чэрвень, ты адзін запарышся – бяры мяне к сабе ў таварышы (Р. Барадулін). 18) Вятры! Я вас заклінаю, прашу, як братоў, слухайце ўсе, слухайце ўсе! Не асыпце расу лугоў, якую песня да сонца нясе… (Р. Барадулін). 19) “Ды што з табою, урэшце, хлопча?” (У. Караткевіч). 20) “Рыгорка! Лепшы друг! Едзем з намі, перасядзіш той час, калі будуць шукаць Дубатоўка і іншых” (У. Караткевіч).

***Практыкаванне 38. Спішыце сказы. Расстаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Падкрэсліце звароткі.***

1) Бывай карпацкі чароўны кут (М. Танк). 2) Божа пашлі Беларусі ласку з Тваімі вачамі сэрцы суцеш у скрусе злітуйся над крывічамі (Р. Барадулін). 3) Не разбіраюся я Адам Пятровіч у паўдзённых ты-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пах. Беларуса за вярсту адрозню а тут баюся судзіць (У. Караткевіч). 4) О Радзіма табою напоўнена сэрца да краю (П. Панчанка). 5) Божа адвядзі ад Беларусі здраду вераломства і вайну (Г. Бураўкін). 6) Дык шануй Беларус сваю мову – гэта скарб нам на вечныя годы… (А. Гарун). 7) Калі пушок прабіўся над губою і ў сны прыйшло дзявочае імя, я ні аб чым не раіўся з табою матуля адзінокая мая (С. Грахоўскі). 8) О Беларусь мая шыпшына зялёны ліст чырвоны цвет ветры дзікім не загінеш чарнобылем не зарасцеш (У. Дубоўка). 9) Залатая асенняя раніца хараством ты на свеце адна (У. Дубоўка). 10) О край родны край прыгожы мілы кут маіх дзядоў што мілей у свеце Божым гэтых светлых берагоў, дзе бруяцца срэбрам рэчкі, дзе бары, лясы гудуць, дзе мядамі пахнуць грэчкі, нівы гутаркі вядуць… (Я. Колас).

***Практыкаванне 39. Спішыце сказы. Расстаўце прапушчаныя знакі прыпынку, патлумачце іх расстаноўку. Зрабіце поўны сінтаксічны разбор сказаў.***

I. 1) Да яго [Агеева] тут мала хто прыходзіў хіба што выпадковы прахожы з поля ды яшчэ Шурка з Артурам два хлапчукі-аднагодкі на выгляд спакойныя і маўклівыя нібы насцярожаныя чымсьці (В. Быкаў). 2) Быстравокая худышка Светачка таксама адзінае дзіця ў бацькоў была надзелена ад прыроды надта развітым пачуццём годнасці і нікому не даравала крыўды міжвольнай ці тым больш знарочыстай (В. Быкаў). 3) Калі-нікалі ў выхадныя або святочныя дні да кар’ера прыходзіў Сямён высокі худы мужчына з адзінаю рукой-клюшнёй… (В. Быкаў). 4) У самым каньку [палаткі] матава свяцілася невялікая з грывенік дзірачка нядаўна прапаленая вугальком з кастра (В. Быкаў). 5) Чайкі гуртам лятаюць над люстранай вадою калі-нікалі пікіруючы на спажыву або садзяцца на вільготны вылізаны прылівам пясок толькі імі затупаны пацярушаны іхнімі пёрцамі (Я. Брыль). 6) Я ашаломлены стаяў слухаў утаропіўшыся поглядам у дзяўчыну, якая трымала ў руках прыгожую жалейку (А. Савіцкі). 7) А вада бурліць унізе гамоніць несучы вялізныя сосны і алешыны вырваныя дзесьці з карэннем (М. Ваданосаў). 8) Сонца зрабіўшы свой штодзённы кругабег апусцілася зусім нізка і staміўшыся пачало хіліцца на захад (Б. Сачанка). 9) Пятро Сыч уздрыгануўся пачуўшы добра знаёмы голас і не азіраючыся рынуўся да патравы (М. Паслядовіч). 10) Такім помнікам абарончага дойлідства з’яўляецца і Камянецкая альбо Белая вежа (А. Бутэвіч). 11) Ён [цацярук] па-ранейшаму стаяў незварушна



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

высока падняўшы галаву насцярожаны маўклівы (М. Паслядовіч). 12) А можа недзе побач у гэтым маліnніку шастае іх [малін] спрадвечны гаспадар мядзведзь? (С. Грахоўскі). 13) Снуючыся высока ў небе раняла птушка мяккія ласкавыя мелодыі сатканыя са звону срэбраных струн з булькання лясных ручайкоў з зумкання пчаліных крыльцаў з шолаху красак (Я. Колас). 14) Парывы ветру адзін ад аднаго мацнейшыя зрывалі лісце з кустоў і дрэў то ярасна падкідаючы яго высока ўгору то гонячы між ствалоў па мокрай зямлі (В. Вольскі). 15) Адтуль аж з-пад самых хмар падалі на зямлю нечыя крыкі не то заклікаючы чалавека паляцець за сабою не то просячы ў яго дапамогі (І. Шамякін). 16) Але цяпер гледзячы на строгі цвёрды твар маладой жанчыны на валасы яе сабраныя на патыліцы ён адчуваў акрамя вострага сораму яшчэ і незразумелую радасць (В. Іпатава). 17) Але тут на самым краі светлай баравіны было суха цёпла ад зямлі нагрэтай сонцам густа ўсыпанай шорсткім шыголлем і кволымі лусачкамі маладой сасновай кары (М. Стральцоў). 18) Паводле энцыклапедычных дадзеных двойчы ў 1955 і 1959 гадах хахулю прывозілі ў нашу краіну і рассялялі ў басейне ракі Сож (У. Ягоўдзік). 19) Памяць гэта ў першую чаргу бачны вобраз створаны нашым жыццёвым вопытам або ўзноўлены і ператвораны друкаваным або жывым словам пэндзлем мастака ці разцом скульптара камерай кінематографіста ці музыкай кампазітара (А. Асіпенка). 20) Снег памалу днём растае і з шорганнем асядае а ўначы пакрываецца ледзяной скарынкай (з часопіса “Родная прырода”).

II. 1) Срэбнаю стужкаю вывіваўся Нёман то падыходзячы пад самы лес падразаючы карэнне дрэвам то бегучы сярэдзінаю лугу то падступаючы да поля апярэзваючы бліскучым срэбным паскам яго пясчаныя схілы (Я. Колас). 2) Гэтыя дубы шумелі пaціху лісцем прагна смакталі зялёныя сокі ганялі іх па ствалах і галінах цягнуліся сваімі шатамі да сонца трымалі на сабе ў навальнічныя дні ўдары маланак адводзячы іх ад людскога жытла і гаспадарчых пабудоў (У. Содаль). 3) Незвычайнае хараство і зладжанасць чуецца нам у гучанні роднага слова. Яно то ласкавае і пяшчотнае як подых летняга ветру то шырокае і плаўнае як далячынь палёў і азёрныя блакіты то звонкае і пералівістае як празрыстыя крыніцы і песні птушак (А. Крывіцкі). 4) І гэты малады хвойнік і гэты лес і гэтыя хвоі зліваліся ў адну сцяну лесу вырысоўваючы прыгожую вычварную лінію паваротаў разгортваючы сваё цёмна-зялёнае



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

крыло і ахопліваючы пясчанае поле (Я. Колас). 5) Там над градою плывуць беспрытульныя халодныя хмары (П. Пестрак). 6) Невялікая ў памерах яна [Спаса-Ефрасіннеўская царква] здзіўляе манументальнасцю і гарманічнасцю форм. У гэтай царкве захоўваўся ўнікальны па свайму мастацкаму выкананню абкладзены тонкімі лістамі золата і серабра упрыгожаны каштоўнымі камянямі мініяцюрнымі малюнкамі і надпісамі крыж зроблены ў 1161 годзе мясцовым майстрам-ювелірам Лазарам Богшам (Т. Хадкевіч). 7) На краі дзялянкі ўзвышаецца стары волат-дуб самы магчыма стары ў гэтым гаі (І. Шамякін). 8) Ён [лес] сніцца мне па начах то разгневаны нечым сярдзіты то ціхі лагодны быццам родная маці (Б. Сачанка). 9) І тры дні засцячы каламутнай імглою свет шалеў раз'юшаны вецер белымі косамі змятаў з неба дробны снег а на крутых грудах выветрываў сухі пясок (В. Адамчык). 10) Як сведчыць Галіцка-Валынскі летапіс, горад Камянец быў заснаваны ў 1276 годзе валынскім князем Уладзімірам Васількавічам – "вялікім кніжнікам і філосафам" (А. Бутэвіч). 11) Падняўшыся на заднія лапы мядзведзь доўга драпаў гліну пярэднімі але дацягнуцца да норак знізу таксама не мог (М. Звераў). 12) На вялікай паляне акаймаванай маладым бярэзнікам такавала каля дзясятка цецерукоў (М. Паслядовіч). 13) Чытаючы і перачытваючы творы Івана Антонавіча [Брыля] паглыбляючыся ў ягоную творчасць я кожны раз рабіў для сябе прыемныя адкрыцці (А. Казлоў). 14) Як сведчыць Галіцка-Валынскі летапіс горад Камянец быў заснаваны ў 1276 годзе валынскім князем Уладзімірам Васількавічам "вялікім кніжнікам і філосафам" (А. Бутэвіч). 15) Нядаўна яшчэ лагоднае блакітнае возера зрабілася змрочным цёмна-шызым пакрылася высокімі сярдзітымі хвалямі (В. Вольскі). 16) Атуленае садамі і прысадамі яно [мястэчка] уяўляецца зялёным вострававам сярод залацістага збожжавага разліву (І. Навуменка). 17) За бясконцымі шарэнгамі родных слоў у кнігах перад нашым зрокам праходзіць уся зямля яе разнастайная прыгажосць яе шматвяковая гісторыя (А. Крывіцкі). 18) У задушлівым сутарэнні ледзьве асветленым мігатліваю лямпаю было цесна і сыра як у магільным склепе (У. Арлоў). 19) За невялікім ляском вясёлым і светлым ад беланогіх бяроз стаіць мая родная вёска Славінск (В. Дайліда). 20) Такім чынам мы нараджаемся на зямлі пройдзем па ёй пакінуўшы спадзяёмся выразны след а праз нейкі час навечна адыдзем у яе мацярынскае ўлонне (Я. Крук).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

**Просты ўскладнены сказ.** ***Кантрольны тэст***

***Частка А***

***А1. Адзначце сказы, у якіх правільна пастаўлены працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам.***

1) На вайне амаль кожны выйгрыш – вынік звышчалавечых намаганняў (А. Марціновіч).

2) Гэта свята душы – сады садзіць (У. Рубанаў).

3) Жыццё – гэта барацьба.

4) Адзін у полі – не воін (прыказка).

5) Людзі – заўсёды дакладная копія свайго часу (М. Зяньковіч).

***А2. Адзначце сказы, у якіх правільна пастаўлены працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам.***

1) Азёры – вынік дзейнасці ледавіка (В. Вітка).

2) Пешы коннаму – не таварыш (прыказка).

3) Хлеб – вось што галоўнае ў жыцці ў чалавека (Я. Колас).

4) Юрка ўжо – амаль афіцэр (І. Сяркоў).

5) Жыта – як сцяна.

***А3. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пры аднародных членах пастаўлены правільна.***

1) Астап, хаця задужа і выхваляўся дачкой, але ж і ганарыўся ёю (М. Лынькоў).

2) Душу сціскае болем не то смутак, не то жаль (Я. Колас).

3) У гэтай вадзяной зараслі хавалася рыба або адпачывала пасля жыравання ці проста ратавалася ад сваіх заклятых ворагаў, ад шчупакоў або акунёў (Я. Колас).

4) Быў дастатак поўны ў хаце і парадак, і спакой (А. Астрэйка).

5) Ускалыхнуўся і мякка, і густа зашумеў лес (В. Адамчык).

***А4. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пры аднародных членах пастаўлены правільна.***

1) Ляжыць Міколка ні жывы, ні мёртвы і толькі чуе, як моцна б’ецца ды вырываецца з грудзей яго маленькае сэрца (М. Лынькоў).

2) Вера Максімаўна прымярала ўжо шосты ці сёмы ўбор, прымярала калі не абыякава, дык вельмі спакойна (С. Бязлепкіна).

3) Майскае сонца высока стаяла ў ясным небе, кідала на зямлю снапы гарачага прамення, і залівала асляпляльным бляскам увесь свет (Я. Колас).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

4) Барвовасць, ды блакіт, ды бель садоў расквецілі, нібы вясёлкай, далі (А. Астрэйка).

5) На сцяне віселі два пейзажы: вадзяны млын пад развесістай вярбой і статак кароў і авечак на лузе (І. Навуменка).

***А5. Адзначце сказы, у якіх прапушчаны знакі прыпынку пры аднародных членах.***

1) Вясною выбілася з зямлі тоненькая чырванаватая травінка (Я. Колас).

2) Падарыла восень людзям яшчэ некалькі ясных светлых і цёплых дзён (Я. Колас).

3) На паверхню выплыў вялікі залацісты ад сонца карп (А. Стаховіч).

4) Часова змайстраваныя дашчатыя падмосткі павінны былі замяняць сцэну (П. Броўка).

5) Успомніліся і тыя шырокія роўныя дагледжаныя і абсаджаныя гасцінцы, што бягуць па беларускай зямлі (Ф. Янкоўскі).

***А6. Адзначце сказы, у якіх перад злучнікам <u>і</u> трэба паставіць коску.***

1) Вецер прабіваўся праз вокны і сцены _ і разгульваў па пакоях вольна, як гаспадар (Я. Колас).

2) Расцвітае _ і вяне, і зноў зацвітае валошка (Я. Брыль).

3) Прырода ўмее гаварыць _ і ствараць і настрой, і лагоду (Я. Скрыган).

4) Як у люстэрка, глядзішся ты ў прыроду, чалавек, і бярэш ад яе душэўнасць _ і ласку, і мудрасць (Я. Скрыган).

5) У небе з-за хмар прарэзаўся востры краёчак сонца _ і бліснуў на абшар знянацкім святлом (В. Быкаў).

***А7. Адзначце сказы, у якіх на месцы ўсіх пропускаў трэба ставіць коскі.***

1) На ўсім ляжыць сіняваты слой смугі _ не то дыму _ не то туману (Я. Колас).

2) Перад хмарай хутка імчаліся ў бледным _ задымленым _ бязрадасным небе круглыя _ цёмныя воблачкі (Э. Самуйлёнак).

3) Ён [Берман] выявіўся выключным знаўцам старажытнай _ драўлянай скульптуры _ і шкла (У. Караткевіч).

4) Надзвычай роўныя і высокія сосны-прыгажуні гойдаліся ад ветру _ рыпелі _ і аднастайна _ і ласкава шумелі сваімі верхавінамі (І. Шамякін).

5) Бывалі тут і дразды _ і сарокі _ і іншыя птушкі (І. Сіляўка).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***А8. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць двукроп'е.***

1) У матулі стол не пустуе – чым багата, тым і частуе _ пірагом, верашчакаю, сырам, ды смятанай, ды позіркам шчырым (Д. Бічэль-Загнетава).

2) Дзяцінства, маладосць, юнацтва, сілы, здароўе _ словам, усё аддавалася зямлі (П. Галавач).

3) З 1786 года пры [Ружанскім] палацы працавалі _ невялікая фабрыка шаўковых паясоў, шпалераў, абрусаў з гербамі і суконная фабрыка (В. Супрун).

4) Ручнік часам сумяшчаў у сабе некалькі функцый _ эстэтычную, знакавую, ахоўную, дароўную (В. Фадзеева).

5) Вечарам Люба стала прыбіраць у хаце _ месці, мыць, чысціць, выносіць і прыносіць (К. Чорны).

***А9. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пры азначэннях пастаўлены правільна.***

1) Пахла зямля, багата акропленая расою (Я. Колас).

2) Даверліва цягнуліся да цёплых промняў набрынялыя вільгаццю травы, кветкі, лістота дрэў (А. Рыбак).

3) Непаваротлівы з выгляду, зубр у хвіліны злосці надзвычай небяспечны для чалавека (В. Вольскі).

4) Змораныя мы ледзь ішлі (І. Грамовіч).

5) Побач чыгункі стаяў высокі стары лес, таемны, пануры і важны (Я. Колас).

***А10. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пры азначэннях пастаўлены няправільна.***

1) Паабапал дарогі было поле жоўтае ад іржышча (К. Чорны).

2) Заўсёды смелы і вясёлы Мікола штосьці засумаваў (М. Хведаровіч).

3) Стаяла вясна, дружная, цёплая, з дажджамі і навальніцамі (А. Асіпенка).

4) Знямелы, пануры, суровы, сядзіць Іван Гурба на пні (Я. Колас).

5) Заняты сваімі гарадскімі клопатамі Віктар рэдка наведваўся ў сваю родную вёску (Я. Сіпакоў).

***А11. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пры прыдатках пастаўлены правільна.***

1) Беларусь сардэчна вітае дарагіх гасцей – пасланцоў усіх народаў славянскай сябрыны (С. Законнікаў).

2) У беларускіх лясах гняздзіцца жаўна, або чорны дзяцел (В. Вольскі).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) У хаце страшыні калгаса Кастуся Вераб'я гаварылі доўга (П. Пестрак).

4) Весялун і спявак кравец любіў песні (К. Крапіва).

5) Настаўнік яшчэ зусім малады хлопец ледзь усміхаўся сам сабе (Я. Колас).

***А12. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пры прыдатках пастаўлены няправільна.***

1) Стары каваль па прозвішчы Дубовік гартаваў сякеру (П. Пестрак).

2) Самай выдатнай фігурай Адраджэння быў Францыск Скарына сын купца з полацка (У. Караткевіч).

3) Трыглы, або марскія пеўні, кукарэкаюць так гучна, што хоць вушы затыкай (А. Матрунёнак).

4) Сын Якуба Коласа Юра Міцкевіч скончыў геаграфічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (М. Корзун).

5) Вось і май падышоў неўпрыкметкі, зноў рассыпаны ля берагоў адуванчыкі – рыжыя кветкі, залатыя вяснушкі лугоў (П. Панчанка).

***А13. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць знакі прыпынку.***

1) Высокі акамянелы вал, зарослы высмаленай ад сонца травой і вышчарблены мінамі непрыяцеля _ як раней, так і цяпер горда трымае на сваіх магутных плячах даўніну (У. Галубок).

2) Ёсць такі кіт нарвал _ або адзінарог, які мае даўжыню да шасці метраў (Л. Левановіч).

3) Рака паводкаю раве, па ёй у леташняй палонцы услед за крыгамі плыве _ у Волзе вымытае сонца (С. Грахоўскі).

4) Густа ўсеянае зоркамі _ неба яшчэ не святлела на ўсходзе (І. Шамякін).

5) Старажытныя людзі абазначалі сонца, золата і хлеб на пісьме адным і тым жа знакам _ кружком з кропкай пасярэдзіне (М. Корзун).

***А14. Адзначце сказы, у якіх акалічнасці трэба выдзеліць коскамі.***

1) Едучы з работы дадому Высоцкі таксама спыніўся каля бярозак (А. Кулакоўскі).

2) Адгрымелі ліпеньскія і жнівеньскія навальніцы гучна адспяваўшы песні лету (Я. Колас).

3) Нумар тэлефона я запомню і не запісваючы (В. Гігевіч).

4) Спорна і не спыняючыся ліў дождж (У. Караткевіч).

5) Гуляючы розуму не прыдбаеш (прыказка).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***А15. Адзначце сказы, у якіх акалічнасці трэба выдзеліць коскамі.***

1) Сціхнуўшы на хвіліну вецер накідваецца на дрэвы з новай сілай (з часопіса “Родная прырода”).

2) Нізкія воблакі шчодра пасыпаўшы снегам зямлю падняліся вышэй (Я. Колас).

3) Стары пайшоў нават не адпачыўшы як след (К. Чорны).

4) Дзед Талаш ідзе не спяшаючыся (Я. Колас)

5) Белкі спрытна зрываюць сухія шышкі ды спяшаючыся нясуць іх у свае гнёзды (А. Якімовіч).

***А16. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пры акалічнасцях пастаўлены правільна.***

1) Праз момант промні чырвонага сонца зазіхацелі на пабеленай траве, надаючы ёй надзвычайную прыгажосць (Я. Крамко).

2) Асабіста я мог бы жыць прыпяваючы (М. Даніленка).

3) Ён не гаварыў, а махаючы рукамі, крычаў у натоўп (П. Пестрак).

4) Паліцаі трывожна пераглянуліся, а пачуўшы першыя выстралы, хутка пакінулі вёску (М. Лынькоў).

5) Крыжаносцы не без падставы бачылі ў Давыдзе Гарадзенскім свайго найбольш небяспечнага ворага і не маючы моцы знішчыць яго, вырашылі адпомсціць інакш (М. Багадзяж).

***А17. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пры дапаўненнях пастаўлены правільна.***

1) Алена мусіла выйсці на працу замест хворай сяброўкі.

2) Сямён жа не прэтэндаваў ні на што апроч хіба шклянкі віна ды кароценькай увагі да яго апавяданняў пра перажытае мінулае (В. Быкаў).

3) Увесь дзень за выключэннем перапынку на абед і снеданне быў прызначаны агляду калгаснай гаспадаркі.

4) Нешта было ў вачах дзяўчыны і акрамя прыгажосці (А. Чарнышэвіч).

5) У такіх жанчын, як Вольга, акрамя мацярынскага эгаізму ёсць яшчэ інтуіцыя і мудрасць (І. Шамякін).

***А18. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пры ўдакладняльных членах сказа пастаўлены правільна.***

1) Толькі тут, на мокрай сцежцы я змог добра разгледзець гэты домпалац (У. Караткевіч).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2) Яна [Марыя] міла ўсміхнулася на развітанне і хуценька выйшла праз незагароджаны, без веснічак, выхад на вуліцу (В. Быкаў).

3) Яшчэ зранку на другі дзень па Заборцах панеслася гутарка аб Сцёпку (Я. Колас).

4) Калісьці тут, каля Друці, паміж лясоў дрымучых, паўсотні згорбленых хацін стаяла па-над кручай (Х. Жычка).

5) Тут, у Ліпаўцы, была хвацкая зямля чарназём з чарназёмаў (С. Александровіч).

***А19. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна.***

1) Высока ў сінім бязвоблачным небе плыве яркае сонца, шчодра лье на зямлю сваю цеплыню і святло (І. Навуменка).

2) У той самы вечар гадзін каля дзесяці я ляжаў, схаваўшыся ў здзічэлым невысокім бэзе і высокай траве якраз каля паваленай агароджы (У. Караткевіч).

3) Рака пракапала сабе новае рэчышча там, на лугавым беразе, пакінуўшы тую абмялелую, але чыстую, не зарослую травою, старыцу (І. Шамякін).

4) Пад стрэшкай пчол гамоніць рой ды так ціха, ды так глуха! (Я. Колас).

5) Адтуль, аж з-пад самых хмар, падалі на зямлю нечыя крыкі не то заклікаючы чалавека паляцець за сабою, не то просячы ў яго дапамогі (І. Шамякін).

***А20. Адзначце сказы, у якіх на месцы ўсіх пропускаў трэба паставіць коскі.***

1) Лена апраўдвае сваіх выхаванцаў _ нават хлопцаў, усіх _ за выключэннем Толіка Шарэйкі (Я. Брыль).

2) І тчэ _ забыўшыся _ рука _ заміж персідскага ўзору _ цвяток радзімы васілька (М. Багдановіч).

3) Але цяпер _ гледзячы на строгі цвёрды твар маладой жанчыны _ на валасы яе _ сабраныя на патыліцы _ ён адчуваў _ акрамя вострага сораму _ яшчэ і незразумелую радасць (В. Іпатава).

4) На дварэ каля самай будкі _ замест стала _ стаяў высокі _ гладкі _ дубовы пень _ з роўна абрэзаным верхам (Я. Колас).

5) Але тут _ на самым краі светлай баравіны _ было суха _ цёпла ад зямлі _ нагрэтай сонцам _ густа ўсыпанай шорсткім шыгаллем і кволымі лусачкамі маладой _ сасновай кары (М. Стральцоў).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

***Частка В***

***В1. Адзначце нумары, дзе на месцы пропускаў трэба паставіць коску.***

1) Усюды[1] _ на балацінах[2] _ і ў хмызах[3] _ і на гарушках[4] _ і на клінах ворнай зямлі[5] _ ішла вялікая работа (Я. Пархута).

***В2. Устанавіце адпаведнасць паміж сказам і сінтаксічнай функцыяй у ім абагульняльнага слова.***

| | |
|---|---|
| А: Зялёны і блакітны, жоўты і аранжавы, сіні і пунсовы – усе колеры ўвабраў у сябе гэты паэтычны месяц, радасная пара абнаўлення (А. Курскоў). | 1. Дзейнік. |
| Б: Радасць і трывога, уздым і млявасць у сэрцы – усё змяшалася ў адчуваннях Паходні ў тую хвіліну (Т. Хадкевіч). | 2. Выказнік. |
| В: Яна ўзялася за работу: набрала бярэмя дроў, унесла ў хату і стала класці ў печ (К. Чорны). | 3. Дапаўненне. |
| Г: Усюды: і на балацінах, і ў хмызах, і на гарушках, і на клінах ворнай зямлі – ішла вялікая работа (Я. Пархута). | 4. Азначэнне. |
| Д: Бацька прыбраў з воза ўсё: плуг, барану, мяшкі з бульбай – і ўвайшоў у хату (М. Зарэцкі). | 5. Акалічнасць. |

***В3. Устанавіце адпаведнасць паміж сказам і разнавіднасцю канструкцый, якімі ён ускладнены (улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены).***

| | |
|---|---|
| А: Над хатай-леснічоўкай памалу займаецца ранне яснае паасенняму марознае але прыемнае і радаснае (У. Краўчанка). | 1. Сказ ускладнены адасобленым прыдаткам і адасобленым азначэннем, выражаным дзеепрыметнікавым зваротам. |
| Б: Жытнёвыя хвалі збягалі з узгорка набягалі адна на адну і разбіваючыся ў нізіне адступалі назад заспакоеныя на нейкі момант (І. Шамякін). | 2. Сказ ускладнены аднароднымі членамі сказа; адасобленай акалічнасцю, выражанай дзеепрыслоўным зваротам; адасобленым азначэннем, выражаным дзеепрыметнікавым зваротам. |
| В: Але і сядзець склаўшы рукі ды слухаць скаргі ды бедаваць таксама не метад (І. Мележ). | 3. Сказ ускладнены адасобленымі аднароднымі азначэннямі пасля абагульняльнага слова. |
| Г: Паклаўшы косы пад пакос і ўцёршы лоб і потны нос касцы падселі к кусту (К. Крапіва). | 4. Сказ ускладнены аднароднымі акалічнасцямі, выражанымі дзеепрыслоўнымі зваротамі. |
| Д: Палкоўнік у адстаўцы Андрэй Сяргеевіч Каралёў сышоў з дарогі і прысеў на бярозу паваленую ветрам (В. Хомчанка). | 5. Сказ ускладнены аднароднымі членамі сказа. |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***В4. Устанавіце адпаведнасць паміж адасобленым членам сказа і прычынай яго адасаблення (улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены).***

| | |
|---|---|
| А: Васіль як таленавіты музыка адразу пачуў фальш у гэтым гранні (В. Быкаў). | 1. У сказе няма адасобленых членаў сказа. |
| Б: Цяжкае халоднае свінцовае неба здавалася назаўсёды ўпала на зямлю (Я. Сіпакоў). | 2. Сказ ускладнены адасобленым прыдаткам, які мае акалічнаснае значэнне прычыны. |
| В: Тут жа выштурхнутая на бераг мноствам бурных прыбояў парахнее разбітая лодка (Я. Брыль). | 3. Сказ ускладнены адасобленым азначэннем, якое адносіцца да асабовага займенніка. |
| Г: Аслаблае лісце зрываецца з дрэў і павольна кружачыся бясшумна кладзецца на зямлю (Р. Ігнаценка). | 4. Сказ ускладнены адасобленай акалічнасцю, выражанай дзеепрыслоўным зваротам. |
| Д: Дзівоснае і чароўнае яно [возера Свіцязь] тым не менш захоўвае ў сабе многа таямнічага і нязведанага (Я. Сіпакоў). | 5. Сказ ускладнены адасобленым азначэннем, аддаленым ад азначаемага слова іншымі членамі сказа. |

***В5. Устанавіце адпаведнасць паміж сказамі і прычынамі пастаноўкі на месцы пропускаў неабходных знакаў прыпынку.***

| | |
|---|---|
| А: Крынічкі_ ціхія крынічкі_ як я люблю вас, як люблю! (К. Кірэенка). | 1. Коскамі выдзяляецца зваротак. |
| Б: Мост не знае_ адкуль яму знаць?_ што не будзе Пятлянка пад ім булькатаць (А. Куляшоў). | 2. Коскамі выдзяляецца пабочная канструкцыя. |
| В: Сцепанідзе_ відаць_ надакучыла чакаць (А. Асіпенка). | 3. Коскамі выдзяляецца ўстаўная канструкцыя. |
| Г: Бадай_ ля самага акна расце вялікая бяроза (В. Вольскі). | 4. Дужкамі выдзяляецца ўдакладняльны член сказа. |
| | 5. Знакамі прыпынку не выдзяляецца. |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## СКЛАДАНЫ СКАЗ.
## ПУНКТУАЦЫЯ СКЛАДАНАГА СКАЗА

***Практыкаванне 40. Прачытайце тэкст. Выпішыце складаныя сказы. Вызначце іх тыпы.***

**Шчасце**

Быў адзін з тых летніх дзён, якія бываюць, мусіць, толькі на Беларусі. Сонца пячэ, а гарачыні няма: лішак яе паглынаюць і рака, і зараснікі аеру ды чароту, і густыя паплавы, і непралазны алешнік ды лазняк. Зеляніна, што жыве навакол, запаўняе не толькі прыроду, але і душу чалавека.

Усім радасна ў такі дзень. Радасна і мне. Радасна і вунь таму хлапчуку год васьмі, што спускаецца з гары, падскокваючы на аднойназе ды махаючы белым дубцом.

Мы сустракаемся з ім на мосце. Ён прыпыняецца і глядзіць на мяне так, нібы хоча нешта сказаць. Радасць, шчасце так і пырскаюць з яго блакітных вачэй. Я разумею яго. Калі я гатоў усіх абняць у гэты дзень, дык што ж павінна адбывацца ў яго маленькім чыстым сэрцы? Я лагодна ўсміхаюся яму і кажу:

– Добра жыць на свеце, браток, га?

Тварык хлопчыка засвяціўся яшчэ больш, але ён нічога не сказаў. Мы і без слоў разумелі адзін аднаго.

Я паціху ішоў міма, а хлопчык, нібы той сланечнік, паварочваў следам за мной свой круглы тварык. З вачэй яго пырскала шчасце, і здавалася, што ён вось-вось нешта скажа. Скажа, што надта прыемна ў такі дзень басанож скакаць па мосце ды махаць свежым дубцом, што ўвесь свет вельмі прыгожы, што дзядзька, якога ён сустрэў на мосце, таксама прыгожы і добры, ды і наогул усе дзядзькі і цёткі прыгожыя і добрыя… Ён нічога не казаў толькі таму, што не ўмеў выказаць такіх думак і пачуццяў. Ды яно і не трэба было. Я і так усё разумеў. Хіба я сам калісьці не быў такім, як ён? Хіба я сам не адчуваў радасці жыцця?

Я яго разумеў. Але ён, відаць, гэтага не ведаў, бо ўсё глядзеў мне ў вочы, нібы чагосьці чакаючы. Ён заліваў мяне сваім шчасцем, а я ў адказ нічога не мог яму даць. Для яго маёй шчырай і ветлівай усмешкі было мала. Мне трэба яму нешта сказаць. Але што? Што яму сказаць, каб перадаць усю тую цеплыню, якую я да яго адчуваю? Мне засталося ступіць толькі адзін крок – і мы размінёмся. Размінёмся, можа, навекі.

– Як цябе зваць? – сказаў я нарэшце, каб толькі не маўчаць.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сказаў і зараз жа пачырванеў ад сораму: хлопчык нічога мне не адказаў. Сваім дзіцячым інстынктам ён, відаць, зразумеў, што словы гэтыя сказаны так сабе, абы сказаць. Мала таго: твар яго перастаў свяціцца, нават неяк балюча скрывіўся. А потым… потым з грудзей яго вырваўся крык!..

Гэта быў шчыры, мімавольны крык дзіцячай душы. У ім былі і крыўда, і расчараванне, і надзея, і горкі папрок…

Два словы толькі было ў гэтым крыку:

– Дзядзька! Шапка!..

У хлопчыка на галаве была новая шапка, якую ён надзеў, відаць, першы раз. Добрая шапка, шэрая, каляная. Яна ахапіла не толькі галаву хлопчыка, але ўсё цела і душу. Гэта ж праз яе сёння такі цудоўны дзень, а я гэтага не ведаў. І сонца так шчодра свеціць толькі дзеля таго, каб усе здалёк маглі бачыць шапку, а я не заўважыў яе і зблізку. Адзін, усяго толькі адзін крок заставалася зрабіць – і ўся сустрэча пайшла б прахам. Ці магла чулая дзіцячая душа сцярпець такую несправядлівасць, такое халоднае бяздушша?

І яна не сцярпела…

Я адчуў сябе вельмі вінаватым і кінуўся выпраўляць сваю віну.

– Ах, якая цудоўная ў цябе шапка! – крыкнуў я. – Пакажы, пакажы!

Вочы хлопчыка зноў засвяціліся радасцю.

Я зняў з яго галавы шапку. Яна сапраўды хрусцела, як бляшаная.

Хлопчык глядзеў на мяне ўдзячнымі вачыма, бы на свайго збаўцу.

– Які казырок! І шнурок! І гузікі два! – стараўся я. – А падкладка якая цудоўная! Хто купіў?

– Мамка! – з гордасцю адказаў хлопчык.

Несправядлівасць была выпраўлена.

*Паводле Я. Маўра*

***Практыкаванне 41. Прачытайце сказы. Выпішыце спачатку простыя, затым складаныя сказы. Падкрэсліце граматычныя асновы. Вызначце тыпы складаных сказаў.***

1) Міф пра літоўскую заваёву Беларусі быў створаны яшчэ ў 16 стагоддзі і звязаны з імкненнем вялікіх князёў маскоўскіх давесці іхнія правы на землі Украіны і Беларусі (А. Грыцкевіч). 2) Пад паветкай стаялі канапка, варштат, ляжалі акуратна складзеныя дошкі, на сцяне віселі розныя сталярскія інструменты: пілкі, гэблі, цыркулі, стамескі (І. Шамякін). 3) Алені былі свойскія і з ахвотай бралі з Петрусёвых рук кавалачкі хлеба,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

яблыка (Т. Хадкевіч). 4) Снег асядаў, мяшаўся з гразёю, і ўсё вакол рабілася зноў будзённым і шэрым (Х. Лялько). 5) Ідзе Сцёпка то чыгункаю, то вузенькаю сцежкаю, мінае чырвоныя домікі будачнікаў, пераезды, купкі дрэў, а перад ім раскрываюцца ўсё новыя малюнкі незнаёмых краявідаў (Я. Колас). 6) У чэрвені дні становяцца зусім доўгімі і зусім кароткімі цёплыя і духмяныя ночы (з часопіса "Родная прырода"). 7) Дарога была пустэльная і ціхая, лес поўніўся птушыным поўнагалоссем (Т. Хадкевіч). 8) Сяргей любіў хадзіць няспешна, заглядваючы пад кожнае дрэўца, пад кожны кусцік, і без грыбоў амаль ніколі не вяртаўся (А. Вараповіч). 9) Сцежка ведае сама, як ёй весціся (А. Разанаў). 10) Цёхкае салавей, прысвіствае дрозд (Б. Сачанка). 11) Ужо ўзышло сонца, і мне ўсё відаць было вельмі добра (М. Паслядовіч). 12) Сяргей стаяў пад бярозамі і любаваўся гэтымі знаёмымі, але сёння чамусьці асабліва ўрачыстымі і светлымі мясцінамі і ўсміхаўся сам сабе (А. Вараповіч). 13) Дзень быў ясны, горача прыпякала сонца, але ў лесе адчувалася прыемная прахалода (Т. Хадкевіч). 14) У Карэліцкім раёне, што на Гродзеншчыне, геолагі знайшлі жалезную руду (М. Шыманскі). 15) Соф'я затрымала спакойны пагляд на Ігнаце, і ён уразіўся, як гэтая маленькая жанчына валодае сабой пасля арышту каханага (У. Арлоў). 16) Таня, абхапіўшы калені рукамі і падцягнуўшы іх да самага падбародка, сядзела на кваціcтай даматканай посцілцы, разасланай амаль над самым абрывам, і задуменна глядзела праз рэчку на лес (А. Казаннікаў). 17) Час нібыта спыніўся, а можа, паплыў у адваротны бок, ператварыўшы гаману натоўпу ў гулкую цішыню, і ў ёй загучаў паланез (У. Арлоў). 18) Вырыўшы пасярод узгорка, між ствалоў вольхі, яму, ён бабёр стварае дно і сценкі логава, а зверху кладзе тоўстыя, ачышчаныя ад кары палкі, робячы над логавам скляпенне (В. Вольскі). 19) Як сведчыць Галіцка-Валынскі летапіс, горад Камянец быў заснаваны ў 1276 годзе валынскім князем Уладзімірам Васількавічам – "вялікім кніжнікам і філосафам" (А. Бутэвіч). 20) Перад хатай не было кветніка, а раслі два маладыя, падобныя адзін да аднаго клёны з выглянцаванымі камянямі (І. Шамякін).

## Складаназлучаныя сказы

***Практыкаванне 41. Прачытайце складаназлучаныя сказы. Вызначце іх тыпы паводле суадносін паміж часткамі. Патлумачце наяўнасць або адсутнасць знакаў прыпынку паміж часткамі складаназлучанага сказа.***



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

I. 1) Згушчалася смала, і яе пах змешваўся з вільгаццю (М. Капыловіч). 2) Вось бацькоўскі домік з высокім ганкам, а за домікам пасаджаны садок (А. Кулакоўскі). 3) Або ён [салавей] прыляціць у іхні садок, саўе там гняздзечка, або абсталюецца ў школьным садзе, а спевы яго будуць усё роўна чуваць навокал (А. Кулакоўскі). 4) Дарога была пустэльная і ціхая, затое лес поўніўся птушыным рознагалоссем (Т. Хадкевіч). 5) І ён [кароль Стах] піў і пацяшаўся з панам Раманам і іншымі панамі, а паноў тых было, можа, сотня і яшчэ тры дзясяткі (У. Караткевіч). 6) Мабыць, з дрэва на дрэва пераскоквала вавёрка або асцярожна перамяшчалася драпежніца-рысь (Т. Хадкевіч). 7) Зрэдку фыркалі коні, але і тыя заціхалі (А. Ненадавец). 8) Неўзабаве луг уквеціўся людскімі постацямі і пракосы, роўныя і шырокія, ляглі ўпоперак яго (І. Шамякін). 9) Успыхне бліскавіца, асвеціць залацістыя краі воблакаў – і зноў змрок (І. Грамовіч). 10) Лісце бераслету зрабілася васковым, і толькі рэдкія пацеркі ягад здзіўлена пазіралі на свет сваімі чорнымі бліскучымі вочкамі (М. Паслядовіч). 11) Толькі вялізнае вогнішча дымілася тысячамі маленькіх дымкоў ды дзе-нідзе вынікаў агеньчык сярод абгарэлай палянкі, раздзьмуханы ветрам (Я. Колас). 12) Цякуць рэкі ў моры, і вырастаюць дрэвы. Цякуць, як рэкі, дарогі па зямлі, і на сініх лугах маленства вырастаюць надзеі. І вырастае радасць. І Млечны Шлях сплывае ў вечнасць, і ляцяць, і ляцяць сваёю млечнай дарогай над вясновай зямлёй журавы (М. Стральцоў). 13) То тут, то там будаваліся пільні, смалакурні, а затым вырас і завод (Б. Сачанка). 14) У назве свята Грамніцы чуецца магутная сіла вясеннелетняга стану прыроды, але святкуецца яно 15 лютага (І. Крук). 15) Ішлі толькі бежанцы ды адступалі абозы (А. Асіпенка). 16) Ці то стогне бура ці віхор гуляе (Я. Купала). 17) Колькі шуму і колькі смеху! (А. Пысін). 18) Для нас цвітуць сады і агароды і жытнія звісаюць каласы (Я. Колас). 19) Яшчэ хвіліна – і вы ўжо за горадам (Я. Сіпакоў). 20) Марыя збірала са сталоў пакінуты ўчора посуд і сама насіла на кухню (П. Пестрак).

II. 1) Лес раптам парадзеў, і я ўбачыў лясную хатку (М. Капыловіч). 2) Над палямі стаіць толькі песня, а жаўранка як быццам і няма (Я. Брыль). 3) Князі полацкія то выступалі супраць Ноўгарада, то вялі бясконцую спрэчку з Кіевам, то на іх саміх нападалі князі амаль усёй Русі (Т. Хадкевіч). 4) Манера паводзін [беларуса] вызначаецца павольнасцю, стрыманасцю, але стрыманасць беларуса да пары (У. Караткевіч). 5) Зноў тужліва закігікала на бліжнім балоце кнігаўка і высока ў небе дробненька замаркатаў бакас (М. Паслядовіч). 6) Зімою трашчыць уно-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чы на рэках лёд, і гул ідзе высока, аж да неба, а раніцай ляжаць снягі, ружовыя і чыстыя, як радасць (М. Стральцоў). 7) Па начах яшчэ трашчаць вострыя маразы і шалёныя завірухі намятаюць снегу па самыя вокны (В. Дайліда). 8) Ёсць свае карані і ў кожнага з нас, і ўваходзяць яны ў глыбіню стагоддзяў (Б. Сачанка). 9) Возера зноў зрабілася ціхае і спакойнае, а вада чыстая і празрыстая (В. Вольскі). 10) Сёлета гаёк таксама быў прыгожы, але прыгажосць гэта была зусім іншая (А. Кандрусевіч). 11) У гэты час за нахіленай Кацінай спінай адчыняюцца дзверы і ў воблаку сцюжы цераз парог імкліва пераступае нехта ў густа заінелым шынялі (В. Быкаў). 12) Адкуль у яго [М. Фінберга] столькі душэўных сіл і адкуль такая амаль фантастычная любоў да музыкі? (з часопіса "Маладосць"). 13) Дзед замоўк – і на момант стала ціха (В. Каваль). 14) Бондар усё роўна не патрапіў бы выказаць словам сваіх пачуццяў і сам толькі туманна разумеў прычыны сваіх імкненняў (З. Бядуля). 15) Як часта мы збіраліся па вечарах і якія цікавыя былі размовы! (І. Навуменка). 16) Мора ціха песцілася пад сонцам, а на пустынным голым беразе, нервова смыкаючы шыйкамі, мітусіліся два шэранькія кулічкі (В. Хомчанка). 17) Штосьці стукнула, звякнула – і ўміг стала цёмна (В. Быкаў). 18) Бацька ціха пастукаў у дзверы, аднак з пакоя ніхто не азваўся (І. Навуменка). 19) Ледзь прыкметна гусцее блакіт неба, і не так балюча слепіць вочы бялюткі снег (М. Стральцоў). 20) Знікаюць вёскі, а на іх месцы нараджаюцца шумныя, вясёлыя гарады… (В. Бялоў).

***Практыкаванне 43. Спішыце сказы. Расстаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Патлумачце свой выбар.***

I. 1) Вада ўсё роўна выбіваецца наверх і тады з'яўляюцца наплывы трэшчыны (З. Бяспалы). 2) Зосю паклікалі ў хату і дзяўчаты пачалі разыходзіцца (А. Асіпенка). 3) Цеплыня не хацела яшчэ здавацца але і холад з кожным днём усё мацнеў (Я. Сіпакоў). 4) Аднекуль дыхнуў ветрык і загаманілі маладыя дубы як бы вітаючы свайго гаспадара (І. Шамякін). 5) Лысы пагорак зелянеў маладой рунню і канава на імшары таксама зелянела ад асакі а вярба за ноч пажаўцела (А. Асіпенка). 6) Ад каляд сонца паварочвае на лета а за доўгую зіму голад па сонцы трывожыць чалавечую душу (Л. Дайнека). 7) Бацька не прыехаў яшчэ з палявання і Прадслава адзінока сядзела ў сваёй прасторнай па-візантыйску абстаўленай святліцы (В. Іпатава). 8) Потым відаць пры Туру была насыпана штучная гара і пабудаваны вялікі для таго часу і добра ўмацаваны абарончымі прыстасаваннямі замак (В. Вольскі). 9) Яшчэ



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

некалькі дзён і прачнецца бярозавік. Праткні кару і з яе як слязінкі пырснуць светлыя кропелькі (з часопіса “Родная прырода”). 10) Вецер калыхаў высокія жоўтыя сосны і яны шумелі несціхана вакол заставы пасля супакойваліся і ціха шапталі пра нешта сваё таемнае і адвечнае (М. Плотнікаў). 11) Нездарма нашы далёкія продкі называлі Кірылу Тураўскага Златавустам і сучасныя вучоныя ставяць яго ў адзін рад з безыменным стваральнікам “Слова аб палку Ігаравым” (А. Петрашкевіч). 12) Вячка стаяў на забаролах і не сціхаў дождж і шумеў вецер і рака ў сваім адвечным руху да мора спявала дзікую ўрачыста-журботную песню (Л. Дайнека). 13) Сонца ўжо прысеела на кароткую часіну на самым крайку далягляду але святло яго яшчэ яркае і высокае стаяла над зямлёю (А. Жук). 14) На сцяне ходзікі няўтомна клююць цішыню і паўзуць адна другую абганяючы стрэлкі (Я. Скрыган). 15) Навокал сінелі лясы ды горбіліся ад іржышча ўзгоркі (К. Чорны). 16) Ён лёгка павёў левай рукой і палілася песня (І. Шамякін). 17) І шумяць-гамоняць лясы на крутых берагах а па адхонных схілах гуллівымі чародкамі збягаюць бярозкі (Т. Хадкевіч). 18) Тут у Альбуці загарэлася ў сэрцы Коласа паэтычная іскра і ніякія ліхалецці жыцця не змаглі яе пагасіць (С. Александровіч). 19) Якім спыніў каня і сам стаў азірацца навокал (К. Чорны). 20) А з’ясі ты з бульбай скварку і работа пойдзе шпарка (А. Русак).

II. 1) Дождж растапіў снег і цяпер на лёдзе стаяла падсіненая вада (А. Асіпенка). 2) Днём яшчэ было цёпла а пад вечар апусцелая няласкавая зямля стыла на холадзе (І. Мележ). 3) Не раз перабудоўвалася Сафія і сённяшняе яе аблічча радуе вока і ўсяляе павагу і гонар (Н. Гальпяровіч). 4) Пісаць і друкавацца на роднай мове можна забараніць а як забароніш на ёй думаць і гаварыць? (Я. Сіпакоў). 5) Гарэзлівы Пераплут падносіў чалавеку чару з хмельным мёдам і дарыў весялосць а вогненны Жыжаль сagраваў агнём і дапамагаў кавалям (У. Арлоў). 6) Многа вады ў возера ўпадае затое выпадае адзіная рачулка (А. Ненадавец). 7) Уночы быў вецер і дождж і шмат атраслося недаспелых антонавак вішнёвак і бэраў. А назаўтра ў нядзелю з самага ранку расчысцілася неба і сонца пачало прасушваць зямлю. Атрэсеныя яблыкі і грушы насыпаны былі ў сенцах каля сцен і пахлі на ўсе сенцы і хату (К. Чорны). 8) У 1921 годзе ў ліку іншых манастырскіх каштоўнасцяў крыж [Ефрасінні Полацкай] быў рэквізаваны і сляды яго на некаторы час згубіліся (У. Арлоў). 9) У такіх месцах раней ставіліся крыжы або ўзводзіліся капліцы (Л. Дучыц). 10) У тысяча дзевяцьсот дзевяноста трэцім годзе ЮНЕСКА



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ўключыла яго [запаведнік Белавежская пушча] у спіс біясферных запаведнікаў свету а годам раней Міжнародны камітэт сусветнай спадчыны на сваёй сесіі абвясціў нашу пушчу аб'ектам сусветнай спадчыны чалавецтва (Я. Сіпакоў). 11) Лес загаманіў пад праменнямі сонца а ўвечары сабраліся хмары і хлынуў цёплы і шумлівы дождж (М. Капыловіч). 12) Неба абложанае бялявымі хмарамі здавалася ніжэй навісла над зямлёй і пышныя сняжынкі падалі на гэты высокі лес і дарогу (А. Пальчэўскі). 13) Цяпер ліпцы было прасторна і яна расла дужэла (А. Пальчэўскі). 14) Рака плёскалася віравала няспынна а за спіной быццам тысячы жывых істот варушыўся лазняк (І. Шамякін). 15) Калінікалі праляціць з піскам кажан або пракрычыць сава ці прашугаюць чарадою спалоханыя птушкі (І. Гурскі). 16) Сонца будзе свяціць і трава зеляніцца (В. Каваль). 17) Раздаўся зычны гук і сухая галінка разляцелася на кавалкі (Я. Маўр). 18) Ці то сонца свеціць ці то месяц ясны вам смяецца з неба весела і шчасна (Я. Купала). 20) Яшчэ некалькі секунд і Максім знікне за разлапістым клёнам (М. Южык).

***Практыкаванне 44. Зрабіце поўны сінтаксічны разбор складаназлучаных сказаў у наступным парадку:***

***1) падзяліце на часткі;***

***2) вызначце ў кожнай частцы граматычную аснову;***

***3) укажыце тып складанага сказа;***

***4) вызначце від адносін паміж часткамі (спалучальныя, супастаўляльныя, пералічальна-размеркавальныя, прычынна-выніковыя, далучальныя);***

***5) намалюйце схему сказа.***

Узор сінтаксічнага разбору складаназлучанага сказа

[1]Над возерам перакінула сваё каляровае карамысла вясёлка, але [2]радасны, бліскучы грыбны дождж усё яшчэ ішоў (В. Вольскі).

Сказ складаны, складаназлучаны, з супастаўляльнымі адносінамі паміж часткамі. Схема: […], але […]

[1]Толькі ледзь прыкметна пасвятлела неба і [2]памутнелі зоркі (М. Паслядовіч).

Сказ складаны, складаназлучаны, са спалучальнымі адносінамі паміж часткамі. Схема: […] і […]



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

I. 1) Па абодва бакі сучаснай мяжы з Латвіяй адбывалася змешванне крывічоў і латгалаў, а ў кірунку Мінска знаходзілася летапісная Літва (не блытаць з сучаснай Літвой) (Э. Зайкоўскі). 2) Вецер гуляў адталым голлем у густых кронах, і ўнізе, каля камлёў, пахла вільготным мохам і адсырэлай карой (Х. Лялько). 3) Многа вады ў возера ўпадала, затое выцякала ўсяго адзіная рачулка (А. Ненадавец). 4) Многа гаворана, ды мала сказана (прыказка). 5) Ці то стогне бура, ці віхор гуляе (Я. Купала). 6) Ён лёгка павёў левай рукой – і палілася песня (І. Шамякін). 7) На марозе ссівелі ажыны, і, згубіўшы жанчын і сяброў, я блукаў па бясконцых сцяжынках і цябе нечакана знайшоў (Н. Гальпяровіч). 8) Памалу гутарку мы распачалі, а шмат аб чым пагутарыць было (Я. Купала). 9) І туман адпаўзае ў дрыгву клубамі, і жывіцаю пахне спрадвечны бор (У. Караткевіч). 10) То падніmaліся Карпаты, то мчаў Дунай удалячынь (П. Броўка).

II. 1) Дачка Зося спіць на верхняй полцы, а маці ціхенька сядзіць каля акна на ніжняй (А. Пальчэўскі). 2) Прырода ажывала, і з кожным днём усё смялей і ўладарней разнімала свае абдымкі вясна (Х. Лялько). 3) Грымела цяпер бесперапынна, але раскаты грому прыглушаліся шумам ліўня (Т. Хадкевіч). 4) Дом зрабіўся родным домам, а ў родным доме ўсё блізкае і знаёмае (А. Якімовіч). 5) Тыдзень, другі – і яны будуць у Маскве (М. Лынькоў). 6) Або птушак там не было, або яны проста не адважваліся падаваць голасу (Я. Колас). 7) Насустрач хмары паплылі, і стала ўраз цямней (А. Бачыла). 8) І хістаецца асока, і шуміць высокі бор, а ў душы не замаўкае струн вясёлых перабор (М. Багдановіч). 9) К ночы вецер памалу сціхаў, затое аднекуль з шумлівай цемрадзі пачаў накрапваць дождж (В. Быкаў). 10) Я хлеба ў багатых прасіў і маліў, яны ж мне каменні давалі (М. Багдановіч).

## Складаназалежныя сказы

***Практыкаванне 45. Выпішыце складаназалежныя сказы з адной даданай часткай. Вызначце тып даданай часткі.***

**Хахуля**

Гэты дзівосны звярок, які ацалеў да нашых дзён з далёкай геалагічнай эпохі, сустракаецца толькі ў Расіі, у басейнах рэк Волгі, Дона, Урала, і то не ўсюды. Ёсць звесткі, што калісьці ён вадзіўся і ў нас на Беларусі.Самыя блізкія яго суседзі – рыбы. А яшчэ выдра і бабёр, бо



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

хахуля – таксама вадзяны жыхар. Каб добра плаваць, у яе на задніх лапках паміж пальцамі ёсць скураныя перапонкі. Ну, а надзейным рулём служыць доўгі моцны хвост. Цікава і тое, што пыска хахулі выцягнута ў зграбны сімпатычны хабаток. Апранута яна ў густы пушысты кажушок, які не прамакае і добра засцерагае ад любога холаду.

У XIX і ў пачатку XX стагоддзя прыгожая іскрыстая шкурка зверка карысталася вялікім порспехам у модніц, таму яго амаль паўсюдна знішчылі. Потым сябры прыроды спахапіліся, пачалі ахоўваць і рассяляць хахулю. Галоўным чынам у запаведніках, дзе засталіся не кранутыя гаспадарчай дзейнасцю ціхія азёры, старыцы-рукавы колішніх рэчышчаў, зарослыя гарлачыкамі і лілеямі, аерам і чаротам. «Дзе карась – там і хахуля", – сцвярджалі ў даўніну знаўцы. Праўда, звярок – не надта ўдалы рыбалоў. З імклівай выдрай, здатнай упаляваць і плотку, і шчупака – яму не зраўняцца. Вясною або летам хахуля звычайна спажывае п'явак, апалонікаў, дажджавых чарвякоў, іншую драбязу. З надыходам зімы, калі жыццё замірае, звычайна падмацоўваецца карэньчыкамі раслін, багатымі спажыўным крухмалам. Часам пад тоўстым ледзяным панцырам ад недахопу паветра прападае шмат рыбы, тады «меню» хахулі выглядае больш разнастайным… Дарэчы, за адны суткі звярок з'ядае столькі, колькі важыць сам. Пагадзіцеся – неблагі апетыт!

Жывуць хахулі ў падземнай хатцы, выкапанай у беразе, там жа выводзяць і сваіх маленькіх дзіцянят. Лаз да жытла знаходзіцца пад вадою. У летнюю засуху, калі затока робіцца плыткай, а то і зусім перасыхае, зяркоў падсцерагае небяспека. На сушы яны зусім бездапаможныя, становяцца лёгкаю здабычаю нават для драпежных птушак. А ў веснавую паводку іхнія хаткі затапляюцца, і хахулі ратуюцца на высокім беразе. Так яны абжываюць новыя мясціны, хоць нярэдка гінуць у вымушаных вандроўках.

Нават не кожнаму зацятаму рыбаку шанцуе ўбачыць асцярожную хахулю. У пошуках спажывы яна звычайна актыўная на світанні ці вечаровымі прыцемкамі. І хоць зрок у жывёліны слабы, затое слых і нюх выдатныя найперш дзякуючы хабатку. Перад тым як падняцца на паверхню, звярок непрыкметна высоўвае яго з вады, паварочвае то ў адзін, то ў другі бок, прынюхваецца і прыслухоўваецца да наваколля. Адчуўшы штосьці падазронае, надоўга затойваецца пад раслінамі або ў момант хаваецца на дно.

Паводле энцыклапедычных дадзеных, двойчы, у 1955 і 1959 гадах, хахулю прывозілі ў нашу краіну і рассялялі ў басейне ракі Сож. Навасёл



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

спачатку няблага прыжыўся, пра што паведамлялася ў рэспубліканскіх газетах і часопісах. А затым на хахулю ўвогуле ўсе забыліся, і ў асвоеных мясцінах яна чамусьці звялася. Апошні раз звярка нібыта бачылі ў 1982 годзе на рацэ Пціч – левым прытоку Прыпяці.

Бяднее наша беларуская прырода. А значыць, бяднеем і мы, дарослыя і дзеці, усе грамадзяне Беларусі.

Хто ў тым вінаваты?

Няхай на гэтае пытанне кожны адкажа сабе сам.

*Паводле У. Ягоўдзіка*

***Практыкаванне 46. Прачытайце складаназалежныя сказы. Вызначце тыпы дадзеных частак. Патлумачце знакі прыпынку.***

I. 1) Шчаслівыя, святочна апранутыя яны [аднавяскоўцы] зусім не нагадвалі тых суседзяў, якіх бачыш штодзень (С. Давідовіч). 2) У ельніку пачало яснець, хоць неба было змрочнае і хмарнае (В. Быкаў). 3) Мартын імкнуўся выконваць даручэнне так, як рабіў бы сапраўдны партызан (Я. Колас). 4) У тоне Славікавага адказу была пашана да Машы, што той вельмі падабалася (І. Шамякін). 5) Той, хто мяркуе здалёку ці праз нейкі час, заўжды мяркуе болей разумна (В. Быкаў). 6) Рэчка разлілася так шырока, як не разлівалася ўжо шмат гадоў (І. Шамякін). 7) Вячка стаміўся за апошнія некалькі дзён, таму і заснуў так моцна (Л. Дайнека). 8) Калі ёсць многа, тады хочацца яшчэ больш (В. Быкаў). 9) Старыя шпакі, відавочна, практыкавалі маладых у лятанні, каб умацаваць іх крылы перад дарогай у вырай (Я. Колас). 10) Янка Маўр апублікаваў сваю першую аповесць “Чалавек ідзе”, калі яму было ўжо за сорак (Э. Гурэвіч). 11) Вось ужо і дзялянку пераязджаем, дзе восенню лес секлі (Г. Шуцько). 12) Васіль Аляксеевіч пастаяў, паглядзеў навокал, нібы шукаў каго вачыма, паставіў каўнер плашча, глыбей засунуў рукі ў кішэні (А. Жук). 13) Чым далей едзем мы на поўдзень, тым больш набывае навакольная мясцовасць знаёмае ўжо нам, характэрнае пасесскае аблічча (В. Вольскі). 14) Недалёка ад хутара быў млын, адкуль немцы вялі агонь (Я. Герцовіч). 15) Пум стаяў побач з зубранём, трос кудластай галавой, адганяў тых, хто хацеў дакрануцца да малога (Я. Зазека). 16) Там, дзе другі можа апусціць рукі, беларус будзе цягнуць (У. Караткевіч). 17) Старажытнае павер’е не раіла пазычаць агонь у святочныя дні па суседству з хаты ў хату, бо, як лічылася, разам з агнём да суседа магла перайсці і частка дабра і сямейнага шчасця (В. Цітоў). 18) Хата [курная] мела высокі парог і нізкія дзверы, што спрыяла за-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

хаванню цяпла ў зімовы час (В. Цітоў). 19) Але вучоныя-археолагі, якія вядуць раскопкі, кажуць, нібыта Полацк яшчэ на стагоддзе старэйшы (У. Арлоў). 20) Ціха гулі і судрыгаліся балоты побач чыгункі, дзе бегла машына (Я. Колас).

II. 1) Многа патрабавалася ўмення на тое, каб кожная група была занята і не сядзела без работы (Я. Колас). 2) І хоць даўно ўжо і ў паміне не засталося той вузенькай жоўтай палоскі цераз балота, дасюль усе ў вёсцы завуць гэту шырокую дарогу Мікітавым Шляхам (М. Парахневіч). 3) У той час, як арлоўскія, бранскія, гомельскія, чарнігаўскія сяляне здабывалі з кар’ераў-прорваў баласт і камень для насыпу новай чыгункі, па балотах Палесся вандравала экспедыцыя генерала Жылінскага (І. Навуменка). 4) Ля ўзгорка, куды завозілі матэрыялы, усё часцей ішлі нагружаныя падводы (П. Броўка). 5) Параіўшыся, [Алесь] прыняў рашэнне, каб у капанні катлавана дапамог і тол (П. Броўка). 6) У асеннім лесе можна пачуць адрывісты глухі рык, што часам пужае грыбнікоў (з календара “Родны край”). 7) Калі ў лесе ціха, лася можна пачуць і за паўкіламетра (з календара “Родны край”). 8) Зімой зубры збіраюцца ў вялікія, у некалькі дзясяткаў галоў статкі, якія вясной распадаюцца на больш дробныя (А. Курскоў). 9) Два разведзеныя і паднятыя ўгору пальцы (указальны і сярэдні) сімвалізуюць лацінскую “V”, першую літару слова “вікторыя”, што ў перакладзе азначае – перамога (з газеты “Звязда”). 10) Атрымліваецца, быццам камяні выштурхваюцца зямлёй (Э. Ляўкоў). 11) Неяк усё прыціхла, стаілася, нібы падрыхтавалася лавіць рэдкія шолахі мяккай летняй ночы (Т. Хадкевіч). 12) Але чым далей у лес, тым болей грыбоў (Б. Сачанка). 13) Пагрузка дэсантнікаў на караблі пачыналася позна ўвечары, калі ўжо згусціўся змрок (В. Хомчанка). 14) У Тураве расказваюць, што студня выкапана князем Турам і мае тры дны – залатое, сярэбранае і меднае (Л. Дучыц). 15) Купцу многае трэба ўлічваць, прадбачыць, каб пазбегнуць банкруцтва. Каб весці гандаль у замежных гарадах, ён павінен быў ведаць мовы, звычаі і законы чужых краін (У. Калеснік). 16) Вопытны селянін ніколі не браў для будаўніцтва рыплівага дрэва, бо ў збудаванай з яго хаце людзі могуць часта паміраць ці заходзіцца ад кашлю (А. Лакатко). 17) Стараючыся не зварухнуцца, я пазіраў праз калматыя шчыліны будана туды, дзе хвіліны дзве назад заўважыў цецерука (М. Паслядовіч). 18) Светлажоўтая квецень так упрыгожыла ліпы, што за ёю мала прыкметна лісце (Я. Крамко). 19) А сонца пасля зімы свеціць так ярка, што аж вачам ба-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

люча (з часопіса “Родная прырода”). 20) Правінцыяльны архітэктар не ведаў, відаць, вядомага сакрэту, і таму калоны здаваліся трохі пукатымі ўсярэдзіне, як бачонкі (У. Караткевіч).

***Практыкаванне 47. Выпішыце спачатку сказы, часткі якіх звязаны пры дапамозе злучнікаў, затым сказы, часткі якіх звязаны пры дапамозе злучальных слоў. Злучальныя словы падкрэсліце як члены сказа. Расстаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Вызначце тыпы дадзеных частак.***

I. 1) Дзень выспяваў нетаропка як выспявае на бяскрайняй ніве колас (В. Іпатава). 2) Запаведнымі [на Беларусі] зрабіліся і вялікія балоты плошча якіх займае каля 14% тэрыторыі (В. Вольскі). 3) Няма таго зелля што хоць на міг ад тугі па Айчыне вылечвае (Г. Бураўкін). 4) Я не ведаю з чым зраўняецца радасць дотыку да зямлі (П. Макаль). 5) Шчыльна прыціскаючыся да зямлі салдат поўз туды дзе плакала дзяўчынка (А. Гайчук). 6) Каб на хмель не мароз дык бы тын перарос (прыказка). 7) Праясняецца пагода бо вярнулася вясна (М. Багдановіч). 8) Кожны з нас прыпасае Радзімы куток каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны… (П. Панчанка). 9) Усе чакалі першага сонца быццам яно павінна нешта перамяніць у жыцці (А. Асіпенка). 10) Сонца прыпякала так што нават уначы не астывала зямля (М. Лынькоў). 11) Як прыемна дзе б ні быў пачуць знаёмую назву знаёмае імя знаёмае прозвішча! (К. Кірыенка). 12) Паводле старажытнага звычаю жанчына калі выходзіла замуж мяняла імя (К. Тарасаў). 13) Любіў Базылёнак прыцемкам мінут дзясятак пасядзець на ганку і паслухаць як заліваецца ў чаромхавым кустоўі за вярбою салавей (А. Кандрусевіч). 14) Яго [рамонку] столькі тут закрасавала што поле зрабілася белае (Р. Ігнаценка). 15) Дзяцел сядзеў на дрэве і выстукваў аднастайныя гукі нібы тэлеграфіст перадаваў тэлеграму (Я. Колас). 16) Самай распаўсюджанай у нас назвай вытворчага паходжання з’яўляюцца Руда і Рудня што гаворыць і пра старажытнасць і пра папулярнасць гэтага віду прафесійнай дзейнасці беларускага народа (Л. Лыч). 17) А светлыя дзянькі часамі з’яўляюцца як ласкавая ўсмешка на твары старога і ажыўляюць усё наваколле (М. Зарэцкі). 18) У тоне Сцёпкавага адказу была пашана да стрэлачніка што таму вельмі спадабалася (Я. Колас). 19) Відаць утаміўся за ўчарашні дзень і вечар таму і заснуў так моцна (М. Лынькоў). 20) Чым ноч тая цямнейшая тым зорачкі ярчэйшыя (М. Васілёк).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

II. 1) Дзякуючы таму далёкаму восеньскаму дню і сустрэчы з прозай Івана Антонавіча [Брыля] я пацягнуўся да літаратуры як парастак травы цягнецца вясною да сонца (А. Казлоў). 2) Тыповага беларуса я досыць лёгка адрозню ад іншых, хаця б ён яшчэ не сказаў ніводнага слова (У. Караткевіч). 3) На Беларусі існавала шмат спосабаў, магічных прыёмаў якімі карысталіся сяляне пры выбары месца пад хату (Л. Лыч). 4) Самымі спрыяльнымі месяцамі для нарыхтоўкі лесу лічыліся сакавік і красавік таму што веснавы сок рабіў драўніну мацнейшай (А. Лакатко). 5) Улазіны спраўляліся толькі пасля таго як была зроблена печ (В. Цітоў). 6) На ручнік ставілі маладых каб у іх была адна дарога ў жыцці (Я. Пархута). 7) Маё вялікае і даўняе жаданне ва ўсім будзённым бачыць урачыстасць і радавацца ўжо нават таму што мы людзі сварачыся і мірачыся лаючыся і сябруючы усё ж жывём на гэтай цудоўнай зямлі (Я. Сіпакоў). 8) Шлях нашага народа пазначаны не толькі славутымі падзеямі але і славутымі асобамі якія ў тым ці іншым перыядзе гісторыі станавіліся яго сімваламі (К. Тарасаў). 9) А там дзе поле ўпіралася ў цёмную сцяну баравога лесу на самай граніцы ззяла як люстэрка пакручастая стужка вады (Я. Колас). 10) Андрэй правёў сваю маладосць у памяшканнях з вялікімі вокнамі і ніколі не чакаў што ў хатах могуць быць такія малыя вокны (П. Пестрак). 11) Адзін з тытанаў па імені Праметэй украў з Алімпа агонь і перадаў яго людзям каб палегчыць ім жыццё (А. Чамярыцкі). 12) Калі глядзець цяпер з Антонавага лугу на возера дык яно здаецца ляжыць у нейкай цудоўнай аправе (П. Броўка). 13) Яна [маладая раслінка] была такая маленькая што ніхто нават не пазіраў на яе і не цешыўся ёю (Я. Колас). 14) У прыродзе склалася так што жнівень сустракаецца з восенню (В. Грамыка). 15) Канца няма ёй гэтай дарозе як і няма канца-краю ўшыркі яму бору (І. Грамовіч). 16) У тысяча чатырыста дзявятым годзе прывілеем караля Рэчы Паспалітай Ягайлы вёска Пасаднік была пераведзена ў разрад мястэчак і атрымала назву Паставы што тлумачыцца знаходжаннем паселішча на берагах ставоў утвораных плацінай ад млына (з часопіса “Роднае слова”). 17) А навокал было так згодна хораша і радасна ўсё роўна як зямля святкавала вялікае свята (Я. Колас). 18) Чым далей едзем мы на поўздзень тым усё больш набывае навакольная мясцовасць знаёмае ўжо нам характэрнае палескае аблічча (В. Вольскі). 19) Нашы ластаўкі відаць запазніліся звіць сваё гняздо і таму ластавяняты вывеліся ў іх запознена (Я. Сіпакоў). 20) Найвышэйшы ўзлёт полацкай архітэктурнай школы звязаны з творчасцю дойліда Іаана прыпадае на гады асветніцкай дзейнасці Еўфрасінні што вядома зусім невыпадкова (У. Арлоў).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Практыкаванне 48. Спішыце сказы. Расстаўце знакі прыпынку. Вызначце тып даданых частак і сінтаксічную функцыю злучальнага слова ЯКІ.***

І. 1) Раніцай мы ішлі ў школьную цяпліцу сустракаць узыход сонца якое афарбоўвала у пунцовыя колеры мудрагелістыя ўзоры на замёрзшых шкельцах у калідоры цяпліцы (В. Сухамлінскі). 2) Унізе захаваліся па схілах нязначныя рэшткі мураванай сцяны якая апаясвала калісьці ўсю сцяну (В. Вольскі). 3) Час і людзі не шмат чаго пакінулі ад колішняй хутарской сядзібы рэшткі якой спакваля праглынула зямля і развеяў вецер (В. Быкаў). 4) Альбуць гэта непаўторны Коласаў свет які дзякуючы вялікаму таленту мастака стаў нам блізкім і родным (С. Кухараў). 5) Небасхіл які некалькі хвілін назад быў блакітным стаў цёмна-ружовы (У. Аляхновіч). 6) Асноўным абрадам святочнага дня стала наведванне царквы з мэтай асвяціць галінкі вярбы якім прыпісваліся шматлікія магічна-аздараўленчыя ўласцівасці (І. Крук). 7) Галоўнае прыроднае багацце Беларусі складаюць прыродныя лясы якія ў значнай меры ва ўсе часіны прадвызначалі спецыфіку гаспадарання і ўмовы жыцця насельніцтва (Э. Дубянецкі). 8) На тэрыторыі Беларусі пашыраны разьба па дрэве і разьба па косці апошняя з якіх вядома з часоў позняга палеаліту (Я. Пархута). 9) Тут вочы ўпіраюцца ў недалёкае ўзвышша якоеградою праходзіць уздоўж балоцістай нізіны за выганамі і ахоўвае вёску ад паўночных вятроў (П. Пястрак). 10) Сяргей рашыў не марнаваць дарма часу і накіраваўся ў бярэзнік які высока і роўна падняўся за гарой (А. Варановіч). 11) Блізкасць пушчы адчуваецца не толькі над ракой берагі якое завалены падрыхтаванай для сплаву драўнінай але і ў самім гарадку (Я. Брыль). 12) Асаблівая наша гордасць запаведнік Белавежская пушча лясы якога адносяцца да самых высокаўзроставых у Еўропе (Я. Сіпакоў). 13) Для нас жа Белавежская пушча яшчэ і рэзідэнцыя беларускага Дзеда Мароза дрымучыя лясы якой ён выбраў сабе пад жыллё (Я. Сіпакоў). 14) Тут было ўсё звычайным імхі на купінах балотцаў сухі верас паміж імі мышка-малютка якая цягнула з высокага бадзяка белы пух відаць у сваё гняздо гатуючыся на зіму (У. Караткевіч). 15) Старыя бабровыя хаткі у якіх бабры жывуць з пакалення ў пакаленне штогод іх пашыраючы і павялічваючы дасягаюць часам вялізных памераў (В. Вольскі). 16) Які дуб такое і карэнне (прыказка). 17) Бура налятала парывамі як дзікі звер які вырваўся на волю з жалезнай клеткі ўсім цяжарам налягала на стрэхі будынін з шумам ганяючы па іх патокі снегу (Я. Колас). 18) Шчаслівыя святочна апранутыя яны [валачобнікі] зусім не нагадвалі тых суседзяў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

якіх бачыш штодзень (С. Давідовіч). 19) Падарункі складвалі ў вялізны плецены кош які нехта з валачобнікаў насіў на рэмені цераз плячо (С. Давідовіч). 20) Беднае зярнятка з якога вырасла травінка згубіла ўжо ўсякую надзею ўбачыць калі-небудзь белы свет (Я. Колас).

II. 1) Невялікі гарадок [Мазыр] вядомы ў гісторыі антыфеадальнымі паўстаннямі якія прыпалі на 17-е стагоддзе (з часопіса “Роднае слова”). 2) Да дваццатага стагоддзя культурнае жыццё Нясвіжа развівалася дзякуючы князям Радзівілам якія валодалі гэтай зямлёй з 1523 года (з часопіса “Роднае слова”). 3) Раніцай ішоў па сцежцы стары лось і ўбачыўшы наперадзе бярозку якая перагарадзіла дарогу спыніўся (Р. Ігнаценка). 4) Якая Агатка такая ў яе і хатка (прыказка). 5) Іду з вуліцы ў вуліцу як з пакоя ў пакой і скрозь пазнаю знаёмыя аблічча сяброў і тысячы людзей з якімі яшчэ не паспеў пагаварыць і пасябраваць (С. Грахоўскі). 6) То тут то там праплывалі рады новых будынкаў уздоўж якіх крочылі слупы электраліній (А. Зінькевіч). 7) Бор пачынаецца з берага стройнымі соснамі якія ўтвараюць суцэльную сцяну (І. Грамовіч). 8) Настаўнік Васіль Пятровіч якога мы пабойваліся толькі дакорліва круціў галавой (М. Даніленка). 9) Браўся ў сілу і бязлітасным холадам сек мароз якім абмарожваліся падарожныя людзі (В. Адамчык). 10) Чалавеку які ўлюбёны ў свой край дарага ўсё і свіст тоненькай травінкі пад схаваным між купін птушыным гняздом ласіны след на заснежанай лясной палянцы усплёск рыбіны на азоранай вадзе сцішанага возера (К. Кірэенка). 11) Палеткі то велічна падымаюцца ўзгоркамі засланяючы адзін аднаго то ападаюць пакатамі па якіх пенячыся і размываючы гліну бяжыць вада (Я. Скрыган). 12) Паабапал дарогі пацягнуўся бор з высокімі старымі соснамі галіны якіх павіслі над шашой (І. Шамякін). 13) Паважна і ўрачыста кланяліся машыне рэдкія бярозы і дубы на якіх дзе-нідзе звісала пад цяжарам снегу карычневае лісце (І. Шамякін). 14) Усе пералётныя птушкі якія спяшаліся на поўдзень заўсёды садзіліся адпачыць на рамонкавым полі (Р. Ігнаценка). 15) У кожнага чалавека які меў шчасце некалі нарадзіцца на нашай зялёнай зямлі абавязкова ёсць свой гожы ласкавы і шчымліва-непаўторны край (Я. Сіпакоў). 16) Нават крапіву якой частавалі мяне за некаторыя грахі дзяцінства забаранялася збіваць без прычыны пугаю (У. Дубоўка). 17) Школы Еўфрасінні Полацкай былі перадавымі для свайго часу і праграмаю навучання і складам вучняў значная частка якіх набіралася з дзяцей простых гараджан (У. Арлоў). 18) Дрэвы якія паскідалі снегавыя шапкі і зімовую панурасць здаваліся ў густым бары надзвычайна



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ўрачыстымі (М. Лынькоў). 19) Якая заслуга такая і пашана (прыказка). 20) Высозны меднастволы бор з засені якога выбівалася рачулка як быццам адчуваў і разумеў настрой маёй душы (К. Кірэенка).

***Практыкаванне 49. Выпішыце сказы, часткі якіх звязаны пры дапамозе злучальных слоў. Падкрэсліце злучальныя словы як члены сказа.***

І. 1) Я полымя ўзношу святое і мару ў халоднай траве, што гэта цяпло дарагое да вокнаў тваіх даплыве (Р. Семашкевіч). 2) Што вясною пасееш, тое восенню збярэш (прыказка). 3) Часам, як кажуць, чалавек трапляе ў асобы струмень, што так лагодненька носіць цябе на хвалях жыцця (Я. Колас). 4) Гэта той самы пасёлак, што відзен быў тады, калі мы ехалі з Ульянаю (Я. Скрыган). 5) Я сыходжу з узгорка па дарожцы, што вядзе ў сенажаці (Я. Скрыган). 6) Нялёгка дастаецца хлеб, што родзіць для нас зямля-карміцелька (Т. Хадкевіч). 7) Людзі сталага веку перакананыя ў тым, што камяні растуць (Э. Ляўкоў). 8) А дарожкай, што была ўсыпана баравым пяском і вяла да помніка воіну-вызваліцелю, паволі ішла старая жанчына (М. Плотнікаў). 9) Між гэтых дрэў асабліва кідалася ў вочы падарожнага старадрэвіна-хвоя, што стаяла зусім адна на высокім грудку непадалёку ад Нёмана (Я. Колас). 10) Бульба ўвайшла ў лік палявых культур параўнальна нядаўна, што было звязана з некаторымі зменамі ў жыцці сялянства (А. Вечар). 11) Нарэшце з правага боку паказалася рэчка, што, вырваўшыся з густых хмызнякоў, кацілася ў рэчышча Бярозы (К. Кірэенка). 12) Злавацца чыноўнік пачынае, што дзядзька вытрыманасць мае (Я. Колас). 13) Не загінуць мове той, што з вуснаў мацярок зляцела (Н. Гальпяровіч). 14) Як прыемна і радасна ведаць, што дарагая твая мясціна з гадамі пахарашэла і папрыгажэла, зазвінела новымі галасамі і песнямі (К. Кірыенка). 15) Вучоныя лічаць, што чалавек на тэрыторыі Беларусі мог жыць ужо каля трохсот тысяч гадоў назад (Г. Штыхаў). 16) Яшчэ ў старажытнасці было заўважана, што талакняная мука адрозніваецца лепшым смакам і пажыўнымі якасцямі (В. Цітоў). 17) Селянін спяшаўся з заканчэннем работ таму, што канец верасня нёс з сабой вялікія змены ў стане прыроды (І. Крук). 18) Развіццю і ўдасканаленню старабеларускай мовы ў значнай меры спрыяла тое, што яна выконвала дзяржаўныя функцыі ў Вялікім княстве Літоўскім (Л. Шакун). 19) Няўжо дзядька Ціхон не бачыў, не чуў, што рабілася каля яго будана, што робіцца зараз над яго галавой? (М. Паслядовіч). 20) Трава такая густая стаяла і так густа адрастала, што яе скошваць не паспявалі (А. Ненадавец).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

II. 1) Я не заўважыў, калі мая сталасць настала (А. Куляшоў). 2) Чалавек і ад страт багацее, калі ён не замкнуўся ў сабе (С. Гаўрусёў). 3) Вясною, калі распускаюцца, зелянеюць дрэвы, адыдзіся надвячоркам па Свіслачы ці да Камсамольскага возера і хоць усю ноч слухай салаўёў (Б. Сачанка). 4) У леце пачыналася ўжо ледзь значная змена, той паварот часу, калі жыццё прыроды ідзе на спад (Я. Колас). 5) Пасля кожнай завеі, калі абнаўлялася снегавое покрыва зямлі, мы ішлі глядзець на снегавыя гурбы ў школьным садзе (В. Сухамлінскі). 6) Апрацоўка бульбы для захавання сернай кіслатой мае большы эфект тады, калі клубні напярэдадні мыюцца чыстай вадой (А. Вечар). 7) З часоў Старажытнай Русі, калі Полацк кіраваўся вечам і заключаў дагаворы з Рыгаю і Гоцкім берагам, купцоў называлі зычлівым словам госць (У. Калеснік). 8) Я добра памятаю той далёкі ранак, калі мы, вучні невялікай палескай сямігодкі, тоўпіліся ля ганка школы (Б. Сачанка). 9) Калі ўдзень у парку шумела птаства, то вечарамі і ўночы тут шумела моладзь (П. Пестрак). 10) Кепска было раней, калі не было яшчэ бульбы (У. Караткевіч). 11) Іван Харытонавіч спыніўся на ўскраі ўзаранага поля, зачэрпнуў жменю сырой зямлі, пацёр у пальцах, мяркуючы, калі ў гэтую нізіну кінуць зерне (К. Каліна). 12) Узгоркі Навагрудчыны, калі глядзець з гары, ледзь не ў шахматным парадку ўкрытыя пералескамі (Я. Брыль). 13) Я з’явіўся дадому брудны, стомлены і, калі вартаўнік адчыніў мне дзверы, адразу прайшоў да сябе (У. Караткевіч). 14) У той дзень, калі гэта адбылося, спёка не спадала (А. Пальчэўскі). 15) Толькі значна пазней, калі вызвалілі Гарадок, Міколу рассказалі, што здарылася з тымі двума танкамі (І. Новікаў). 16) У летапісах гарадок Мазыр упершыню згадваецца пад 1155 годам, калі вялікі кіеўскі князь Юрый Даўгарукі перадаў яго чарнігаўскаму князю Святаславу Ольгавічу (“Роднае слова”). 17) Зімою ж, калі стаяць моцныя маразы, вада ў канаве замярзае (З. Бяспалы). 18) Заняпала і страціла сваю незалежнасць Вялікае княства Літоўскае, калі было аб’яднана з Польшчай (Л. Качанка). 19) Я падышоў да дома Дубатоўка толькі ў прысмерку, калі вокны яго былі ярка асветлены (У. Караткевіч). 20) Ніхто з людзей не помніў, хто і калі іх [дубы] садзіў (У. Содаль).

III. 1) Няма на свеце справы больш пачэснай, як быць народу творцам і слугой (А. Звонак). 2) У нас няма аўтарытэтных звестак пра тое, як успрымаліся пісьменнікамі 20-х гадоў крытычныя парады Гарэцкага (з часопіса “Полымя”). 3) Але як толькі машына кранулася, падзьмуў халодны вецер (Г. Шуцько). 4) А як заспявалі жаваранкі, павесялеў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

жораў, але не спяшаўся ўзляцець у неба (А. Бялевіч). 5) Настаўніца на першы раз сказала дзяўчатам пайсці да Насці і паглядзець, як яна жыве (К. Чорны). 6) Чуваць здалёку, як касцы мянташаць звонка косы (М. Калачынскі). 7) Культура кожнага народа, зразумела, найлепш вызначаецца тым, як ён ставіцца да сваёй гісторыі, духоўных традыцый папярэдніх пакаленняў (Л. Лыч). 8) Яна [Яноўская] размаўляла пра каханне так, як іншыя жанчыны пра надвор'е (У. Караткевіч). 9) Прыпомнілася, як у адзін з пасляваенных гадоў на збавенне людзям вельмі добра ўрадзілі грыбы (Я. Галубовіч). 10) [Мята] першаю выбіваецца на свет, як толькі сыходзіць снег, і лапушыцца да позніх замаразкаў (В. Вітка). 11) Заўсёды, як бываю ў Еўлічах, прывожу пучок мяты (В. Вітка). 12) Мы, трое сямігадовых жэўжыкаў, стаялі каля плота і назіралі, як на вуліцы вывіваліся адна перад адною белагрудыя ластаўкі (А. Пальчэўскі). 13) Дзень выспяваў нетаропка, як выспявае пад гарачым сонцам на бяскрайняй ніве колас (В. Іпатава). 14) Нават здалёк можна было заўважыць, як на ўзлесках гарыць сіняватым агнём спелы верас (Я. Сіпакоў). 15) Як паважаеш ты суседа, цябе шануе так сусед (Я. Непачаловіч). 16) Як сок забродзіць пад бяростай, тады пачне хваліцца ростам смаржок пад елкаю старой (А. Бялевіч). 17) Яна адносілася да мяне так, як адносяцца да старэйшага сябра (А. Васілевіч). 18) І тады ўжо запыталіся, як гэта было (І. Грамовіч). 19) Сцежка ведае сама, як ёй весціся (А. Разанаў). 20) Дзвіну не запыніш ніякай мяжой, як з сэрца гвалтоўна не вырвеш кахання (А. Звонак). 21) Як зярняты спяшаюцца зноў у барозны, так людзі вяртаюцца ў родныя гнёзды (В. Вітка). 22) Няма на свеце справы больш пачэснай, як быць народу творцам і слугой (А. Звонак). 23) Як цяжка будзе ісці к вяршыні, падай таварышу руку (П. Прыходзька). 24) Не забыць, як падвялы аер на памытай падлозе пахне, як у студню цыбаты асвер запускае руку да пахі (Р. Барадулін).

***Практыкаванне 50. Спішыце сказы. Расстаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Вызначце від падпарадкавання ў сладаназалежных сказах з некалькімі дададзенымі часткамі. Намалюйце схемы сказаў.***

І. 1) Цяпер, калі непакой суцішыўся Туравец пачаў больш адчуваць як ные параненая рука (І. Мележ). 2) Многа трэба ўмення і старання каб кожная група была зацікаўлена ў сваей рабоце каб увесь час трымаць школу на вышыні таго ці іншага настрою (Я. Колас). 3) Міканор і калі ішлі полем і калі стаялі, аглядвалі поле расказваў каморніку дзе чые надзелы як родзіць зямля жыта проса авёс (І. Мележ). 4) Адведаў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Якуб Колас і сваю Мікалаеўшчыну дзе сустрэўся з сёстрамі і братамі і ўсе найдаражэйшыя куткі якія запалі яму ў сэрца (П. Броўка). 5) Колас доўга і не ведаў што ягоны жыццёвы прытулак згарэў ад запальных бомбаў праз дзве гадзіны пасля таго як як ён пакінуў свой кут (П. Броўка). 6) Да пачатку палётаў чалавека ў космас лічылася што адна з галоўных небяспек якая яго там падпільноўвае сустрэча з метэарытамі (П. Клімук). 7) Я выходжу на зялёны адхон і гляджу туды дзе зусім яшчэ нядаўна было так многа вёсак а цяпер бялеюць адны бярозы (В. Бялоў). 8) Іван ведаў што чакаць яго тут ніхто не будзе але пастаяў ля нізенькага станцыйнага плоціка пакуль людзі растасаваліся хто куды (А. Кудравец). 9) Усякаму малому калі яму міне пяць вёснаў хочацца каб свет хадзіў дагары нагамі (І. Навуменка). 10) Іван Харытонавіч ужо каторы раз падумаў пра тое што няма на свеце прыгажэйшага і вальнейшага краю чым гэты дзе ён нарадзіўся і вось ужо састарыўся (К. Каліна). 11) Неяк ноччу мне здалося што я чуў як трубілі пралятаючы над горадам журавы (М. Стальцоў). 12) Беражком ідзём туды дзе сонца начуе дзе пачынаецца наша ціхая шчырая рэчачка (А. Бялевіч). 13) Нялёгкія думы гналі Вячку калі падклаўшы пад галаву сядло ён стараўся заснуць на ласінай шкуры якую браў з сабой у дарогу (Л. Дайнека). 14) Аднастайныя нудныя дажджы што месяцамі лілі на мокрыя стрэхі сцюдзёныя вятры што люта білі ў замерзлыя вочкі-шыбы завеямі цёплае сонца што ўставала ў пагодныя дні над купамі алешніку усё бачыла гэты востраў заклапочаным у няспыннай штодзённай руплівасці (І. Мележ). 15) Толькі прывычнае вока магло распазнаць што гэтая раслінка стане некалі дрэвам якое завецца хвояй (Я. Колас). 16) Паблісквала ўсюды і там дзе назапашваліся хмары паволі абнімаючы небасхіл ад паўднёвага захаду да ўсходу і там дзе яшчэ святлела чыстае неба (Т. Хадкевіч). 17) Хто не ведае як б'ецца сэрца як сціскаецца яно ад хвалявання калі праз шмат гадоў раптам убачыш мясціны з якімі звязана тваё жыццё! (А. Зінькевіч). 18) Іван адчуваў што калі ўпадзе ў снег то напэўна болей ужо не ўстане (В. Быкаў). 19) Мы апрануліся па-зімоваму бо на дварэ сапраўды стаяў зімні холад хоць і лічылася што яшчэ восень і выйшлі на двор (В. Хомчанка). 20) Цяпер стала ясна што пакуль не зробяць мастоў немцы ў Вялікі Лес не пакажуць і носа (Б. Сачанка).

II. 1) Сёння арнітолагі мяркуюць што рашаючае значэнне мае складаны пераменчы інстынкт які сфарміраваўся ў працэсе працяглай гісторыі развіцця саміх птушак і клімату зямлі (Я. Суханаў). 2) Кажуць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

што французскі кароль Людовік Шаснаццаты аднойчы з'явіўся на баль у Версалі з кветкай бульбы ў пятліцы свайго сурдута каб усе звярнулі ўвагу на гэтую расліну якой належала быць другім хлебам для французскай галечы (А. Вечар). 3) Дзе б я ні быў якія б цуды ні здзіўлялі перад маімі вачамі заўсёды ззяла прамяністае святло майго роднага мястэчка дзе жылі бацькі і бацькі маіх бацькоў дзе я сам упершыню захапіўся шчодрай сонечнай прамяністасцю пахам кветак на шаўковых мурожных лугах спевам жаўранка пад высокімі сінімі нябёсамі (М. Федаровіч). 3) Пасля бабінага лета калі адыходзіць цяпло прасвечаных ужо халаднаватым сонцам асенніх дзянькоў калі ў парках і скверах дагараюць клёны і патухаюць свечкі бярозак калі густа і спрытна сыплецца пасля начных замаразкаў лістота надыходзіць сырая восеньская пара з дажджамі і пранізлівымі з-за якіх так не хочацца выходзіць на вуліцу вятрамі (С. Сцяпан). 4) Ён [чалавек] спявае ў мінуты суму калі на душы ў яго цёмна і неспакойна у радасці калі сэрца апавіта святлом і цеплынёй спявае ў працы і вяселлі складае песні гневу і кахання (У. Краўчанка). 5) Так ціха што чутно як лятуць пчолкі як звіняць у паветры тоненькім галаском кучкі мошак (Я. Колас). 6) Калі ў сцяну замуравалі апошні чырвоны камень і дождж адмыў высокія муры ад пяску і гліны ўбачылі жыхары Лоска што зубцы і вежы нібы залівае чырвонае зарава хоць неба і было зацягнутае воблакамі (А. Гурскі). 7) Ты нават не ведаеш таго што калі размаўляеш па тэлефоне з жанчынай то павінен дачакацца пакуль яна першая пакладзе трубку (А. Марціновіч). 8) Сяргей раптам адчуў што прытаміўся што захацелася піць (А. Вараловіч). 9) Адпачыўшы Сяргей выбраўся на сцежку па якой ішоў у лес узбег на самы высокі пагорак дзе стаяла купка бяроз і спыніўся зачараваны (А. Вараловіч). 10) Нядаўна як кажуць урачыста святкаваўся юбілей дуба што даўно жыве ў лясным гушчары каля вёскі Пажэжын што ў Маларыцкім раёне (Я. Сіпакоў). 11) У народзе кажуць што энергетыка дуба дае вялікі прыліў сіл і той хто будзе штодзень прыходзіць да яго можа вылечыць любую хваробу… (Я. Сіпакоў). 12) Любіў ён [Колас] чыстыя баравыя лясы дзе прасторна воку дзе над галавой ніколі не змаўкае вячысты гоман хвойных вяршынь дзе ў дастатку паветра і сонца (М. Лынькоў). 13) Ён [Колас] любіў наведвацца ў лес і ранняй вясной калі толькі-толькі з'яўляліся сухія праталіны дзе побач з лапікамі снегу расцвітаў блакітам зябкі сон баравы і драбнюсенькімі ліловымі кветачкамі ўбіралася яшчэ бязлістае воўчае лыка а па нізінах па лагчынах гарэлі пад сонцам залатыя пухнацікі на вербах і лозах (М. Лынькоў). 14) Дзе б ні быў гэты чалавек



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[М. Гарэцкі] у якія б цяжкія абставіны ён ні трапляў ён заўсёды і ўсюды самаадданa служыў роднаму народу (з газеты “Літаратура і мастацтва”). 15) І хаця няма ні зярняці ва ўсім гэтым хвалюючым моры а ўжо чуецца ледзь-ледзь хлебны пах які так прыемна казыча ноздры (П. Броўка). 16) І хоць снег трымаўся яшчэ на палях хоць па начах можна было лёгка ісці па хрусткім падмарожаным насце сонца прыгравала з кожным днём усё мацней і мацней (М. Лынькоў). 17) Цімох чуў што калі пачне гаварыць то заплача ад крыўды злосці і жалю (Я. Колас). 18) Народная мудрасць гаворыць што чалавек які дзе-небудзь пасадзіў дрэўца ніколі не пакіне думкамі той мясціны (К. Кірэенка). 19) Ён [Карней Пятровіч] прыходзіў на той узгорак ранняй вясной калі толькі-толькі на ўгрэвах знікаў снег і пад сонцам ціхай парай курылася зямля і летам калі жытні колас ужо ўбіраўся ў сілу (М. Даніленка). 20) Усё пакінуць след павінна бо як пачаўся белы свет прамень пясчынка і расінка нязменна пакідаюць след (П. Броўка).

***Практыкаванне 51. Расстаўце знакі прыпынку. Зрабіце поўны сінтаксічны разбор складаназалежных сказаў у наступным парадку:***

***1) падзяліце на часткі;***

***2) вызначце ў кожнай частцы граматычную аснову;***

***3) укажыце тып складанага сказа;***

***4) вызначце від даданай часткі або даданых частак (дапаўняльная, азначальная, акалічнасная: месца, часу, прычыны, мэты, умовы, уступкі, спосабу дзеяння, меры і ступені, параўнальная, супастаўляльная, далучальная, выніковая);***

***5) калі сказ складаназалежны з некалькімі даданымі часткамі, то вызначце від падпарадкавання (паслядоўнае, сузалежнае (аднароднае або неаднароднае), змешанае, комплекснае);***

***6) намалюйце схему сказа.***

У з о р с і н т а к с і ч н а г а р а з б о р у с к л а д а н а з а л е ж н а г а с к а з а

[1]На поўдзень ад крывічоў жылі дрыгавічы, [2]паходжанне назвы якіх летапісы тлумачаць дрыгвяністым, балоцістым характарам мясцовасці (Э. Зайкоўскі).

Сказ складаны, складаназалежны з даданай азначальнай часткай. Схема: […], (… якіх…).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[1]На пачатку лета, [2]калі рабіна апранула ярка-ружовы вэлюм, [1]маці сядзела на ганку і слухала, [3]як бзумкаюць у голлі дрэва чмялі і пчолы, [4]як радасна і галасіста спяваюць птушкі (Я. Галубовіч).

Сказ складаны, складаназалежны з трыма даданымі часткамі (адной даданай акалічнаснай часу і дзвюма даданымі дапаўняльнымі), з сузалежным неаднародным і аднародным падпарадкаваннем.

Схема: [..., (калі...), ...], (як...), (як...).

I. 1) Па колеру неба ў час захаду сонца па руху і форме аблачынак па шолаху лісця ў лесе па паводзінах жывёлы якая вечарам ідзе з поля па птушынаму гоману па асаблівасцях азёрнай хвалі па водару асобных кветак які то слабее то мацнее па ўсіх гэтых шматлікіх незаўважаных для звычайнага вока народных прыкметах Колас мог вызначыць якое будзе заўтра надвор'е (М. Лынькоў). 2) Як мяркуецца назва крывічоў узнікла ад легендарнага родапачынальніка або ад назвы язычаскіх жрацоў атрыбутам якіх быў крывы жэзл (Э. Зайкоўскі). 3) Усё было тут незвычайнае і бязмежнасць стэпавых прастораў і воўчае скавытанне мяцеліцы ўночы і здзічэлы выгляд варты якая вярталася з муроў цытадэлі (А. Ганчар). 4) І ўздоўж і ўпоперак луг перасякаўся вузкімі доўгімі глыбокімі тонямі заросшымі аерам сітняком чаротамі і мяккімі ніцымі лозамі дзе хаваліся розныя лугавыя птушкі (Я. Колас). 5) Усяслаў быў адным з тых першых князёў пры якім Полацкая зямля заявіла пра сабе як пра самастойную дзяржаву. Ён быў адным з першых ва Усходняй Еўропе хто адчуў перспектыўнасць і гістарычную неабходнасць развіцця адносна малых незалежных дзяржаў (С. Тарасаў). 6) Правядзенне абрадавых рытуалаў на Радаўніцу калісьці накіроўвалася на тое каб задобрыць душы продкаў заслужыць іх садзеянне ў жыцці і гаспадарцы (У. Васілевіч). 7) У дзень перасялення ў новую хату гаспадары запрашалі гасцей а таксама свяшчэнніка каб асвяціў новае жыллё (С. Мыцько). 8) На Купалле хлопцы і дзяўчаты спраўляюць рытуальнае купанне ў рэках азёрах вадаёмах таму што вада ў гэтую ноч валодае магутнай гаючай жыватворнай жыццёвай і пладаноснай сілай (Л. Касцюкавец). 9) Вельмі хацелася кудысьці ў пушчу дзе сінеюць беларусія пралескі дзе ў нетрах такуюць цецерукі (У. Караткевіч). 10) А часам бывае што вужы з лугоў плывуць цэлай чарадою да высокага берага спяшаюцца каб у карчэўі ды кустах перачакаць напасце (М. Ваданосаў). 11) Дзіўна як уцалела гэтая адзінокая сасна і чаму за доўгія гады не вырасла паблізу хоць маленькай сасонкі (І. Пташнікаў). 12) Здаецца што ўпершыню бачыш і нізенькі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

плоцік і прысадзістую зрубленую з бярвёнаў-круглякоў варыўню што сіратліва стаіць адразу ж за гэтым плоцікам і разложыстыя яблыні і купку вішань і грушу на ўзмежку (Б. Сачанка). 13) Напэўна кожнаму здаецца што няма нідзе на свеце такога хараства як тое якое ты ўбачыў упершыню яшчэ ў маленстве і якое зачаравала цябе назаўсёды (М. Федаровіч). 14) І шчыра прызнаюся што няма для мяне найшчаслівейшых хвілін як ехаць дадому да маці да сваіх землякоў дзе кожная пядзя зямлі сходжана тваімі нагамі дзе з маленства знаёмыя кожнае дрэўца ў лесе кожны сіні васілёк і белы рамонак пры дарозе (В. Дайліда). 15) Хоць і змяркалася але я заўважыў што пад сценамі леснічоўкі бялелі кветкі сунічніку (М. Капыловіч). 16) Часам прыходзіць да чалавека такое імгненне калі нясцерпна хочацца пабачыць тыя мясціны дзе калісьці хадзіў у маленстве (А. Дзятлаў). 17) Старшыня спадзяваўся што калі не будзе дажджу то калгас датэрмінова закончыць уборку збожжа (М. Чарняўскі). 18) Адам Міцкевіч успамінаючы потым тую сустрэчу з рыбаком прызнаўся што просьба Марылі напісаць пра пачутае была яшчэ адным штуршком які скіраваў яго да невычэрпных крыніц народнай паэзіі (К. Цвірка). 19) Я пішу Марынцы каб як скончыцца будаўніцтва вярталася ў Мінск (Т. Хадкевіч). 20) Калі ж канферансье аб'явіць нумар і аркестр возьме першыя акорды хваляванне патрошкі ўлягаецца (А. Мімрык).

II. 1) Той хто хоць разочак пазнаўся сам-насам з жыццём летніх баравых закуткаў згодзіцца з думкай аб іх зусім адметным непаўторным харастве (К. Кірэенка). 2) Самай буйной племянной групоўкай якая на поўдні займала абсяг аж да Мінска а таксама Смаленшчыну і Пскоўшчыну былі крывічы (Э. Зайкоўскі). 3) Ёсць многа прыкладаў калі асоба ўзрошчаная духам аднаго народа яго побытам паветрам яго зямлі яго песнямі прылучаецца да духоўнага жыцця іншага народа і часам займае ў ім адно з самых выдатных месц (М. Стральцоў). 4) Радзіма гэта і сонца ў цябе над галавою і паветра якім ты дыхаеш гэта і вернасць твайго друга і мова якую даў табе народ і песня што засталася ад прадзедаў і легенда заўтрашняга твайго дня і гераічная слава бацькоў і тая сонечная дарога якой сёння ты ідзеш у сваю будучыню (К. Кірэенка). 5) У цэнтры вёскі Юравічы Калінкавіцкага раёна знаходзіцца верхнепалеалітычная стаянка першабытнага чалавека абсалютны ўзрост якой складае прыкладна дваццаць шэсць тысяч чатырыста семдзесят гадоў (Г. Штыхаў). 6) У 1630 годзе беларускі асветнік Спірыдон Собаль заснаваў пры Куцеінскім Богаяўленскім ма-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

настыры [Орша] друкарню якая стала асноўным цэнтрам беларускага кірылічнага кнігадрукавання (з часопіса “Роднае слова”). 7) На золку развіталіся купцы з жонкамі і дзецьмі з роднымі і знаёмымі узялі з сабою абразы якія звычайна адводзілі ад іх небяспеку ды рушылі ў няблізкі свет (А. Ненадавец). 8) Любіў ён [Колас] чыстыя баравыя лясы дзе прасторна воку дзе над галавой ніколі не змаўкае вячысты гоман хвойных вяршынь дзе ў дастатку паветра і сонца (М. Лынькоў). 9) Здаецца што ты адзін і ўвесь свет глядзіць на цябе а ты маленькі такі пад гэтаю сіняватаю вышынёй з прышытым да неба белым лапікам месяца (А. Жук). 10) За паваротам дзе рэчка заліла луг віднеліся шырокія і спакойныя прасторы вады па якіх нельга было вызначыць дзе праходзіць рэчышча (І. Шамякін). 11) З першага ж позірку відаць што дубы гэтыя пасаджаны чалавекам і што клапатлівыя ўмелыя рукі заўсёды прысутнічалі тут (І. Шамякін). 12) Я чую як стогнуць і гудуць векавыя дубы і хвоі бачу як гойдаюцца іх пышныя вершаліны адчуваю нават у зімовую сцюжу як пахне багун і смала-жывіца ў бары і прэлае лісце ў чарналессі (Б. Сачанка). 13) Нават калі хто з маіх аднагодкаў не адразу ўспомніць хто ж такі Іван Восіпавіч Ахрэмчык дастаткова нагадаць што ён напісаў карціну “Абаронцы Брэсцкай крэпасці” якая была змешчана ў падручніку (І. Воюш). 14) Гэта было так нечакана што пакуль я знімаў ружжо з пляча ад кабана і след прастыў (В. Карамазаў). 15) Круглы двор сялянскай сялібы заўсёды быў гасцінным месцам дзе збіраліся вясковыя рамёствы дзе таленавітыя рукі нашых продкаў рабілі тое што неабходна гаспадарцы (Я. Сіпакоў). 16) І самавітая ўязная брама нібыта ўрослая ў зямлю і высокія вежы што імкнуцца ў неба і велічныя залы дзе міжволі спыняешся са сцішаным сэрцам усё тут дыхае жывой мінуўшчынай і прымушае задумацца пра будучыню Радзімы (У. Ягоўдзік). 17) Чым бы ўсё гэта скончылася невядома калі б не памог выпадак (Б. Сачанка). 18) Станаўленне бортніцтва адбылося ў першым стагоддзі нашай эры пра што сведчаць словы “мёд” “воск” “матка” “труцень” якія этымалагічна ўваходзяць у агульнаславянскае моўнае адзінства (П. Сабіна). 19) Каля кастра застаўся праваднік які пакуль хлопцы лавілі рыбу прыгатаваў вячэру (К. Кірэенка). 20) Мураўёў рэзка абарваў яго заўважыўшы што калі чалавека вядуць на страту дык за ім абавязкова павінна быць нейкая правіна (У. Караткевіч).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Складаныя бяззлучнікавыя сказы

***Практыкаванне 52. Прачытайце сказы. Патлумачце знакі прыпынку паміж часткамі складанага бяззлучнікавага сказа. Назавіце тып адносін паміж часткамі сказа.***

I. 1) Змаўкалі птушкі, заціхалі набрынялыя паўзмрокам хвоі (М. Капыловіч). 2) У цемрадзі са свістам праляцела чарада качак, недзе далёка на бальшаку загрукаталі калёсы (А. Асіпенка). 3) Беларус – вялікі аматар пажартаваць, ён не можа абысціся без гумару (У. Караткевіч). 4) Так бывае ў лесе: стары бор хораша спалучаецца з маладым падлескам (С. Пятровіч). 5) Усё наваколле спявала, цешыла музыкай: Нёман манатонна нашэптваў свае адвечныя песні роднага краю; вербы шамацелі лісцем, спявалі славу сонцу і вадзе; птушкі пераліваліся на розныя галасы, услаўлялі лета, сонца, дрэвы; ад розных мух звінела ў паветры; мурашкі, спяшаючыся, але не абганяючы адна адну, паўзлі па шурпатым ствале вярбы (Я. Крамко). 6) Густая шэрань на галінках лягла – ад яблыкаў, ад ігруш дрэвы да самай зямлі прыгнуцца (Л. Дайнека). 7) Раскідвалі густалістае вецце магутныя ліпы, клёны, вязы, цягнуліся ў неба гонкія сосны, цямнелі пірамідкі стагадовых ялін (Т. Хадкевіч). 8) Ходзяць у пары сонца і цень, радасць і смутак, любоў і нянавісць, сонца схаваецца – цень западзе, радасць знікае – сум крылы расправіць (А. Лойка). 9) Ехаць стала нязручна, веласіпед раз-пораз падскокваў на тоўстых карэннях (Т. Хадкевіч). 10) Між надворкамі і вуліцай няма розніцы: усё зарасло травою (П. Пестрак). 11) Тут жа часамі нясмела пастукваў мужыцкі воз, мізэрны конік дробна перабіраў нагамі на цвёрдым бруку (Я. Колас). 12) Змаўкалі птушкі, заціхалі набрынялыя паўзмрокам хвоі (М. Капыловіч). 13) Павее ветрык – шурхнуць травы (Я. Колас). 14) Жэняцца – скачуць, разводзяцца – плачуць (прыказка). 15) Над мяккімі стрэхамі завіс яшчэ не змерклы месяц, звонам пустых вёдраў пачаўся новы дзень (В. Адамчык). 16) Няма лесу – няма жыцця (А. Чарнышэвіч). 17) Ёсць куток на зямлі: дзень адзін пражывеш – назаўсёды цябе зачаруе (М. Танк). 18) Белыя маланкі палілі вадзяную муць, рэха грымотных удараў грукатала і раўло ў далінах (Э. Самуйлёнак). 19) Першы дзень зімы. Святлее зямля – святлее душа чалавека (І. Шамякін). 20) На гэты дзень і сама хата была прыбрана зухавата: памыты лавы, стол, падлога… (Я. Колас).

II. 1) На старым клёне ў гняздзе заляскатаў дзюбай бусел, час ад часу рыпеў калодзежны журавель (А. Асіпенка). 2) Хутка падсыхалі дарогі, на пясчаных узгорках вецер ужо ўздымаў пыл, гнаў яго ў напоўненыя вадой



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лагчыны (І. Шамякін). 3) Цішыня сапраўды дзікая: не чуваць ні спявання пеўняў, ні бляяння авечак, ні мыкання кароў, ні ржання коней (П. Пестрак). 4) Унутраная планіроўка, а часткова і фасады [Ружанскага] палаца ўвесь час мяняліся: гэтага вымагала вытворчасць (В. Супрун). 5) Праз гадзіну вецер сціх, гром змоўк, маланкі перасталі разрываць цёмнае неба (В. Вольскі). 6) Я з трэскам адчыніў акно – халоднае паветра лінула ў пакой (У. Караткевіч). 7) На памяць прыйшлі парады інструктараў і старэйшых таварышаў: трэба паводзіць сябе спакойна, рухі павінны быць плаўныя, адштурхоўвацца ад крэсла ці борта карабля толькі злёгку… (П. Клімук). 8) Ёсць любоў да блізкага чалавека, ёсць любоў да роднай зямлі, да сцежак маленства, да матчынай песні (С. Грахоўскі). 9) Птушкі мне гаварылі: не хочацца ім жыць за морам далёка пад небам чужым, над чужымі прасторамі сонца вітаць, на разбураных гнёздах сваіх сумаваць (М. Танк). 10) Мяняецца пара года – мяняецца праца (У. Дамашэвіч). 11) У народзе кажуць: беражлівым быць – лепей жыць (з газеты “Звязда”). 12) Пахне ціхі прасёлак лясной канюшынай, ціха бусел садзіцца на стог (А. Вялюгін). 13) Усё навокал было знаёмае і звычайнае: даверліва шапацелі грушы, дрымотна чарнелі на могілках купы вербаў і акацый, шарэў ледзь відна ў цемры туман на балоце (І. Мележ). 14) Вецер пракоціцца, будзячы нівы, – нівы калоссем шумяць (П. Глебка). 15) Над полем, над гаем, над змучаным краем пракоціцца вестка: няма больш вайны (Я. Колас). 16) Кажуць людзі: у год раз ночкай з гуслямі дзед з кургана, як снег, белы выходзіць (Я. Купала). 17) Людзі прыніклі да зямлі, не варушыліся, прагна прыслухоўваліся да гукаў восеньскай ночы: дзесьці хруснуў сучок, мякка ўпала паблізу хваёвая шышка, за лесам гучна заржала жарабя (М. Лынькоў). 18) Касмічны палёт – гэта праца вялікага калектыву вучоных, інжынераў, тэхнікаў, рабочых, спецыялістаў розных галін навукі і тэхнікі, у ім выяўляецца імкненне нашага народа спазнаць новае, раскрыць таямніцы нязведаннага (П. Клімук). 19) Рака ўваходзіла ў берагі, з лагчын амаль сышла вада (Я. Крамко). 20) Госці ў хату – беларусы рассцілаюць на сталах саматканыя абрусы… (У. Скарынкін).

***Практыкаванне 53. Расстаўце знакі прыпынку паміж часткамі складанага бяззлучнікавага сказа. Зрабіце поўны сінтаксічны разбор складаных бяззлучнікавых сказаў у наступным парадку:***

***1) падзяліце на часткі;***

***2) вызначце ў кожнай частцы граматычную аснову;***

***3) укажыце тып складанага сказа;***



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***4) вызначце від сэнсавых адносін паміж часткамі складанга бяззлучнікавага сказа (пералічальныя, удакладняльныя, дапаўняльныя, прычынныя, супастаўляльныя, часавыя, умоўныя, выніковыя, параўнальныя і інш.);***

***5) намалюйце схему сказа.***

У з о р  с і н т а к с і ч н а г а  р а з б о р у  с к л а д а н а г а  б я з з л у ч н і к а в а г а  с к а з а

[1]Раптам бліснула маланка, [2]аглушальна ўдарыў гром, [3]дождж хлынуў ліўнем (І. Шамякін).

Сказ складаны, складаны бяззлучнікавы, мае тры часткі, звязаныя паміж сабой пералічальнымі адносінамі. Схема: […], […], […].

[1]Дзятлы заняты звычайнай работай: [2]яны шукаюць у кары на абед чарвякоў (А. Якімовіч).

Сказ складаны, складаны бяззлучнікавы, мае дзве часткі, звязаныя паміж сабой удакладняльнымі адносінамі. Схема: […]: […].

І. 1) Прыбярэжныя кусты ўсё больш і больш выплывалі з ранішняга змроку святлелі і шырэй разгортваліся прыгожыя краявіды (Я. Колас). 2) Кудысьці спяшаецца цягавітая мурашка ўверх па сцяблінцы паўзе спакойная божая кароўка (І. Навуменка). 3) Своеасаблівы рытуал суправаджаў бортніка ў час падрыхтоўкі борці ён не піў не еў нічога тлустага трымаў у сакрэце сваю задуму (П. Сабіна). 4) Між надворкамі і вуліцай няма розніцы усё зарасло травою (П. Пестрак). 5) Ціха дагараюць лучыны за сценамі вые вецер (Н. Старавойтава). 6) Шмат зорак у небе добра жывёла расплодзіцца (Л. Дайнека). 7) Выглянула сонца неба ачысцілася ад хмар (В. Вольскі). 8) На твар чаплялася мокрае павуцінне за каўнер сыпаласяігліца (А. Варановіч). 9) Стол ламаўся ад страў відаць Дубатоўк быў з мясцовых заможных шляхцюкоў (У. Караткевіч). 10) Рыгор закінуў вудачку адразу клюнула (Р. Лупсякоў). 11) Пазнікаюць увосень насякомыя пакрыецца снегам насенне расліны няма чым карміцца птушкам (Я. Колас). 12) Наадварот я ўзрадаваўся ў навальніцу лягчэй будзе красці бэз (Б. Сачанка). 13) Згубіш не шкадуй знойдзеш не радуйся (прыказка). 14) Штодня дзятлы сядзяць на дрэвах ні мароз ні мяцеліца ні дождж не перашкаджаюць ім здабываць нялёгкаю працаю свой хлеб (З. Бяспалы). 15) І надвор’е, на такі выпадак, стала псавацца нізкія чорныя хмары



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

паўзлі нам насустрач там-сям з іх цягнуліся наўскос зямлі свінцовыя палосы дажджу (У. Караткевіч). 16) Вясна красавала свяціла цёплае сонца журчалі гаманлівыя ручаі буслы заўзята рамантавалі гнёзды у небе над полем звінеў жаваранак (Я. Крамко). 17) Ранак прынёс доўгачаканую навіну прыляцелі жаданыя госці! (В. Вітка). 18) Толькі адкаласуе жыта тут жа знікаюць у лесе грыбы (В. Грамыка). 19) Нешта мне ўсё было неспакойна чаму сёлета іх [птушак] так позна няма? (В. Вітка). 20) Валачобнікі ніколі не хадзілі адны за імі заўсёды цягнуліся дзеці (С. Давідовіч).

II. 1) Зямля размякла дрэвы стаялі паныла і нерухома (Л. Дайнека). 2) Адчайна вішчалі-скрыпелі калёсы раз-пораз чуліся зычныя галасы возчыкаў (А. Ненадавец). 3) Гістарычны факт за жыццё Ефрасінні не адбылося ніводнай міжусобнай вайны ў Полацкім княстве (М. Шахаўцова). 4) На аўтобусным прыпынку паглядзеў на расклад руху аўтобус павінен быў з'явіцца праз дваццаць хвілін (Я. Галубовіч). 5) На Соф'і была жоўтая прыгожая кашулька на правай руцэ тонкай і смуглай свяціўся бранзалет кіеўскага сіняга шкла з залатымі пражылкамі (Л. Дайнека). 6) Шмат сцежак пратоптана на двары багатая грэчка вырасце (Л. Дайнека). 7) На хатку пакінутую бабрамі нагамі не станеш яна адразу праваліцца (В. Вольскі). 8) Карэнні белыя тугія значыць, грыбы пачаліся і ўжо будуць да самай глыбокай восені (Б. Сачанка). 9) Пад вечар ляснік выйшаў на вялікую паляну сярод лесу і спыніўся мінулай ноччу ў авёс наведваўся мядзведзь (З. Бяспалы). 10) Праз гадзіну вецер суціх гром змоўк маланкі перасталі разрываць цёмнае неба (В. Вольскі). 11) Лесніка ад гэтай сустрэчы [з мядзведзем] нібы паралізавала ён не мог ні крыкнуць ні варухнуцца толькі глядзеў мядзведзю ў вочы (З. Бяспалы). 12) Сёлетняя вясна зусім іншая яна і раней прыйшла яна і трымаецца ўвесь час на радасць людзям (А. Кулакоўскі). 13) На ўсходзе зніклі зоркі чырвань нібы ад далёкага пажару пафарбавала небасхіл (Я. Крамко). 14) Ляскаталі лёгкія каляскі грукалі цяжкія наваленыя паклажай вазы (Я. Колас). 15) У такі час буслы ляталі па чарзе адзін ляцеў на здабыткі другі заставаўся ад ветру вартаваць гняздо (А. Пальчэўскі). 16) Гляджу ад лесу ў мой бок ляцяць буслы (Я. Крамко). 17) Нездарма ў нас кажуць лес і вада брат і сястра (В. Вольскі). 18) Я па ўсіх прыкметах бачу будзе сёлета багаты ўраджай (П. Панчанка). 19) Толькі часам закрычаць у небе дзікія гусі ключом пранясуцца жураўлі і схаваюцца ў сініх хвалях далёкага яснага неба (Я. Колас). 20) Зямля жыве ў бераг б'юць прылівы ў вырай адлятаюць жураўлі… (С. Грахоўскі).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

III. 1) Там-сям забуяла трава зелянелі кусты дрэвы (Б. Сачанка). 2) З безліч рэчак і ручаёў зліваецца вялікая шыракаплынная Прыпяць з мноства ручаін зліваецца і чалавечае жыццё (І. Мележ). 3) Выбух скалануў і пахіснуў зямлю хмара пяску і гліны ўздыбілася ў паветра і павольна асела (П. Броўка). 4) Нездарма ж кажуць сапёр памыляецца адзін раз (М. Гіль). 5) Шумяць непадалёку хвоі шапочуць бярозы (В. Бялоў). 6) Гаранскі запаволіў хаду ля партрэта стаяла Вікторыя (Р. Сабаленка). 7) Гэта быў закон у вясновы Мікольскі дзень ішоў земляроб на поле пабачыць пасевы і азімае жыта (М. Ракітны). 8) Вучоных хвалявала пытанне ці засталіся ў Еўропе белавежскія зубры? (А. Курскоў). 9) Ізноў шуміць машына ізноў заліваюцца салаўі (Я. Колас). 10) Раскацiста і гучна грымелі салаўі звону іх песень не маглі заглушыць грук і шум вагонных колаў (Я. Колас). 11) Максім аглянуўся на парозе прачыненых дзвярэй ляжаў Барон і пільна сачыў за сініцамі (І. Шамякін). 12) Ад роднай меданоснай ліпы пачынаецца мая дарога ў шырокі свет пайду я па гэтай дарозе (А. Бялевіч). 13) Ападаў цішэў вецер праз мутную павалоку хмар дзе-нідзе праразаліся нізкія мігатлівыя зоры (Б. Сачанка). 14) Выла гуло ў коміне секла снегам бы ўсё адно шротам у замураваныя холадам вокны (Б. Сачанка). 15) Палягло жыта ў нізінах месцамі вымакла бульба (Я. Галубовіч). 16) Сонца быццам адчуваючы сваю віну песціла і грэла зямлю у лесе пайшлі расці грыбы (Я. Галубовіч). 17) На гэтых палетках лілавее канюшына варушыцца вусаты ячмень цягнецца чапляе за ногі вільготнае і сакавітае сіло гароху (У. Караткевіч). 18) Праўда сёння яна [Надзея Яноўская] неяк пажвавела здавалася не такой непрыгожай відаць ёй падабалася новая роля (У. Караткевіч). 19) Пытанне было адзіным чаму не пазваніла Хэля? (А. Кавалеўскі). 20) Вольга прачнулася ад незразумелага шоргату ў пакоі па шыбе ціхенька брынькалі кроплі сакавіцкага дажджу (І. Міхайлава).

## Складаныя сказы камбінаванай будовы

***Практыкаванне 54. Прачытайце сказы. Патлумачце знакі прыпынку паміж часткамі складаных сказаў камбінаванай будовы. Укажыце разнавіднасці складаных сказаў камбінаванай будовы.***

I. 1) Мінула шмат часу, пясчаныя кручы параслі травою і лесам, а яшчэ праз гады зацішныя мясціны на беразе ракі аблюбавалі пад жытло людзі… (М. Гіль). 2) Сёння людзі ўжо не звяртаюцца да дрэў, каб яны іх



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вылечылі, але яшчэ можна пачуць паданні і павер'і аб дрэвах, у якіх чуюцца адгалоскі міфаў нашых продкаў (Л. Дучыц). 3) Вясною, калі пачыналі сеяць авёс, журавы вярталіся з выраю, і іх песня ўжо не была такой журботнай, як увосень (А. Бялевіч). 4) Было ўжо каля сямі гадзін раніцы, сцішана спявала радыё, на вуліцы крычалі пеўні, а ў вокны яшчэ ледзь цадзіўся шэры світанак (Л. Левановіч). 5) У аўтобусе пасажыраў было мала, ніхто з іх не падышоў да дзвярэй, каб выйсці (Ф. Янкоўскі). 6) Рост клубня бульбы адбываецца такім чынам, што ў здаровым стане ён зусім стэрыльны зверху: у яго ўтвараецца тонкі пласт тканкі ў якасці ахоўнай скурачкі (А. Вечар). 7) Палёт яго [бусла] быў размераны, паважны, а пад яго крыламі распасціраўся той таямнічы, нязведаны, дзівосны свет пушчы, пра які казаў бацька і які як мага хутчэй хацелася адкрыць хлопчыку (Т. Хадкевіч). 8) У той бок, адкуль найлепш выглядала гэтая даль, беглі разлогі шырокіх палёў, а на іх межах то там, то сям параскідаліся, як маладзіцы ў жніво, дзікія грушы (Я. Колас). 9) Пазірае на ўсё маладое насенне і вачам сваім не верыць: няўжо гэта тыя самыя малюнкі, на якія глядзела яно так нядаўна (Я. Колас). 10) Кожная галінка паспела за гэты час адцвісці, паасыпаліся драбнюткія блакітныя пялёстачкі, а лісты свежыя, зялёныя (В. Вітка). 11) Упэўнены: многія ведаюць, што адно і тое слова, сказанае рознымі людзьмі, па-рознаму ўздзейнічае на слухача (А. Казлоў). 12) Калі стаіш каля сцен гродзенскай Каложы, полацкай Сафіі, глядзіш на слуцкі пояс або гравюры Вашчанкі, гартаеш скарынінскія першадрукі або зборнікі Багушэвіча, учытваешся ў паэзію Купалы або Багдановіча, заўсёды цябе ахоплівае неадольная цікавасць: а якімі былі яны, гэтыя людзі, чыімі рукамі ствараліся такія скарбы? (А. Мальдзіс). 13) І, лежачы ў цемры з адкрытымі вачамі, я амаль да ранку думаў, што калі ўчора я вырашыў ехаць праз два дні з брыдкага месца і далей ад радавітай гаспадыні, дык зараз я застануся тут на тыдзень, два, тры, на месяц, каб разгадаць усе гэтыя таямніцы і вярнуць сапраўднаму чалавеку заслужаны ім спакой (У. Караткевіч). 14) Мелодыя ж спеваў [жаваранка] надзвычайна багатая, разнастайная, дзівосна прыгожая і такая выразная, што яе можна палажыць на ноты, а мастак-музыка, напэўна, змог бы выканаць на скрыпцы, але афарбоўкі яе тонаў не патрапіць перадаць ніякі музычны інструмент (Я. Колас). 15) Вяселле працягвалася і госці не разыходзіліся, бо было яшчэ рана (І. Кудраўцаў). 16) І нечакана для ўсіх аказалася, што Дзічок умеў прыгожа танцаваць, умеў усміхацца, і тады яго твар рабіўся светлым і прыгожым (В. Гапееў). 17) Тыя, хто прыйшоў у час, паехалі на машыне, а хто спазніліся, пайшлі пешкам (І. Шамякін).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

18) Пот заліваў вочы, але, каб не выдаць сваёй слабасці, хлопец не кідаў вёслаў (І. Шамякін). 19) Узыдзе месяц – і адразу ўсё зменіцца, павесялее наваколле, святлом заіскрыцца іней (А. Чарнышэвіч). 20) Не раз было: з далёкай далі далі к сваёй вярталіся зямлі яны, каго ўжо не чакалі, па кім і слёзы пралілі (А. Бачыла).

II. 1) Прыгожы быў увесь гэты звычайны, будзённы малюнак: вялікая лодка на вадзяной пустыні, у лодцы шэры дзед і светленькая ўнучка-гарэза, а за кармой, на буксіры, доўгае бервяно і яшчэ даўжэйшы трохкутнік растрывожанай вады (Я. Брыль). 2) У паветры звіняць пчолы, пры дарозе стракочуць конікі, а з поўдня мяккі вільготны вецер прыносіць мядовы пах канюшыны (В. Дайліда). 3) Дождж парадзеў, неўзабаве з блакітнага прасвету выглянула сонца, і над Дзвіной, злучаючы яе берагі, паўстала яркай дугой у сваіх сямі колерах вясёлка (Т. Хадкевіч). 4) Хлапчук то прыпадаў да самай зямлі, заміраў і чуў, як усхвалявана трапечацца разагрэтае вясёлым паляваннем сэрца, то кідаўся на кветку з матыльком, сціскаў галоўку кветкі ў далонях, але ў самы апошні міг матылёк вырываўся ў неба (Л. Дайнека). 5) Мы ішлі па мяжы, і, хоць на ёй было вузка, дзед вёў мяне за руку (Я. Брыль). 6) Найбольшая бяда мінала, і каб не той небарака Ціханаў, дык Ляўчук, мабыць, быў бы задаволены сваім сённяшнім лёсам (В. Быкаў). 7) Калі дзень адыходзіць і вечар на зямлі кладзе доўгія цені сэрца тужыць паціху аб нечым і злятаюць ізноў летуценні (М. Машара). 8) Бабініч належаў да тых людзей, якія не так-та лёгка адступаюцца ад сваіх планаў, і ён да таго часу не пакідаў Лабановіча, пакуль не ўзяў з яго слова пабыць у яго ў гасцях (Я. Колас). 9) Сам па сабе Цярэшка негаваркі, і цяпер, адчуваючы, што ён хоча нешта сказаць, я радуюся выпадку, не перабіваю яго і стараюся ўсёй сваёй істотай выказаць увагу (Т. Хадкевіч). 10) Нарэшце дзённыя і начныя турботы змарылі хлопцаў, і яны заснулі так моцна, што, мусіць, цяпер іх не разбудзіў бы ні гром, ні мароз (Я. Маўр). 11) Пасажыраў у вагоне было нямнога, і Лабановіч пераходзіў ад аднаго акна да другога, каб разгледзець гэту мясцовасць і хоць прыблізна адгадаць, дзе яго новая школа (Я. Колас). 12) Як не можа быць дзіцячага пісьменніка, які не разумее і не любіць дзяцей, так не можа быць настаўніка, што выбраў спецыяльнасць не па закліку душы (В. Вітка). 13) Шмат сплыло вады з гадамі, шмат крыві было праліта, каб цвіла зямля садамі, каб шумела спелым жытам (А. Звонак). 14) Так, відаць, бывае з кожным: адлучышся на якія тры дні з дому і ўжо ду-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

маеш, што там многае змянілася (А. Асіпенка). 15) Зірнеш – і зрэдку дзе ўбачыш адзінокі яблык, што блішчыць між лісця на апошнім сонцы (Я. Сіпакоў). 16) Мне толькі дзіўна было: як гэта дазнацца, дзе тая пасцель, куды кладзецца сонца адпачываць (І. Грамовіч). 17) Пад вечар надвор’е пайшло на папраўку: разагнаўшы хмары, вецер сціх, а неба паяснела і пацяплела (В. Карамазаў). 18) Віктар спыніўся пад шыльдай, на якой былі напісаны маршруты аўтобусаў і нумар пляцоўкі, яшчэ раз прачытаў назвы, каб упэўніцца, што не памыліўся, пасля глянуў на вялікі круглы гадзіннік над уваходам у вакзал і з палёгкай уздыхнуў: да адыходу аўтобуса заставалася яшчэ хвілін дваццаць (А. Варановіч). 19) Удзень наплылі хмары і пайшоў снег, каб растаць неўзабаве, і зноў ішлі дажджы, і зноў падсыхала зямля, але не прападаў ужо вецер, золкі і пранізлівы (М. Стральцоў). 20) Мабыць, усяму ў прыродзе ёсць сваё месца і прызначэнне: воронам трэба спускацца на ржышча, каб знайсці там ежу, паветра павінна быць празрыстым, каб праз яго добра бачылі вочы, а лісцю трэба адрывацца ад галін таму, каб выжыў зімою клён і на лета зноў закрасаваў зялёным сакавітым лісцем (У. Рубанаў).

***Практыкаванне 55. Расстаўце знакі прыпынку паміж часткамі складаных сказаў камбінаванай будовы. Зрабіце поўны сінтаксічны разбор складаных сказаў камбінаванай будовы ў наступным парадку:***

***1) падзяліце на часткі;***

***2) вызначце ў кожнай частцы граматычную аснову;***

***3) укажыце тып складанага сказа;***

***4) вызначце від сувязі паміж часткамі складанга сказа камбінаванай будовы (злучальная, падпарадкавальная, бяззлучнікавая);***

***5) намалюйце схему сказа.***

Узор сінтаксічнага разбору складанага сказа камбінаванай будовы

[1]У паветры звіняць пчолы, [2]пры дарозе стракочуць конікі, а [3]з поўдня мяккі вільготны вецер прыносіць мядовы пах канюшыны (В. Дайліда).

Сказ складаны, камбінаванай будовы, з бяззлучнікавай і злучальнай сувяззю. Схема: […], […], а […].

[1]Прыгожы быў увесь гэты звычайны, будзённы малюнак: [2]вялікая лодка на вадзяной пустыні, [3]у лодцы шэры дзед і светленькая ўнучка-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гарэза, а [4]за кармой, на буксіры, доўгае бервяно і яшчэ даўжэйшы трохкутнік растрывожанай вады (Я. Брыль).

Сказ складаны, камбінаванай будовы, з бяззлучнікавай і злучальнай сувяззю. Схема: […]: […], […], а […].

I. 1) Ланцужкамі звіваюцца сляды птушак накапычана каля мелкаводдзя аленямі а воддаль пралягла глыбокая разора ад вялікіх капытоў прыходзіў напіцца насарог (М. Чарняўскі). 2) Мокрыя сэрцападобныя лісці яшчэ зусім зялёныя цьмяна блішчалі з іх падалі празрыстыя кроплі і куст плакаў (У. Караткевіч). 3) Пачуўшы што прыйшлі весткі ад Францішакавага сына які першы з вёскі пайшоў служыць у савецкае войска з ахвотаю падышлі астатнія мужчыны абступілі іх кожнаму цікава што піша зямляк (Г. Далідовіч). 4) У жыцці яно Янка так бывае ўдзесяцёх воз цягнуць а адзін мярзотнік суне палку ў кола і ўвесь воз спыніцца (А. Асіпенка). 5) А там дзе першы крок рабілі дзе нашы мацеркі жывуць растуць бярозы і рабіны і лісце падае ў траву (Г. Бураўкін). 6) Звычайна янот стараецца схавацца ў норку але калі яго дагналі і ратунку няма ён абараняецца мужна і заўзята (В. Вольскі). 7) Турсевіч пісаў што ён надумаўся паступаць у настаўніцкі інстытут і калі Лабановіч будзе праводзіць лета ў сваёй школе дык ён ахвотна прыехаў бы туды на час каб рыхтавацца ў інстытут (Я. Колас). 8) Станіслаў Іванавіч хвалюецца а сын Юрка пра якога гавораць што ён як дзве кроплі вады падобны да бацькі спакойны (І. Навуменка). 9) К абеду туман сыходзіў і тады ў палях і лугах рабілася так празрыста і чыста што выразна былі бачны кожная капа сена і кожны крыжык ячменю кожны кусцік і кожны гаёк (Я. Сіпакоў). 10) Здзіўляюць малюнкі прыроды якія выпісаны так дэталёва з такой мастацкай сілай што здаецца ты сам сядзіш у двары на лавачцы і прыслухоўваешся да гукаў вясковага вечара (М. Лупсякоў). 11) Ля абеліска стань і памаўчы тут не згасае памяць аб героях што смерцю смерць змаглі перамагчы (А. Звонак). 12) Мальвіна верыла што Орлік разумее кожнае яе слова калі хваліла і лашчыла ён цёрся аб яе плячо а ўшчувала вінавата згінаў галаву і прыплюшчваў вялікія вочы ступаў павольней баючыся гаспадынінага гневу (С. Грахоўскі). 13) У яго так балела галава і гарэлі вочы што сон не прыходзіў (І. Мележ). 14) У дзеда Талаша было многа розных праектаў але паколькі гэта справа мела грамадскі характар то дзед палічыў правільным перадаць яе на вырашэнне грамады (Я. Колас). 15) Яшчэ шалясцелі густыя зараслі яшчэ хісталіся вершаліны дрэў але вецер сціх (Э. Самуйлёнак).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

16) Хмара стала цёмна-сіняй запальваліся белыя зігзагі маланак і дальні грукат грымотаў сатрасаў паветра (Э. Самуйлёнак). 17) Раптам прабегла маланка ў даліне ўспыхнула белае святло і аглушальна ўдарыў гром (Э. Самуйлёнак). 18) Тры бярозкі што стаяць на дарозе ад камбіната да вёскі мала і адчувалі тую вясну плакучае голле іх было яшчэ застылае не абагрэтае сонцам часамі мокрае а то і скаванае лёдам (А. Кулакоўскі). 19) Залатая рыбка махнула сваім празрыстым шыкоўным як шлейф каралевы хвастом і стаўся цуд упершыню пасля доўгай зімы з акна ў акварыум заглянула сонца (Я. Брыль). 20) Дзеравяная сцяна аддзяляла кватэру Лабановіча ад школьнае залы і каб папасці туды трэба было адчыніць нізкаватыя дзверы (Я. Колас).

II. 1) Пашкоджаныя вежы [Ружанскага палаца] разабралі а вакол галоўнага параднага фасада ўзвялі новыя збудаванні што надавала палацу большую велічнасць і прыгажосць (В. Супрун). 2) Разгуляўся красавік сонца прыпякала так што з лясных снегавых запасаў пацяклі ручаі (Я. Крамко). 3) У двары быў кветнік а праз увесь двор цягнулася густой градой чаромха якая звешвала сваё галлё цераз невысокі паркан у суседні двор (І. Шамякін). 4) Неба на паўднёвым захадзе густа засінела адтуль прабег слабы свежы ветрык і хутка сіні кавалак неба ператварыўся ў свінцовую хмару (Т. Хадкевіч). 5) Усё нібы змянілася рунь пагусцела стала больш красак на ўзмежку а дальні ўзгорак на якім быў пасеяны авёс засінеў нібы хто пафарбаваў яго (Т. Хадкевіч). 6) Усюды куды ні глянь бель і бель і не можа вока абняць гэтую белую сцяну (Я. Колас). 7) На рэдкіх прагалінах выглядала ярка-зялёная дзераза а ў наледзянелых яшчэ гнёздах ляжалі палушчаныя за зіму шышкі пакуль што чакалі сваёй пары круглыя лісты пралесак (Х. Лялько). 8) Сёння возера Свіцязь з навакольным лесам аб’яўлена помнікам прыроды там расце мноства рэдкіх парод і дрэў якія нават занесены ў Чырвоную Кнігу (Я. Сіпакоў). 9) Часам роўная страла злучала неба з зямлёй і там дзе яна кранался зямлі ўсё быццам плавілася з рэзкім сіпеннем (Т. Хадкевіч). 10) Бушавалі суровыя навальніцы над ім [дубам] змяняліся часы і падзеі але жыла родная зямля з яе свабодалюбівым народам непакорным прагным да волі і жыцця і дуб як бы ўвасобіў гэтую магутнасць і непакорнасць сваёй зямлі (Т. Хадкевіч). 11) Каля гэтай вёскі было многа камення і вялікага і малога туды ўсе ездзілі па каменне калі трэба было рабіць падмурак для новай хаты (У. Бутрамееў). 12) Сонца ходзіць дзесьці за аблокамі і ты ўжо амаль забыўся што яно наогул ёсць на небе



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(В. Хліманаў). 13) Па небе плылі беласнежныя кучаравыя воблакі а па моры ад гэтых воблакаў раз-пораз праплывалі цені ў якіх здавалася вада станавілася сінейшаю (А. Цяжкі). 14) Лютавала суровая зіма трашчалі маразы і вылі снежныя завірухі (А. Чарнышэвіч). 15) Пераганялі адна адну свінцовыя хмары і калі выглядала сонца цені дрэў адбіваліся ў лясным возеры (І. Гурскі). 16) Гляджу з акна снягі паволі таюць і сонца ўстала гожае як след паветра зноў папоўніцы глытаю і цешуся што зарунеў сусвет (Л. Геніюш). 17) Калі сонца не ўзыходзіць над сусветам цьма калі мілы не прыходзіць радасці няма (А. Русак). 18) Калі пасля працяглай паездкі вяртаешся ў горад у якім жывеш і які лічыш родным усё здаецца табе тут інакшым чым ты пакідаў як быццам і людзей на вуліцах стала больш і рух аўтамашын і трамваяў жвавейшы пашырэлі вуліцы і плошчы пасвятлелі сцены будынкаў прыбавілася дрэў і кветак на бульварах у парках і скверах (Т. Хадкевіч). 19) Затым сонца адарвалася ад зямлі і белая вясёлка знікла і верас лёг перад вачыма ўпрыгожаны мільёнамі павуцінак якія ззялі ў кроплях расы (У. Караткевіч). 20) Кастусь чакаў Танін атрад а яго ўсё не было і не было а калі перастаў чакаць ён прыйшоў (А. Кудравец).

## Простая, няўласна-простая і ўскосная мова

***Практыкаванне 56. Прачытайце сказы. Патлумачце знакі прыпынку пры простай мове.***

I. 1) Потым, калі мы вярнуліся ў пасёлак Майскі і сядзелі ў новай, жоўценькай хаце дырэктара леспрамгаса Анохіна, я пахваліўся:

– Вось, нарэшце, і я пабываў у Саянах, пабачыў сапраўдную тайгу (Я. Сіпакоў).

2) – Свіцязь! – нібы робячы самае важнае ў жыцці адкрыццё, радасна ўскрыкнуў Лесавік (Я. Пархута).

3) Толькі на трэцім уроку, калі была геаграфія, Васіль Пятровіч уважліва агледзеў карту і, звяртаючыся да нас, сказаў:

– Паглядзіце, дзеці, і скажыце, якія памылкі дапусціў наш Лёнька?

– Кенгуру водзяцца ў Аўстраліі, – растлумачыла з задняй парты Любка.

– А пінгвіны жывуць у Антарктыдзе, – дадаў нехта.

– Вось бачыш, Лёня, – з дакорам прамовіў Васіль Пятровіч (М. Даніленка).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4) “Слухайце, што я скажу вам, сябры-дубы! – пачуў аднойчы мудры дуб. – Я хацеў бы, каб ваша радасць не мела канца і ваша доля была яшчэ шчаслівейшая” (Я. Колас).

5) – Прабачце, панове, за жарт, – сказаў Кроер. – Іначай ніхто не прыехаў бы (У. Караткевіч).

6) Пасля першай страфы Аляксей папрасіў: “Памагайце”, – і яны заспявалі разам: “З гэтай пары я пачаў углядацца ў неба начное і зорку шукаў (С. Грахоўскі).

7) Амаль хорам дзеці сказалі: “Добры дзень!” – і хлопчыкі знялі шапкі (І. Шамякін).

8) – Збіраецца на дождж… – прамовіў старшыня і дадаў незадаволена: – А ў нас яшчэ не ўсё сена ў стагі зложана (У. Краўчанка).

9) – Што, брат, прыціх? – запытаў яго [Лабановіча] Турсевіч. – Чаго зажурыўся?

– Не заўсёды ж вясёлым быць, – адказаў Лабановіч. – Ведаеш, брат, як пабачыў я тваю школу, твае заняткі, то мая школа ў параўнанні з табою нікуды не гадзіцца (Я. Колас).

10) Глянуў Віктар – і вачам сваім не верыць. “А дзе ж човен?” – “Не ведаю.” – “Як жа так?” – “Ды так. Паплыў.” – “Што ж гэта такое?” – “Прыгода” (Я. Маўр).

11) Хлопцы выскачылі з хлява і з захапленнем паглядзелі адзін на аднаго. Але што далей? Ініцыятыва перайшла да Даніка.

– Коля! Ляці да Старога!

– А хто стары?

– Поп.

– Які поп?

– Аляксей Сафронавіч (І. Шамякін).

12) Сцяжынка сцяжынцы гаворыць: “Сяброўка! Вядзі на прастор іх да роднага слоўка, каб вусны не сохлі, каб сэрцы не смаглі, каб слёзы да кроплі на вейках ачахлі” (М. Лупсякоў).

13) Настаўнік сказаў старэйшым вучням, каб яны рыхтаваліся да экзаменаў (Я. Колас).

14) Людзі кажуць, што калі рана ўзарэш, то і ўраджай добры збярэш.

15) “Янка Купала і Якуб Колас прыйшлі ад зямлі, ад сахі, прынеслі ў літаратуру багацце і хараство беларускай народнай мовы, якая пад іх пяром заззяла ўсімі сваімі колерамі”, – пісаў Кандрат Крапіва (Р. Шырма).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

16) Успомнім шэдэўр Багдановічавай паэзіі “Слуцкія ткачыхі”:

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы (К. Чорны).

17) Янка Купала клікаў народ да змагання за чалавечыя правы – “людзьмі звацца” і ісці “да сонца і да зор” (К. Чорны).

18) “Я пайду адна,” – сказала Зоська. Антон адказаў: “Не, адну я цябе не пушчу” (В. Быкаў).

19) “Ці далёка нам яшчэ ісці, мама?” – спытаў Міхалка, адышоўшы крыху. “Не так ужо далёка, крапіся крыху,” – адказала Маланка, кінуўшы погляд усцяж гасцінца (Ц. Гартны).

20) “Пісьменнік вялікай душы,” – кажуць пра Кузьму Чорнага людзі, якія добра ведаюць яго творы (К. Крапіва).

II. 1) – Я не магу дапамагчы вам сёння, – задумліва прагаварыў Свеціловіч. – Тое, што я сёння павінен знайсці, больш важлівае. Магчыма, сёння дзікае паляванне наогул не з’явіцца. У яго на шляху паўстане перашкода... (У Караткевіч).

2) – Міленькі ты наш! – звярнулася да дзятла галка. – Прыляцелі мы да цябе ад птушынай грамады.

– Дуб стары занядужаў, той, што стаіць над рэчкаю, – далучыўся да галкі дрозд. – Слаўны такі дуб, і ты, дзятлік, патурбуйся і адведай хворага. Усе мы просім цябе (Я. Колас).

3) Ракуцька занепакоіўся: “А можа, я каго пакрыўдзіў?” (К. Чорны).

4) “Крывёнак, пабудзі Папова, – загадвае старшы сяржант, варушачы вусамі. – Я да камбата” (В. Быкаў).

5) “Давай едзь! – прыспешыў Брытвін. – Мы чакаем. А тады дамовімся (В. Быкаў).

6) Алесь Іванавіч хацеў запытаць: “Хутка пойдзем?” – але прамаўчаў (А. Пысін).

7) 1) Генерал выйшаў у завіруху і крыкнуў: “Па конях!” – хоць усе былі іменна на конях (П. Пестрак).

8) Вось пішу: “Жывая, здаровая, хадзіла на танцы”, а сама плачу ад сораму, што хлушу (С. Грахоўскі).

9) Бацька, выпраўляючы мяне ў свет, казаў: “Ведай, сынку, што нічога лёгка не даецца” (І. Гурскі).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

10) “Я не ведаю, – пісаў між іншым Лабановіч, – як паставіцца да твайго намеру паступіць у настаўніцкі інстытут. Мяне асабіста ён не дужа вабіць” (Я. Колас).

11) – Нарысуй мяне, Алесь, – просіць Шурка.

– А што дасі? – пытаюся.

– Жыта.

– Колькі жыта?

– Мяшок або яшчэ мнажэй.

– Ды не мнажэй, а трэба казаць: больш, – зноў папраўляе Ніна (Я. Брыль).

12) Вясна, брат, дружная, – загаварыў дзед а пасля дадаў: – І вяснянка бач як заліваецца (Т. Хадкевіч).

13) “Сапраўднае хараство мовы, што дзейнічае як сіла, – пісаў Горкі, – ствараецца дакладнасцю, яснасцю, гучнасцю слоў…” (К. Крапіва).

14) “Ты спіш? – ціха спытаў бацька і тут жа загадаў: – Пара ўставаць” (М. Гарэцкі).

15) “Ой, не ляці, Арцёмка, не ляці…” – “Чаму?” – “Я баюся,” – шчыра сказала сястрычка (М. Гамолка).

16) “Што, добра рыба клявала?” – спытаў Андрэй. “Каб сказаць добра, то – не,” – ахвотна загаварыў Макаравіч (А. Кулакоўскі).

17) – Хочаце? Пойдзем сёння гуляць?

– Пойдзем, пойдзем! – падхапіў настаўнік, – вы, можа, не паверыце, а ў мяне, чэснае слова, была гэта самая думка, толькі я не адважваўся сказаць вам (Я. Колас).

18) Янка Купала і Якуб Колас прыйшлі ад зямлі, ад сахі і “прынеслі ў літаратуру багацце і хараство беларускай народнай мовы, якая пад іх пяром заззяла ўсімі сваімі колерамі” (К. Крапіва).

19) “Дзякую вам, дзеці мае, – звярнуўся дуб да сваіх жыхароў, а потым усміхнуўся і дадаў: – усюды і ва ўсім трэба мець розум і ведаць меру” (Я. Колас).

20) “Навошта ж яму кошык на зіму?” – думаю сам сабе і пытаюся:

– А што будзеш з кошыкам рабіць? Ці не карасёў на панскай сажалцы цягаць? (Я. Галубовіч).

***Практыкаванне 57. Прачытайце сказы. Знайдзіце няўласнапростую мову. Патлумачце яе пунктуацыйнае афармленне.***

І. Дык вось ён які, новы паваротак у жыцці! У якім жыцці? У бяздомніцтве, у блуканні паміж небам і зямлёю. Спадзявацца няма на каго.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Пакладайся толькі на самога сябе, ніадкуль не чакай дапамогі… Не, няпраўда: брат Уладзімір ужо дапамог, паправіў сам сябе Лабановіч. А людзі? Хіба свет без добрых людзей? А таму, пакуль ты яшчэ вольны, пакуль служаць ногі, ідзі! Ідзі ўперад па бездарожжы, па цаліне, пракладай новы след. Адно толькі памятай: не збочвай з вернай дарогі… (Я. Колас).

II. О зямля! Ты даеш нам тугу па небе, але не меншая наша туга па табе. З далёкіх і блізкіх дарог вяртаемся мы да цябе, і спеў жаваранка аглушае нас не меней, чым гул рэактыўнага самалёта. Неаднойчы так было і са мной, і часта я думаў: навошта выбіраць паміж жаваранкам і рэактыўным самалётам? Хіба ж нельга, каб было і тое, і другое? І, мусіць, не ўся праўда ў дзядзькі Ігната, праўда ў таго, у каго яе больш (М. Стральцоў).

III. Зоська доўга не магла варухнуць ні рукой, ні нагой, але ўвесь час яе непакоіла думка пра Антона. Чаму ён такі? Ці, можа, такі ён нарадзіўся, пераняўшы характар продкаў? Або яго гэткім рабіла жыццё? Але хіба ягонае жыццё было горшае, чым маё, з паўсядзённай працай дзеля кавалка чорнага хлеба, у малазямеллі? Так жыла тут большасць людзей, але кожны чалавек нават з самай глухой вёскі ведаў, што нельга рабіць супраць сумлення, нельга ісці супраць сваіх (В. Быкаў).

***Практыкаванне 58. Спішыце. Расстаўце знакі прыпынку пры простай мове.***

I. 1) Ці дзед хвор пытаў хлапчына што хапаешся за бок (Я. Колас). 2) Няўжо я на самай справе баязлівец і няўмека запытваў Рыгорка самога сябе ў думках і тут жа ўпэўніваў не не можа быць (Т. Хадкевіч). 3) Як я толькі нарадзіўся бацька сказаў кепска будзе (Ф. Багушэвіч). 4) І Лявон узяўшы рукамі галоўку сваёй пацехі моцна прыціснуў да сябе а Марыська тулячыся да бацькавых грудзей прашаптала татачка а чаму паміж людзей я не знайшла каму пажаліцца (Ядвігін Ш.). 5) Скажы мне Раман што гэта ў вас за чалавек з'явіўся пытаў стражнік у соцкага (Я. Колас). 6) Што ж гэта за сям'я насцярожана спытаў я і дзе я (У. Караткевіч). 7) Я вас бачыла зноў паўтарыла яна [Яноўская] але хто вы я не ведаю вас (У. Караткевіч). 8) Надзея Раманаўна сказаў я холадна ваш дом моцная крэпасць (У.Караткевіч). 9) Не рабі чорную справу не пралівай кроў звінеў у душы голас маці як звініць царкоўны звон шырока і неадступна (Л. Дайнека). 10) Што ж хай пакаштуюць агню тэўтоны пасля некато-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рага роздуму сказаў Вячка і працягнуў самі звілі вяроўку свайго жыцця (Л. Дайнека). 11) Я прыйду адказаў Панас хутка прыйду на сход да вас (П. Галавач). 12) Лепш ты раскажы, дзе быў, чаму мяне аднаго так надоўга пакінуў. Я, брат, далёка быў. Аж у Маскве (Б. Сачанка). 13) Пачуўшы спрасонку на вуліцы нечы крык немцы я ўсхапіўся з пасцелі і вобмельгам кінуўся на агароды (Б. Сачанка). 14) Не прыйдуць заўтра вучні падумаў Лабановіч (Я. Колас). 15) Я не такая з роздумам прызналася Лада і тут жа горача запэўніла але не стала горшая, тата! (І. Шамякін). 16) Запаведнік на рацэ Бярэзіне кажа дырэктар быў створаны ў 1925 годзе (В. Вольскі). 17) Войкнуўшы і сказаўшы а Божачка гаспадыня пайшла ў сенцы, узяла з куфра палатна… (Ф. Янкоўскі). 18) Бяда, бабка Наста здушаным голасам сказала Аўгіння я прыйшла вас папярэдзіць (Я. Колас). 19) Смеласці вучыся ў разведчыка асцярожнасці ў мінёра а кемлівасці ў народнага мсціўца сказаў Пятрусь а потым падумаўшы дадаў у партызанах мне даводзілася быць і разведчыкам і мінёрам і дыверсантам (М. Корзун). 20) Я хачу прыгадаць нашым паэтам словы баяна беларускага народа, Янкі Купалы, якія патрэбны нам песні Трэба нам песень шчырых і чулых, Што праўду дзён нашых полюсаў неслі б І славу вякоў, пакаленняў мінулых Сваёй перамогай геройскай устрэслі (Я. Колас).

II. 1) Лось, грацыёзна павярнуўшы ў бок нечаканага візіцёра галаву, паварушыў вялікімі вушамі, страсянуў грывай і застаўся стаяць на месцы, быццам гаворачы ідзі, чалавеча, ідзі, куды ідзеш (А. Рыбак). 2) Напэўна, гэта ты мне памагла, бабка, сказаў настаўнік, усміхнуўшыся (Я. Колас). 3) А як заўтра спытаў Янка пойдзем ці не (Я. Колас). 4) Як падрасту ўрэшце сказала Марынка паеду да цёткі Зіны і завязу ёй сваю Жанну (У. Ліпскі). 5) Каб усе былі такія, як вы з некаторым засмучэннем сказала Надзея не забывайце нас (Я. Колас). 6) Вось дзе паэзія ўсклікнула Марыля, даслухаўшы да канца рыбакова апавяданне [пра возера Свіцязь], і, зазірнуўшы ў Адамавы вочы, папрасіла: напішы пра гэта, Адам (К. Цвірка). 7) Год назад, калі Міця закончыў дзевяць класаў, бацька спытаў што будзеш рабіць далей, можа, хопіць навукі (І. Навуменка). 8) Галінка-вярбінка прасіў верабей мо пакалыхала б маіх ты дзяцей (М. Танк). 9) За ляском гаворыць старшыня прыдатнае месца для будаўніцтва фермы (У. Краўчанка). 10) Папаўся адразу зразумеў Сяргей і тут жа насцеражыўся а Клава што з ёю (І. Мележ). 11) Ордэн мацнее, бацька, запярэчыў Канстанцін з ім сябраваць трэба (В. Іпатава). 12) Чаму гэта сказаў мой бацька Гараська так даўно не быў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

у нас (Я. Баршчэўскі). 13) Мамачка, галубка, просіць сын так міла, можа б ты на рэчку пагуляць пусціла (Я. Колас). 14) Многія людзі ведаюць словы К. А. Ціміразева скібка добра прапечанага хлеба… складае адно з найвялікшых вынаходстваў чалавечага розуму (А. Сілянкоў). 15) Зараз пойдзем сказаў Антон давай руку уставай пагрэй ногі (В. Быкаў). 16) Я даставіў абед далажыў старшына і дадаў тут непадалёку бліндаж ёсць хадземце і вы абедаць (А. Марціновіч). 17) Не, Сцяпан сказаў я сам сабе тут табе не месца, цябе машына чакае (І. Гурскі). 18) Скора падышоўшы к сталу, ён [Хама] зразу пытае ў чым дзела хлопцы і, не чакаючы адказу, заглушае ўсіх сваім зычным голасам (К. Чорны). 19) Здароў быў павітаўся Васіль і спытаўся ў Антося а ці няма ў вас, дзядзечка, Юркі (А. Жук). 20) На беразе Дняпра хлопцы спыніліся як жа пераправіцца на другі бераг занепакоіліся яны (М. Зарэцкі).

**Складаны сказ.** ***Кантрольны тэст***

***Частка А***

***А1. Адзначце складаназлучаныя сказы.***

1) Рэцэптура прыгатавання квасу вылучалася значнай разнастайнасцю не толькі ў межах Беларусі, але ў адной і той жа мясцовасці (В. Цітоў).

2) Снег памалу днём растае і з шоргатам асядае, а ўначы пакрываецца ледзяной скарынкай (з часопіса “Родная прырода”).

3) Зрэдку праз хмару цвіком прабіваўся серабрысты прамень, а ўсё навокал адразу ж весялела і шырэла, як бы абяцаючы людзям хуткую пагоду (В. Коўтун).

4) Успыхне бліскавіца, асвеціць залацістыя краі воблакаў – і зноў змрок (І. Грамовіч).

5) У адзін момант усё пазелянела ў вачах Максіма і лес закружыўся, заскакаў (Я. Колас).

***А2. Адзначце сказы, якія адпавядаюць схеме* [...], і [...]. (*Улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены.*)**

1) Пастушок між тым азірнуў з дарогі свой невялічкі статак ляснуў у паветры пугай і падышоўшы бліжэй моўчкі сеў на ўскрайку дарогі (В. Быкаў).

2) Вецер дзьмуў і шумеў па-над Нёманам бор (М. Танк).

3) Мне было сцюдзёна пасля хваробы аднак я пайшоў і хадзіў доўга і на хваробу сваю забыўся (М. Гарэцкі).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4) Атрэсеныя яблыкі і грушы насыпаны былі ў сенцах каля сцен і пахлі на ўсю хату (К. Чорны).

5) А назаўтра ў нядзелю з самага ранку расчысцілася неба і сонца пачало прасушваць зямлю (К. Чорны).

***А3. Адзначце складаназалежныя сказы з дадатнай азначальнай часткай.***

1) Ён [Сяргей Фёдаравіч] зірнуў у той бок, дзе рэчка рабіла круты паварот і гублялася ў густых зарасніках, і застыў ад здзіўлення (Я. Зазека).

2) Хто ў цемру глядзіць, той ад святла крывіцца (прыказка).

3) Князёўна зняможана пахілілася, прыпала да марозлівай дубовай сцяны церама і ўсё глядзела ў той бок, адкуль павінен прыйсці яе лёс (Л. Дайнека).

4) Гусоўскі чытаў імёны людзей, што жылі на пятнаццаць стагоддзяў раней за яго (У. Арлоў).

5) Над балотам у фіялетавым небе загарэлася зорка, быццам узняў нехта ліхтарык (А. Асіпенка).

***А4. Адзначце складаназалежныя сказы, часткі якіх звязаны пры дапамозе злучнікаў.***

1) Ёсць мовы, што дапамагаюць мець між сабой зносіны ўсяго нейкай сотні-другой чалавек (Я. Сіпакоў).

2) Найважнейшай славутасцю пасёлка Ружаны, што ў Пружанскім раёне Брэстчыны, з'яўляюцца рэшткі вялікага архітэктурнага комплексу на пагорку побач з рачулкай (В. Супрун).

3) Старажытныя насельнікі Беларусі прыстасоўвалі да прыродна-кліматычных умоў свае звычаі, абрады, працоўную дзейнасць, традыцыі, бо толькі такім чынам можна было выжыць у цяжкіх і складаных умовах жыцця (Э. Дубянецкі).

4) Дзядзька ставіў на акно свечку, каб падарожныя сяляне, перакупшчыкі і купцы, шляхта і вандроўнікі цягнуліся праз завею на агеньчык, як матылі ўлетку (Г. Кісялёў).

5) У княжную палату, дзе ў вясёлыя вечары збіралася бяседа на сто чараў, зазірала сонца (У. Арлоў).

***А5. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх злучальнае слова выконвае сінтаксічную функцыю дзейніка.***

1) Лепшымі куфрамі лічацца тыя, якія робяць у Іванаўскім раёне на Палессі (У. Караткевіч).

2) Добрымі духамі, што спрыялі чалавеку, бераглі яго ад напасці, былі Берагіні (У. Арлоў).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) Нарэшце выпаў снег і белай коўдрай закрыў яблыкі, якія не паспелі з'есці лясныя жыхары (І. Сіляўка).

4) Мабыць, памыляюцца тыя, хто бачыць у восені толькі заміранне жыцця (І. Навуменка).

5) Што пасееш, тое і пажнеш (прыказка).

***А6. Адзначце складаназалежныя сказы з сузалежным аднародным падпарадкаваннем.***

1) Вада і вада, куды ні паглядзі, куды ні кінь вокам (Б. Сачанка).

2) Калі ж, каб пракарміцца, звяроў і птушак не стала хапаць, чалавек прылаўчыўся сеяць збожжа, садзіць гародніну (Б. Сачанка).

3) І калі спынялася машына на станцыях і паўстанках і заціхаў шум поезда, з балот даносіліся хвалі незвычайна мяккіх зыкаў крахтання жаб (Я. Колас).

4) Прыпяцкі запаведнік створаны ў першую чаргу для таго, каб захаваць у натуральным стане палескі ландшафт і каб вывучаць тыя змены ў прыродзе, якія выклікае асушэнне балот Палескай нізіны (В. Вольскі).

5) І як неабходна юнаму чалавеку з дня ў дзень адчуваць і разумець непаўторнасць тых мясцін, дзе нарадзіўся, той зямлі, якую называюць Радзімай! (А. Белакоз).

***А7. Адзначце складаныя бяззлучнікавыя сказы, паміж часткамі якіх ставіцца двухкроп'е.***

1) З вялікіх асветленых акон грыміць радыё праз белую павалоку фіранак відаць зеляніна вазонаў… (Я. Брыль).

2) Я кінуў некалькі ў рот і ажно заплюшчыў вочы ніколі не еў такіх смачных чарніц! (П. Місько).

3) Яшчэ не сказаў пра адну дзівосную ўласцівасць гэтай расліны [мяты] яна ахоўвае чысціню вады (В. Вітка).

4) Пустая душа пустая ўсмешка (А. Асіпенка).

5) Яна [сарока] паведамляла на паляну імчыць статак зуброў! (Я. Пархута).

***А8. Адзначце складаны(я) сказ(ы), часткі якога (якіх) звязаны злучальнай і падпарадкавальнай сувяззю.***

1) Вось перарвалася апошняя нітачка, і клён адчуў, што ў ягоным целе ўжо няма бязлітаснага сцюдзёнага жалеза (У. Арлоў).

2) Напэўна, кожнаму здаецца, што няма нідзе на свеце такога хараства, як тое, якое ты ўбачыў упершыню яшчэ ў маленстве і якое зачаравала цябе назаўсёды (М. Федаровіч).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) Дзядзька Ціхон паставіў на старым такавішчы два буданы з яловых лапак і загадзя папярэдзіў мяне, каб я ў любую хвіліну быў напагатове, калі ён на досвітку пастукае ў маё акно… (М. Паслядовіч).

4) А ва ўсіх славянскіх народаў самай моцнай клятвай, ад якой ні пры якіх умовах нельга было адрачыся, лічылася тая, калі чалавек цалаваў, а затым з’ядаў жменьку зямлі (Я. Крук).

5) Хоць і змяркалася, але я заўважыў, што пад сценамі леснічоўкі бялелі кветкі сунічніку (М. Капыловіч).

***А9. Адзначце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі, у якіх знакі прыпынку паміж часткамі пастаўлены правільна.***

1) Праходзілі гады, міналі зімы і вёсны, даводзілася сустракацца не з адной добрай кніжкай, але томік апавяданняў Івана Антонавіча [Брыля], прачытаны даўно, я не магу забыць (А. Казлоў).

2) Мікола даўно заўважыў, што адносіны паміж мастаком і яго работамі заўсёды крыху дзіўныя, незразумелыя, ёсць у гэтых стасунках пэўная доля містыкі (Т. Мушынская).

3) Шанаванне беларускай літаратурна-пісьмовай мовы пайшло на спад, калі адбылося аб’яднанне Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай, калі беларускія землі апынуліся ў складзе Рэчы Паспалітай (Я. Сіпакоў).

4) У самым паўночным кутку нашай рэспублікі ёсць ціхая вёсачка Прошкі, і пеўні тут такія галасістыя, што калі пачнуць спяваць на досвітку, дык спеў іх чуваць у трох рэспубліках (С. Паўлаў).

5) Я люблю часіну навальніцы, калі б’е пярун па ўсіх ладах і злуюцца ў хмарах бліскавіцы, кроплі асыпаючы на дах (П. Панчанка).

***А10. Адзначце сказы, у якіх правільна аформлена простая мова.***

1) – Ну, Петрусёк, сёння я магу ўзяць цябе з сабой, – сказаў аднойчы бацька, аглядаючы на двары веласіпед, на якім звычайна ездзіў у пушчу: – Ёсць у мяне вольны час, паездзім, паглядзім што, дзе і як… (Т. Хадкевіч).

2) – Прырода – жорсткая, – упарта стаяў я на сваім. – Слабы – гіне, моцны – жыве (А. Казаннікаў).

3) “Власт надрукаваў усяго тры-чатыры рэчы, – гаварыў Максім Багдановіч, – але кожную можна ўзяць за прыклад, як трэба пісаць” (Я. Лецка).

4) Гаспадыня вінавата перапрашала: “Даруйце, госцейкі, цяпер вайна, у нас ужо цяжка што-колечы дастаць” (М. Шчаглоў).

5) “Вучыцца прыйшоў?” – спытала Марыя Іванаўна. – “Угу”, – ціха прамармытаў я, не ўздымаючы позірку (А. Марціновіч).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Частка В***

***В1. Устанавіце адпаведнасць паміж складаназлучаным сказам і тыпам адносін паміж яго часткамі.***

| | |
|---|---|
| А: Выкруцілі агонь у лямпе, і ўсе ўбачылі ў асобе доктара высокага мужчыну ў шынялі, у ваеннай шапцы з чырвоным аколышкам (П. Пестрак). | 1. Спалучальныя. |
| Б: Усё мог з'есці адзін чалавек, і то хапіла б гэтага на вельмі бедную вячэру (І. Шамякін). | 2. Супастаўляльныя. |
| В: Не то сякера марна чэша, не то хтось кашляе ці брэша (Я. Колас). | 3. Пералічальна-размеркавальныя. |
| Г: Нам з гадамі ўжо не сняцца зоры, але мы, паспеўшы пасталець, не асудзім у гэты дзень прасторны мудрае жаданне паляцець (У. Караткевіч). | 4. Выніковыя. |
| Д: Маленькая палянка ў гушчары абгароджана парканам, і над ёй узняўся вялізны і стройны дуб (Т. Хадкевіч). | 5. Далучальныя. |

***В2. Устанавіце адпаведнасць паміж складаназлучаным сказам і яго схемай (улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены).***

| | |
|---|---|
| А: Пакланіўся нізенька я роднай матулі ды родным мясцінам, і мы паехалі (У. Дубоўка). | 1. […], і […], а […]. |
| Б: Лысы пагорак зелянеў маладой руннюю, і канава на імшары таксама зелянела ад асакі, а вярба за ноч пажаўцела (А. Асіпенка). | 2. […], а […]. |
| В: Высока ў сінім бязвоблачным небе плыве яркае сонца, шчодра лье на зямлю сваю цеплыню і святло, а ўлагоджаная і сагрэтая яго ласкай зямля адказвае хмельным буяннем жыцця (І. Навуменка). | 3. […], а […], і […]. |
| Г: Ужо даўно апусціўся самалёт на пляцоўку, і ў вячэрнім змроку невыразна віднеўся яго цёмны сілуэт, а ў вушах Красана ўсё яшчэ стаяў аглушальны шум матора (А. Стаховіч). | 4. […], і […]. |
| Д: А паязды на вуліцы зялёнай імчацца ўдзень і ўноч на поўны ход, а караблі плывуць па Волга-Доне, і над зямлёю мірны самалёт (А. Астрэйка). | 5. […] ды […], і […]. |



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***В3. Устанавіце адпаведнасць паміж складаназалежным сказам і тыпам даданай часткі.***

| | |
|---|---|
| А: Жменямі бяру халаднаватыя ягады, каб прагнаць смагу, адысці ад стомы і супакоіцца (С. Грахоўскі). | 1. Дапаўняльная. |
| Б: Едзем у Альбуць, у леснічоўку, дзе сям'я Міхала жыла з 1890 па 1903 год (С. Кухараў). | 2. Азначальная. |
| В: І стала прасіць маладое насенне, каб вецер узяў яго з сабою і панёс у аблюбаваную даль (Я. Колас). | 3. Акалічнасная месца. |
| Г: Светла-жоўтая квецень так упрыгожыла ліпы, што за ёю мала прыкметна лісце (Я. Крамко). | 4. Акалічнасная меры і ступені. |
| Д: Кожны новы дзень вясны столькі дабраты, столькі хараства, што не хацелася і ў думках трымаць гэту няясную трывогу (Я. Колас). | 5. Акалічнасная спосабу дзеяння. |
| | 6. Мэты |

***В4. Вызначце тып даданай часткі ў натупным сказе. Адказ запішыце ў форме назоўнага склону.***

Перад самай Вялікай Айчыннай вайной унікальны твор Лазара Богшы знаходзіўся ў Магілёве, у будынку былога зямельнага банка, адкуль, паводле афіцыйнай версіі, у 1941 годзе яго выкралі фашысцкія захопнікі (У. Арлоў).

***В5. Устанавіце адпаведнасць паміж складаназалежным сказам і сінтаксічнай функцыяй злучальнага слова.***

| | |
|---|---|
| А: У наш час яшчэ шырокай папулярнасцю карыстаюцца святыя крыніцы і студні, вада якіх лічыцца лячэбнай (Л. Дучыц). | 1. Дзейнік. |
| Б: Выкарыстанне і пашырэнне магчымасцей, якія распрацоўвае касманаўтыка, сутыкаецца з шэрагам праблем (П. Клімук). | 2. Выказнік. |
| В: Буры мядзведзь – самы буйны з драпежных звяроў, якія сустракаюцца на Беларусі (А. Курскоў). | 3. Дапаўненне. |
| Г: Адсюль, з другога паверху, была відаць мураваная царква пад свінцовым крыццём і выцягнутыя ўсцяж частаколу дахі жылых клецяў, на якіх падчас аблогі стаялі абаронцы (У. Арлоў). | 4. Азначэнне. |
| Д: Якое пытанне, такі і адказ (прыказка). | 5. Акалічнасць. |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***В6. Устанавіце адпаведнасць паміж складаназалежным сказам з некалькімі даданымі часткамі і відам іх падпарадкавання.***

| | |
|---|---|
| А: Калі чалавек прыйшоў ужо на свет, ён мусіць зразумець свой лёс і заўжды трымацца той невідочнай стралы, што ляціць праз дні і гады, пазначаючы кожнаму ягоны шлях (У. Арлоў). | 1. Паслядоўнае. |
| Б: Працавітыя пчолкі, усялякія мушкі гулі так, што здавалася, нібы ліпа – гэта нейкі дзіўны музычны інструмент і тут адбываецца ігрышча (Я. Колас). | 2. Сузалежнае аднароднае. |
| В: Мураўёў рэзка абарваў яго, заўважыўшы, што калі чалавека вядуць на страту, дык за ім абавязкова павінна быць нейкая правіна (У. Караткевіч). | 3. Сузалежнае неаднароднае. |
| Г: Гусоўскі разумеў, што пасол паклікаў яго не дзеля таго, каб паведаміць пра новы паход султана (У. Арлоў). | 4. Змешанае. |
| Д: Як толькі Мікіта Патапавіч Ліпень вярнуўся з-пад Берліна з пустым рукавом і яго выбралі старшынёй калгаса, ён перш-наперш надумаўся пракласці дарогу на бор (М. Парахневіч). | 5. Комплекснае. |

***В7. Вызначце від падпарадкавання ў наступным сказе. Адказ запішыце ў форме назоўнага склону.***

Часта здавалася, што непрыемнасці, якія ўчора яшчэ здаваліся трагічнымі, пасля такой прагулкі па лесе рабіліся дробязнымі (І. Шамякін).

***В8. Устанавіце адпаведнасць паміж складаназалежным сказам і яго схемай (улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены)***

| | |
|---|---|
| А: З нейкаю пільнаю ўвагай разглядаючы герань якая зацвітала на акне ружовымі кветкамі Грынявіцкі злавіў сябе на тым што ў ягонай свядомасці гучаць радкі з ранішняга ліста (У. Арлоў). | 1. […, (…), (…), …], (…). |
| Б: Мы не ведаем як выглядаў якім быў Полацк у тыя далёкія часы але ведаем той факт што ён называецца ў летапісах як буйнейшы горад старажытнай Русі (Т. Хадкевіч). | 2. […], (…), (…). |
| В: Можна толькі горка шкадаваць што купалаўскай смеласці ў галіне словатворчасці мы не бачым у нашай сённяшняй паэзіі што мы так недаравальна мала звяртаемся да яго вопыту работы са словам і над словам да яго вялікага запавету (Н. Гілевіч). | 3. […], (…, (…), …). |



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| | |
|---|---|
| Г: Развіццю беларускай мовы спрыяла тое што ў Вялікім Княстве Літоўскім якое па сутнасці як сцвярджаюць некаторыя гісторыкі было беларускай сярэднявечнай дзяржавай, яна выконвала ўсе функцыі дзяржаўнай мовы (Я. Сіпакоў). | 4. […, (…), …]. |
| Д: Сонца ўжо ўзнялося на вышыню бяроз калі шафёры і вайскоўцы што стаялі каля машын і сядзелі на ўзбочынах заварушыліся забегалі пачалі перадаваць каманды (І. Мележ). | 5. […, (…), …], (…). |

***В9. Устанавіце адпаведнасць паміж сказам і яго тыпам.***

| | |
|---|---|
| А: Я думаю: які цудоўны свет і якая прыгожая наша краіна! (В. Вольскі). | 1. Просты ўскладнены. |
| Б: З другога боку, на поўнач, балоты крыху адступалі, дорачы людзям пясчанае поле (І. Мележ). | 2. Складаназлучаны. |
| В: З поўдня балоты зноў падбіраліся да саламяных, замшэлых радоў стрэх, але ў гэты бок ішла найбольш сувязь са светам (І. Мележ). | 3. Складаназалежны. |
| Г: Пакуль збіраў [Сяргей грыбы], праз сплячэнне галінак заўважыў яшчэ некалькі грыбоў (А. Вабановіч). | 4. Бяззлучнікавы. |
| Д: Рэкі сцякаюцца к мору, лес уздымаецца к сонцу, людзі да шчасця імкнуцца, песні – ад радасці льюцца (А. Русак). | 5. Сказ камбінаванай будовы (з рознымі відамі сувязі). |

***В10. Вызначце від складанага сказа. Адказ запішыце ў назоўным склоне. Намалюйце схему сказа. Расстаўце знакі прыпынку.***

З адной памятнай ліпеньскай ночы калі нашу вёску палілі гітлераўцы а людзей хапалі ў Нямеччыну лес для мяне стаў усім і домам і школай і месцам дзіцячых забаў (Б. Сачанка).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

# ЗМЕСТ

СЛОВАЗЛУЧЭННЕ ........................................................................................3
Віды сувязі слоў у словазлучэнні .............................................................3
Асаблівасці пабудовы словазлучэнняў у беларускай мове ў параўнанні з рускай мовай ..........................................................................6

ПРОСТЫ НЯЎСКЛАДНЕНЫ СКАЗ ..................................................14
Галоўныя члены сказа ...............................................................................14
Даданыя члены сказа .................................................................................17
Аднасастаўныя і двухсастаўныя, поўныя і няпоўныя сказы .................19
Сінтаксічная функцыя інфінітыва ...........................................................22

ПУНКТУАЦЫЯ ПРОСТАГА СКАЗА ...................................................32
Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам...............................................32
Аднародныя члены сказа ..........................................................................34
Адасобленыя азначэнні. Адасобленыя прыдаткі....................................39
Адасобленыя дапаўненні. Адасобленыя акалічнасці. Адасобленыя ўдакладняльныя і далучальныя члены сказа ..................44
Параўнальныя канструкцыі.......................................................................50
Пабочныя і ўстаўныя канструкцыі ..........................................................54
Зваротак......................................................................................................60

СКЛАДАНЫ СКАЗ. ПУНКТУАЦЫЯ СКЛАДАНАГА СКАЗА.................72
Складаназлучаныя сказы ..........................................................................74
Складаназалежныя сказы .........................................................................79
Складаныя бяззлучнікавыя сказы ............................................................96
Складаныя сказы камбінаванай будовы ................................................100
Простая, няўласна-простая і ўскосная мова ..........................................106

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова